Размяшчэнне садовага домікa і гаспадарчых пабудоў на зямельным участку павінна адпавядаць праекту, у якім выкананы архітэктурныя, санітарныя, супрацьпажарныя і іншыя нормы, што дзейнічалі на момант будаўніцтва. СТАР. 2

«Я ніколі не бачыла свайго дзеда, у нас нават няма яго фотаздымка. Але мама і цётка з такой цеплынёй гаварылі пра свайго тату, што я лічыла сваім святым абавязкам знайсці яго магілу». СТАР. 5

Цішыня ў водпуску — гэта асобная тэма. Цішыня бывае з пеўнямі. Калі гучна пачынае паблізу адзін, потым падхоплівае трохі далей другі, яшчэ праз нейкі час ужо цішэй адгукаецца трэці. Апошнім часам цішыня з гукамі дажджу... СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛІПЕНЯ 2013 г. СУБОТА № 138 (27503) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«БУДАЎНІЧУЮ ГАЛІНУ НЕАБХОДНА ПРЫВЕСЦІ ДА ПРЫТОМНАСЦІ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 26 ліпеня азнаёміўся з ходам будаўніцтва аквапарку ў Мінску. Кіраўніку дзяржавы таксама далажылі аб выкананні яго даручэнняў па будаўніцтве ў сталіцы сацыяльна значных аб'ектаў і стварэнні сеткі спартыўных фізкультурна-аздараўленчых комплексаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Гутарачы пасля з журналістамі, Прэзідэнт закрануў усю праблематыку будаўнічай галіны. Па словах кіраўніка дзяржавы, няма ніякіх сумненняў у тым, што яе ў Беларусі ўдасца аздаравіць. «Што тычыцца праблемы карумпаванасці некаторых чыноўнікаў, а іх нямала, то павінен сказаць, што ў свеце няма такога вопыту, каб цалкам зберагчы тую ці іншую галіну ад карупцыі. Такога вопыту няма. Але як бы тут ні стараліся некаторыя, хто нас крытыкуе ў Расіі, на Захадзе, у Амерыцы, — ім далёка да таго ўзроўню барацьбы з карупцыяй, які існуе ў Беларусі», — адзначыў беларускі лідар.

«Гэта вельмі сур'ёзны працэс, і я ўвесь час папярэджваў пра гэта. Некаторыя не разумеюць. Не разумеюць, значыць будзе пэўная адказнасць. Але пытанне не ў тым, каб пасадзіць. Пытанне ў аздараўленні ўсёй сістэмы», — лічыць Прэзідэнт. «Будаўнічая галіна ў нас не проста хранічна хворая. У нас такая галіна, якой яна наогул не павінна быць у нашым грамадстве і краіне. Таму, як бы хтосьці хацеў гэтага ці не, мы яе прывядзём да прытомнасці і аздаровім. Яна будзе працаваць у інтарэсах народа. Але цярпець суцэльныя скаргі ад людзей я як Прэзідэнт не мае намеру, я абавязаны рэагаваць на грамадскую думку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што грамадзяне не патрабуюць ад будаўнікоў нічога звышнатуральнага, а толькі пабудаваць у тэрмін, якасна і за раней устаноўленую цану. «Вось мы і патрабуем гэтага. Думаю, вельмі многія ўжо зразумелі, што жартаваць мы ні з кім не маем намеру. Сёння старшыня камітэта дакладваў, што заведзена ўжо каля васьмі дзясяткаў крымінальных спраў толькі ў гэтай сферы. І мы пройдземся тут гусеніцамі самага цяжкага танка, пачынаючы ад чыноўнікаў УКБ, праз праекціроўшчыкаў і будаўнікоў. Але мы выраўнуем гэта месца так, што народ да нас прэтэнзій мець не будзе. І гэта толькі пачатак», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, зменіцца падыход і да прыватных кампаній у будаўніцтве. Ён стане больш жорсткім: «Яны (прыватныя структуры. — **Заўвага БЕЛТА.**) павінны разумець, што зарабілі свой адмоўны імідж. І мы ўсё больш будзем адмаўляцца ад прыватных забудоўшчыкаў, канцэнтравацца на буйных дзяржаўных будаўнічых кампаніях. Прыватнік атрымае заказ толькі тады, калі ён дакажа сваю кампетэнтнасць. Хочаш будаваць — калі ласка, але пакажы, дзе твая будаўнічая арганізацыя ці, у крайнім выпадку, дзе твае грошы, за якія ты хочаш будаваць».

«Проста так, як гэта было раней, ужо не будзе. Бярэ зямлю, пляцоўку, потым перапрадае, не выходзіць на яе, а калі і выйшаў, то пачынае «даіць» людзей на ўсю катушку, нічога не пабудаваўшы. Гэтага больш не будзе. А калі будзе, я ўжо шчыра і цвёрда сказаў: — усе сядуць у камеру. Будзем прымяняць карныя меры для таго, каб людзі на нас не крыўдзіліся», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Мэр Мінска Мікалай Ладуцька расказаў, які вядзецца ў горадзе ўзвядзенне некаторых спартыўных фізкультурна-аздараўленчых комплексаў. Напрыклад, ужо вядома, што мінскі аквапарк пачне работу 1 мая 2014 года. Паводле яго слоў, да канца гэтага года поўнасцю завершацца будаўніча-мантажныя работы і аб'ект пяройдзе ў тэставы рэжым. На сёння будаўнічая гатоўнасць аквапарку складае 72%. Паводле слоў мэра Мінска, ужо закуплена ўсё неабходнае абсталяванне для аквапарку, на працягу жніўня яно будзе змантіравана.

Мікалай Ладуцька адзначыў, што ў краіне многія аб'екты праектуюцца і будуюцца сіламі беларускіх спецыялістаў. За 15 гадоў у Беларусі напрацаваны багаты вопыт. «Мінскі аквапарк з'яўляецца адным з такіх аб'ектаў, мы яго праектавалі самі з нуля. Па наборы функцый, маштабнасці ён з'яўляецца пятым у Еўропе. І, вядома, гэта ўнікальны аб'ект для краіны», — сказаў мэр.

У летні час аквапарк змогуць наведваць да 2 тысяч чалавек адначасова, у зімовы — больш за 1,6 тыс. Паслугамі аквапарку змогуць скарыстацца і людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Побач з аквапаркам размесціцца гасцінічны комплекс, у склад якога ўвойдуць гасцініца эканом-класа ўзроўню «дзве зоркі» і восем катэджаў. Аквапарк з прылеглымі тэрыторыямі займае 38 га.

Мінскія ўлады прапануюць даць аквапарку назву «Купалле». Аднак Аляксандр Лукашэнка не падтрымаў гэтую ідэю, адзначыўшы, што над назвай трэба яшчэ падумаць.

Старшыня Мінгарвыканкама таксама далажыў Прэзідэнту аб тым, як ідзе рэканструкцыя стадыёна «Дынама». «Мы сёння добра ўяўляем, што будзем будаваць. Усе планіровачныя рашэнні цалкам зразумелыя», — адзначыў ён. Гэтая канцэпцыя распрацавана нямецкай кампаніяй, якая ўжо не адзін год працуе на рынку падобных паслуг у Еўропе.

«Неадкладна праектуйце і будуйце аб'ект, наколькі гэта магчыма. Трэба аператыўна арганізаваць падрыхтоўку праекта, нават калі гэта будзе рабіцца па частках, і пачынаць будаваць».

Прэзідэнту таксама было даложана аб ходзе будаўніцтва культурна-забаўляльнага спартыўнага комплексу «Чыжоўка-Арэна». Па словах Мікалая Ладуцькі, на гэтым аб'екце ўжо выканана 85% будаўніча-мантажных работ. Праведзены тэндары і пастаўлена большая частка абсталявання. Урачыстае адкрыццё «Чыжоўка-Арэны» плануецца прымеркаваць да свята 7 лістапада ў гэтым годзе. СТАР. 2

АЛІМПІЙСКІ БУДАТРАД

Фота БЕЛТА.

З 1 мая па 30 верасня, па традыцыі, у Рэспубліцы Беларусь праходзіць трэці працоўны семестр, мэтай якога з'яўляецца другасная занятасць моладзі ў летні перыяд. Фарміраваннем студэнцкіх атрадаў у г. Мінску займаецца Мінская гарадская арганізацыя грамадскага аб'яднання «БРСМ». Штаб працоўных спраў першаснай арганізацыі ГА «БРСМ» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта ў трэцім працоўным семестры «Лета-2013» ужо сфарміраваў 72 студэнцкія атрады, 57 з якіх будаўнічыя. Байцы будатрадаў БНТУ працуюць на будаўніцтве многіх важных аб'ектаў.

На здымку: студэнты БНТУ працуюць на будаўніцтве будынка штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта ў Мінску.

Фота Аляксандра ДЗІДЗЕВІЧА, БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Мы ініцыіруем працэдуру ўнясення змяненняў у заканадаўства з мэтай устанаўлення для ўсёй рэспублікі адзіных тэрмінаў выплаты пенсій і дапамог — з 5 па 25 чысло. Так, у Мінску выплата пенсій і дапамог пачынаецца з 1 чысла месяца (у іншых рэгіёнах у рэспубліцы — з 5-га). Выплата з 1-га чысла стварае пэўныя складанасці. Справа ў тым, што Белстатам зменены тэрмін прадастаўлення інфармацыі па ўзроўні заработнай платы на 25-е чысло. Значыць, усе параметры разліку пенсій мы зможам давесці да зацікаўленых камітэтаў і ўпраўленняў толькі 26-га чысла. Неабходна прапрацаваць пытанне аб раўнамерным размеркаванні колькасці атрымальнікаў выплат па ўсім выплатным перыядзе. Зараз больш за 75% сум пенсій і дапамог выплачваюцца ў першыя 15 дзён месяца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.07.2013 г.

Долар ЗША	8870,00	▲
Еўра	11780,00	▲
Рас. руб.	272,00	▼
Укр. грыўня	1090,18	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 29°
Віцебск	+ 25°
Гомель	+ 26°
Гродна	+ 29°
Магілёў	+ 27°
Мінск	+ 28°

■ Прыёмная кампанія-2013

АХВОТНЫХ БЫЦЬ ПЕДАГОГАМІ І ІНЖЫНЕРАМІ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ МЕНШ

25 ліпеня ў 18 гадзін дзверы прыёмных камісій для абітурыентаў зачыніліся. У гэты дзень прыёмныя камісіі працавалі ў штатным рэжыме, а іх супрацоўнікі былі загадзя праінструктаваны наконт таго, як трэба дзейнічаць у апошнія гадзіны прыёму дакументаў і пасля 18 гадзін, калі допуск абітурыентаў у будынак навучальнай установы, у якой размяшчаецца прыёмная камісія, спыніўся. Пасля 18 гадзін прыёмныя камісіі перасталі выдаваць абітурыентам дакументы з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць. Пры гэтым абітурыенты, якія паспелі трапіць у будынак да таго, як яго дзверы зачыніліся, яшчэ мелі магчымасць падаць свае дакументы на абраную спецыяльнасць.

Не сакрэт, што некаторыя абітурыенты актыўна «маніторацъ» інфармацыю аб правядзенні прыёму заяў, падлічваюць прахадныя балы (і, адпаведна, свае шанцы на паступленне), таму адкладваюць візіт у прыёмную камісію літаральна на апошні момант. Праўда, з кожным годам такіх «асцярожных» абітурыентаў становіцца ўсё менш. У Міністэрстве адукацыі з задавальненнем адзначаюць, што сёлета працэс падачы заяў праходзіў у ВНУ раўнамерна і без аўралаў. Але, з іншага боку, істотна скарацілася і колькасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

Абітурыенты, якія ўскочылі літаральна ў апошні вагон, павінны былі звярнуць увагу на тое, што прахадны бал на асобныя спецыяльнасці ў апошні дзень мог павялічыцца. Нават за апошнія паўгадзіны прахадны бал мог або крыху вырасці, або, наадварот, знізіцца на некалькі адзінак.

У найменшай ступені гэта тычыцца інжынерна-тэхналагічных і педагагічных спецыяльнасцяў, дзе, як і прагназавалася, сёлета склалася асабліва складаная сітуацыя з запаўненнем бюджэтных месцаў. І справа тут не толькі ў іх невысокай папулярнасці ў моладзі, але і ў павышэнні мінімальнай планкі на цэнтралізаваным тэсціраванні. Так, для прыкладу, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце на спецыяльнасць «Матэматыка і інфарматыка» было пададзена ўсяго 40 заяў пры плане набору 115 чалавек, на «Фізіку і інфарматыку» — 21 заява на 75 месцаў, на «Фізіку і тэхнічную творчасць» — увогуле ўсяго 1 заява на 10 месцаў.

«Сёлета працэс падачы заяў праходзіў у ВНУ раўнамерна і без аўралаў. Але, з іншага боку, істотна скарацілася і колькасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет»

У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце незапоўненымі засталіся бюджэтныя месцы на спецыяльнасцях факультэта горнай справы і інжынернай экалогіі, на механіка-тэхналагічным факультэце, аўтатрактарным, прыборабудаўнічым, механіка-тэхналагічным, інжынерна-педагагічным факультэтах, факультэце энергетычнага будаўніцтва... Затое цалкам укамплектаваўся будаўнічы факультэт і, што ўжо нікога не здзіўляе, факультэт маркетынгу, менеджменту і прадпрымальніцтва. СТАР. 2

1025 ГОДАЎ ХРЫШЧЭННЯ РУСІ 2013 ДЗЯСЯТКІ ТЫСЯЧ ПАЛОМНІКАЎ

будуць удзельнічаць ва ўрачыстых мерапрыемствах з нагоды святкавання 1025-годдзя Хрышчэння Русі, якія пройдуць у Мінску.

Сталіца Беларусі рыхтуецца не толькі да прыезду Свяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, але і да масавага прытоку вернікаў з усіх епархій Беларусі.

— У Мінск прыедуць звыш 200 аўтобусаў з паломнікамі з усіх куткоў краіны, — падкрэсліў на адмысловай прэс-канферэнцыі Леанід Гуляка, Упаўнаважаны ў справах рэлігій і нацыянальнасцяў. — Усё гэта арганізоўваецца не дзеля масавасці на ўрачыстасцях і задавальняе жаданні толькі 20% тых, хто хацеў бы прыехаць.

Чакаецца, што, акрамя беларусаў, сталіцу ў бліжэйшыя дні наведаюць пілігрымы з Расіі, Украіны, Польшчы і Літвы. Аднак, як адзначыў Ігар Карпенка, намеснік старшыні Мінгарвыканкама, горад падрыхтаваны да візіту шматлікіх гасцей. «У нас даволі часта праводзяцца мерапрыемствы буйнога фармату. Таму ў Мінску будуць створаны ўсе меры бяспекі. Мы плануем задзейнічаць пад стаянкі аўтобусаў і аўтамабіляў пляцоўку і паркінг «Мінск-Арэны». Будзе арганізаваны дадатковы рух грамадскага транспарту, а пункты харчавання запрацуюць каля Палаца спорту і недалёка ад храма-помніка ў гонар Усіх Святых».

Святкаванне ў Мінску падобнай даты мае не толькі вялікае значэнне для іміджу горада, але і для духоўнага жыцця краіны. Акрамя Патрыярха Кірыла, у Беларусь прыедуць прадстаяцелі і прадстаўнікі амаль усіх 15 памесных праваслаўных цэркваў. Разам з гасцямі ў нядзелю ў Мінск цягніком з Кіева даставяць Крыж Андрэя Першазванага, які зараз знаходзіцца ў Трапезным храме Кіева-Пячэрскай лаўры. Святыню з вакзала перавязуць у прыход Андрэя Першазванага, што на вуліцы Малініна. З 29 ліпеня і да 2 жніўня крыж будзе знаходзіцца ў храме-помніку ў гонар Усіх Святых. Асноўныя ўрачыстасці з нагоды святкавання 1025-годдзя Хрышчэння Русі адбудуцца ў бліжэйшы панядзелак. Раніцай (7:30) вернікі пройдуць хрэсным ходам ад храма святой Магдаліны па праспекце Машэрава да замчышча, што каля Палаца спорту, дзе праз дзве гадзіны пад адкрытым небам распачнецца літургія з удзелам Патрыярха Кірыла і прадстаяцеляў памесных праваслаўных цэркваў. У вечары, у 19:30, каля храма-помніка ў гонар Усіх Святых пачнецца ўрачысты канцэрт.

Тарас ШЧЫРЫ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЕЎРАКАМІСІЯ АДНАВІЛА ФІНАНСАВАННЕ ЗАКРЫЦЦЯ ІГНАЛІНСКАЙ АЭС

Еўракамісія і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця аднавілі фінансаванне закрыцця ІАЭС пасля таго, як Літва дасягнула прагрэсу ў перамовах з генпадрадчыкам праекта закрыцця АЭС — кансорцыумам нямецкіх кампаній з удзелам расійскага капіталу Nukem і GNS, з якім у апошнія два гады ўрад Літвы вёў пастаянныя спрэчкі з нагоды якасці кантэйнераў для захоўвання паліва.

У КАІРЫ ПАЧАЛІСЯ СУТЫКНЕННІ ПАМІЖ ПРЫХІЛЬНІКАМІ І ПРАЦІЎНІКАМІ ЗВЕРГНУТАГА ПРЭЗІДЭНТА

Учора ў другой палове дня мітынгоўцы з абодвух бакоў пачалі закідваць адзін аднаго камянямі. Часам справа даходзіла да рукапашнай. Ці ёсць у выніку гэтых падзей загінулыя і параненыя, не паведамляецца. 26 ліпеня стала вядома, што Мурсі прад'яўлены абвінавачванні ў шпіянажы і змове, ажыццёўленай сумесна з рухам ХАМАС. Яго таксама падазраюць у саўдзеле ў забойстве і выкраданні вайскоўцаў і паліцэйскіх. Двума днямі раней камандаванне егіпецкіх узброеных сіл папрасіла праціўнікаў Мурсі выйсці 26 ліпеня на мітынг у падтрымку дзеянняў цяперашніх улад. Генералы растлумачылі, што ім патрэбны мандат ад шырокіх слаёў насельніцтва на барацьбу з «экстрэмізмам» і «гвалтам».

ЗША МОГУЦЬ УВЕСЦІ САНКЦЫІ СУПРАЦЬ УСІХ КРАІН, ЯКІЯ ДАПАМАГАЛІ СНОЎДЭНУ

Кангрэсмен ад штата Паўднёвая Караліна рэспубліканец Ліндсі Грэм унёс у сенат законапраект, які прадугледжвае санкцыі супраць любой краіны, што дасць прыстанішча выкрывальніку амерыканскіх спецслужбаў Эдварду Сноўдэну. Пад санкцыямі маюць на ўвазе «скасаванне прэферэнцый і прывілей у гандлі з ЗША». Законапраект афармлены ў выглядзе папраўкі да закона аб фінансаванні знешнепалітычнай дзейнасці ЗША ў 2014 годзе.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ВІНОЎНІК ЧЫГУНАЧНАЙ КАТАСТРОФЫ ВЫХВАЛЯЎСЯ ПЕРАВЫШЭННЕМ ХУТКАСЦІ Ў САЦСЕТКАХ

У Іспаніі працягваюць расследаваць прычыны аварыі пасажырскага цягніка. У цэнтры ўвагі — машыніст Франсіска Хасэ Гарсон Амо. Высветлілася, што ён не ўтойваў сваёй любові да хуткасці. Вядома, што машыністу 52 гады, у

яго вялікі вопыт. Аднак паводле даных СМІ, Франсіска Хасэ Гарсон Амо перавышаў хуткасць неаднаразова і нават выхваляўся гэтым у сацыяльных сетках. У сакавіку 2012 года ён размясціў на сваёй старонцы ў Facebook фатаграфіі спідометра цягніка, стрэлка якога паказвала хуткасць 200 км у гадзіну.

На наступны дзень пасля чыгуначнай аварыі паведамленне машыніста было выдалена са старонкі. Амо быў заключаны пад варту ў шпіталі, дзе ён знаходзіцца. Па апошняй інфармацыі, колькасць ахвяр аварыі складае 80 чалавек, яшчэ каля 180 атрымалі траўмы.

КОРАТКА

Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі сёлета ў чэрвені склала Br5 млн 159 тыс. 884.

Прадпрыемствам гандлю ў сезон падрыхтоўкі да навучальнага года даручана прымяняць мінімальныя гандлёвыя надбаўкі на школьныя тавары.

Беларускія ЗАГСы з 26 ліпеня будуць уносіць індывідуальныя ідэнтыфікацыйныя нумары ў пасведчанне аб нараджэнні. Гэта датычыцца як маленькіх грамадзян Беларусі, так і дзяцей усіх замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у краіне.

Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 ліпеня гэтага года склала 9 млн 459,8 тыс. чалавек.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ініцыявала працэдуру ўнясення змяненняў у заканадаўства з мэтай устанаўлення для ўсёй рэспублікі адзіных тэрмінаў выплаты пенсій і дапамог — з 5 па 25 чысло.

ISSN 1990 - 763X

«БУДАЎНІЧУЮ ГАЛІНУ НЕАБХОДНА ПРЫВЕСЦІ ДА ПРЫТОМНАСЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў. Вось аб чым ішла гаворка.

«Не рабіць катастрофу з сітуацыі з АЧС»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што афрыканская чума свіней прыйшла ў Беларусь збоку. «Я не хачу тут нікога вінаваціць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але, адкуль бы ні прыйшла гэтая бяда, гэта гаворыць аб тым, што свет вельмі ўзаемазвязаны, і нам прыйдзецца з гэтым змагацца».

«Не бачу тут ніякай катастрофы, як гэта звычайна раскручваецца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, нават Захад прызнаў, што ў Беларусі эфектыўна змагаюцца з гэтым захворваннем. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што вірус АЧС гіне пры тэмпературы 60 градусаў, таму досыць тэрмічнай апрацоўкі, каб вірус загінуў.

Па словах кіраўніка дзяржавы, ачагі захворвання вызначаны. «Мы цяпер працуем з насельніцтвам, каб лакалізаваць гэтыя асяродкі, каб яны не мелі распаўсюджвання», — дадаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў цяперашняй сітуацыі найбольшую занепакоенасць выклікае сітуацыя з асабістымі падвор'ямі насельніцтва. «На комплексах мы парадак навядзём, гэта прасцей, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я папрасіў, каб звярнуліся да людзей, раз такое здарылася, адправіць на забой хатніх свіней. Ці мы забяром, дзяржава заплаціць».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што вядзецца работа і па папярэджанні распаўсюджвання віруса сярод дзікіх жывёл. «Што тычыцца камбікармоў, то тут прасцей. Трэба карміць сваімі камбікармамі, а з дабаўкамі працаваць больш акуратна і правяраць», — сказаў Прэзідэнт. «Трэба эфектыўна змагацца з гэтай заразай, хоць яна і не шкодная для чалавека, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Я не бачу тут асаблівых праблем, у гэтым кірунку мы вельмі жорстка дзейнічаем». Прэзідэнт адзначыў, што КДБ і пракуратуры даручана ажыццяўляць нагляд за дзейнасцю ўсіх структур, пачынаючы ад урада і заканчваючы ветэрынарным урачом канкрэтнага ўчастка, назіраць, як яны дзейнічаюць у гэтай сітуацыі.

«Таму не перажывайце: елі шашлык з свініны і ешце, — сказаў Прэзідэнт. — Толькі не купляйце мяса на вуліцы, лепш на рынку і ў крамах». Гаворачы пра сябе асабіста, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што аддае перавагу курынаму мясу і ялавічыне. «Але часам таксама ўжываю і свініну. І не трэба думаць, што ў Прэзідэнта шмат людзей, якія правяраюць кожны кавалак ежы. Нічога падобнага! На «Камароўцы», як і вы, асобныя прадукты закупляем», — сказаў Прэзідэнт.

Аб затрыманні супрацоўніка спецслужбаў, які працаваў на замежныя дзяржавы

Каментуючы сітуацыю вакол былога супрацоўніка амерыканскіх спецслужбаў Эдварда Сноўдэна, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта актуальна і для Беларусі. «Мы нядаўна затрымалі аднаго са здраднікаў, які ў спецслужбах служыў і быў праз прадстаўнікоў каталіцкай царквы звязаны з замежнымі дзяржавамі, і не толькі здаваў інфармацыю, але з-за яго дзейнасці пацярпелі людзі, якія працуюць за мяжой», — заявіў Прэзідэнт.

«Гэта як называецца? З нашага пункту гледжання — здрада. А чаму з амерыканскага пункту гледжання Сноўдэна нельга расцаніць як здрадніка? Таму тут не павінна быць двайных стандартаў. Мы павінны зыходзіць з гэтага», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Расіі даўно трэба было даць Сноўдэну палітычны прытулак»

«Сёння кіраўніцтва Расіі ўжо і не ведае, што з гэтым Сноўдэнам рабіць. Я б на месцы расіян асабліва ў гэтым плане не напружваўся, а даў бы яму палітычны прытулак», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Такую пазіцыю Аляксандр Лукашэнка патлумачыў тым, што Амерыка прытуліла сотні расійскіх здраднікаў. «Колькім яны людзям там далі прытулак, колькі забралі адсюль сакрэтаў, колькі тэрарыстаў, якіх Расія патрабуе выдаць, у сябе прытулілі і не выдаюць», — заўважыў беларускі лідар.

«Што ж вы Пуціну прад'яўляеце прэтэнзіі, што ён сябе нібыта няправільна паводзіць. Правільна паводзіць. Даўно трэба было прадаставіць палітычны прытулак. Тады б вы ведалі, што свет глабальны, узаемазалежны, і той жа тэрарыст, які жыў у Расіі, заўтра ён можа нешта ўчыніць у Амерыцы. Нядаўна факты такія былі. Таму на месцы расійскага кіраўніцтва я б дзейнічаў больш рашуча ў гэтым плане, і гэта было б апраўдана», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым, кіраўнік беларускай дзяржавы прызнаў, што ЗША цалкам абгрунтавана лічаць Сноўдэна здраднікам. «Пан Сноўдэн працаваў у спецслужбе не адзін год. Больш за тое, калі ён туды ўладкоўваўся на працу, то дакладна сабе ўяўляў, чым яму прыйдзецца займацца і чым займаюцца спецслужбы наогул і амерыканская ў прыватнасці. Яго рыхтавалі, ён вучыўся і ведаў, што спецслужбы не толькі дагала «распранаюць» чалавека, яны слухаюць яго, прасвечваюць і г.д., — адзначыў Прэзідэнт. — Таму калі ты прыйшоў туды працаваць — працуй. Але калі ты хочаш займацца праваабарончай дзейнасцю, прапіхваць нейкія правы чалавека, то табе трэба звольніцца са спецслужбы» .

«Што датычыцца амерыканцаў, то яны за што змагаліся, на тое і напаролі-ся. Вы (амерыканцы. — **Заўвага. БЕЛТА)** усюды крычыце, што вы — апора правоў чалавека. Дык якія ж гэта правы чалавека? Добра б, беларусаў і расіян праслухоўвалі (яны нас лічаць сваімі сапернікамі), але яны ж усю Заходнюю Еўропу пералапачвалі, фільтравалі у суткі па 500 млн. званкоў. Гэта ж якую сістэму трэба мець! Чаму вы ўмешваліся ў прыватнае жыццё людзей?!» — заўважыў Прэзідэнт Беларусі.

«Можа, гэта і апраўдана, але вы ж тады нас не абвінавачвайце ў незахаванні правоў чалавека. Ніякіх правоў чалавека там няма, суцэльныя парушэнні, і справа Сноўдэна гэта пацвярджае, і не толькі гэтая справа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Тое, што адбылося са Сноўдэнам раней і пасля, мы бачым, што гэта — блеф. Гэта адзін з кірункаў барацьбы амерыканцаў і Захаду супраць няўгодных краін. Тое, што яны робяць з правамі чалавека, з людзьмі наогул, недапушчальна», — лічыць беларускі лідар. «Але нам лепш не ўмешвацца ў гэта. Яны няхай самі разбіраюцца са сваім Сноўдэнам. Але гэта толькі пачатак для амерыканцаў. Пажар яны будуць тушыць па розных напрамках. Яны яго распалілі, і яны яго будуць тушыць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Змяняецца свет, трэба змяняцца і царкве»

«Увесь свет развіваецца, змяняецца, больш за тое, змяняецца не так, як хацелі б мы, і не ў той бок, як хацела б царква. Змяняюцца сістэмы, структуры і самі людзі. З майго пункту гледжання, калі змяняецца свет, і царква павінна мяняцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Мне здаецца, мы напярэдадні нейкай рэформы, няхай спакойнай, эвалюцыйнай, паступовай рэформы праваслаўнай царквы, і, можа, не толькі праваслаўнай царквы», — дадаў ён.

«Дзякуй богу, наша царква не хварэе на ту заразу, якой захварэла царква на Захадзе. Пра гэта ўсе чулі: і педафілія, і «блакітныя», і «ружовыя» — там чорт ведае што сёння адбываецца, — лічыць Прэзідэнт. — Але хварэць мы ўжо пачынаем. І я думаю, што праваслаўная царква тут, у тым ліку і з дзяржавай, недапрацоўвае. Мы можам страціць цэлае пакаленне моладзі». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пра гэта гаворыць і Папа Рымскі Францішак.

Прэзідэнт сказаў, што з'яўляецца прыхільнікам паступовага рэфармавання царквы, пачынаючы ад царкоўнай мовы і заканчваючы працягласцю службаў. «Вельмі доўгія, працяглыя набажэнствы, пропаведзі, а старэйшае пакаленне, бабулькі, проста не вытрымліваюць гэтага. Трэба быць больш кароткімі, кампактнымі, больш сучаснымі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я супраць таго, каб людзі ў царкве 2-3 гадзіны падчас пропаведзі або набажэнства стаялі на нагах, нідзе не прысесці». Акрамя таго, Прэзідэнт адзначыў, што ён праціўнік узвядзення царквой велічэзных храмаў. «Яны павінны быць утульнымі, храмы — для душы», — сказаў ён. «Гэта мой пункт гледжання. Вы ў мяне спыталі, я шчыра адказваю», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Можа быць, я не маю рацыі, але лічу, што царква любой канфесіі павінна ісці побач з грамадствам. Не патураючы недахопам грамадства, яна павінна змагацца супраць іх, але ні ў якім разе не адставаць ад агульнага развіцця», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што пытаннямі рэфармавання царквы могбы заняцца Патрыярх Кірыл, паколькі ён актыўны чалавек. «Гэта абсалютна здаровы чалавек, разумны і, галоўнае, — самы малады Патрыярх, якога паважае моладзь. І калі ён зараз страціць час і не пераканае сваё асяроддзе, паству, што трэба паволі рэфармавацца, — напэўна, не хутка мы вернемся да гэтага пытання. Таму надзеі і на нашага Патрыярха, і на нашых царкоўнаслужыцеляў», — сказаў Прэзідэнт.

«Я рызыкнуў, вядома, агучыць свой пункт гледжання, але, мне здаецца, ёсць над чым задумацца. І ў Беларусі мы над гэтым падумаем», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

АХВОТНЫХ БЫЦЬ ПЕДАГОГАМІ І ІНЖЫНЕРАМІ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ МЕНШ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце таксама не ўзнікла праблем з запаўненнем месцаў на папулярным у моладзі эканамічным кірунку. На спецыяльнасцях «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве», «Менеджмент», «Маркетынг», «Бухгалтарскі улік, аналіз і аўдыт» нават склалася конкурсная сітуацыя. Усе бюджэтныя месцы будуць запоўнены тут таксама на спецыяльнасцях «Выдавецкая справа» (40 ахвотных на 25 месцаў), «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» (72 ахвотныя на 50 месцаў), «Турызм і прыродакарыстанне» (76 ахвотных на 30 месцаў). А самая сумная сітуацыя склалася на спецыяльнасцях, звязаных з лясной гаспадаркай, тэхналогіямі дрэваапрацоўчай вытворчасці і хімічнай прамысловасцю.

Сёлета абітурыенты, якія вытрымалі ўступныя выпрабаванні, але не прайшлі па конкурсе на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі, змогуць да 2 жніўня падаць свае дакументы для ўдзелу ў конкурсе ў той жа ВНУ на завочную і вячэрнюю формы атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту.

«За апошнія паўгадзіны прахадны бал мог або крыху вырасці, або, наадварот, знізіцца на некалькі адзінак»

Дакументы для атрымання адукацыі на платнай форме навучання (дзённай, завочнай, вячэрняй і дыстанцыйнай) будуць прымацца ў абітурыентаў да 4 жніўня. 6 жніўня — апошні дзень залічэння на платную форму навучання.

Варта нагадаць, што, згодна з Кодэксам аб адукацыі, установы вышэйшай адукацыі заключаюць цяпер дагаворы з усімі студэнтамі — не толькі платнай, але і бюджэтнай формы навучання. У дагаворах прапісаны ўмовы навучання і ўзаемныя абавязацельствы двух бакоў. Але калі абітурыент непаўналетні, то для падпісання дагавора патрабуецца прысутнасць яго законнага прадстаўніка.

ПАДРЫХТАВАЦЬ УРАЧА ТАННЕЙ, ЧЫМ ЮРЫСТА?

Адным з апошніх з коштам падрыхтоўкі спецыялістаў на платнай аснове вызнаўчыся Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Калі аналізаваць новыя «цэннікі», то няцяжка прыйсці да высновы, што на кошт навучання ў БДУ моцна ўплывае прэстыжнасць той ці іншай спецыяльнасці ў моладзі. Інакш як можна патлумачыць, што за год навучання на спецыяльнасцях «правазнаўства», «эканамічнае права» і «міжнароднае права» першакурснікам давядзецца заплаціць 17 млн 940 тыс. рублёў, будучым мытнікам — 17 млн 400 тыс. рублёў, палітолагам, сацыёлагам, псіхолагам — 16 млн 320 тыс. рублёў. Навучанне ў Інстытуце журналістыкі вагаецца ў залежнасці ад спецыяльнасці ад 16 млн 320 тыс. рублёў да 17 млн 40 тыс. рублёў. Дызайнераў на гуманітарным факультэце будуць рыхтаваць за 17 млн 700 тысяч рублёў. Атрымліваецца, што падрыхтаваць урача і фармацэўта нават танней, чым юрыста, эканаміста або журналіста? Нагадаем, што ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце кошт аднаго года навучання на лячэбным, педыятрычным і фармацэўтычным факультэтах складае 16 млн 400 тыс. рублёў.

А самымі «таннымі» спецыяльнасцямі ў БДУ сталі «руская філалогія» і «беларуская філалогія» (12 млн 840 тыс. рублёў), «сацыяльная работа» (12 млн 840 тыс. рублёў) і «культуралогія» (13 млн 440 тыс. рублёў). У той жа час вывучэнне ўсходняй філалогіі будзе каштаваць ахвотным 17 млн 700 тыс. рублёў, а рамана-германскай і класічнай філалогіі — 15 млн 600 тыс. рублёў.

На прыродазнаўчых факультэтах, механіка-матэматычным факультэце і ФПМІ кошты навучання вагаюцца ад 14 млн 160 тыс. рублёў да 16 млн 320 тысяч. Самым дарагім з іх з'яўляецца біялагічны факультэт, дзе кошт навучання перавышае 16 мільёнаў. А на гістарычным факультэце за год навучання студэнтаў папросяць заплаціць ад 14 млн 160 тысяч да 14 млн 880 тысяч рублёў — зноў-такі ў залежнасці ад спецыяльнасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Актуальна

ПРАВІЛЫ ДАЧНАГА ЖЫЦЦЯ

Спецыялісты адзначаюць, што ў Беларусі больш за ўсё дачамі захапляюцца жыхары Мінскай вобласці: на тэрыторыі сталічнага рэгіёна знаходзіцца траціна ўсіх зарэгістраваных у краіне садовых таварыстваў і дачных кааператываў. Аб гэтым паведамілі ўдзельнікі анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.

Па словах **галоўнага юрыста юрыдычнага ўпраўлення Мінэканомікі Уладзіслава МАКАРЭВІЧА,** на 1 студзеня 2013 года ў Беларусі зарэгістравана 4477 садовых таварыстваў і дачных кааператываў, дзе знаходзіцца 371,5 тыс. зямельных участкаў.

На тэрыторыі Мінскай вобласці было 1372 садаводчыя таварыствы і дачныя кааператывы, у якіх налічвалася звыш 211,3 тыс. зямельных участкаў. Агульная плошча зямель садаводчых таварыстваў і дачных кааператываў у сталічнай вобласці складае амаль 17,9 тыс. га

Калі на Мінскую вобласць прыходзіцца больш за ўсё садаводчых таварыстваў (30%), то менш за ўсё іх у Магілёўскай вобласці (9%).

Размяшчэнне садовага доміка і гаспадарчых пабудоў на зямельным участку павінна адпавядаць праекту, у якім выкананы архітэктурныя, санітарныя, супрацьпажарныя і іншыя нормы, што дзейнічалі на момант будаўніцтва. Адступленне ад гэтых нормаў з'яўляецца парушэннем, лічыць **намеснік начальніка землеўпарадкавальнай службы Мінаблвыканкама Уладзімір ГУМАРАЎ.**

Згодна з палажэннем аб садоўніцкім таварыстве, зацверджаным указам № 50, зямельныя ўчасткі прадастаўляюцца садаводчым таварыствам, а таксама грамадзянам для калектыўнага садаводства ў адпаведнасці з праектам арганізацыі і забудовы тэрыторыі садоўніцкага таварыства. Змена забудовы тэрыторыі таварыства не дапускаецца без унясення ва ўстаноўленым заканадаўствам аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці парадку змяненняў у зацверджаны праект.

Прыродаахоўныя службы сёлета выявілі ў Мінскай вобласці 260 стыхійных звалак, канстатуе сітуацыю **намеснік старшыні Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Бас.**

Прававы статус садоўніцкіх таварыстваў, а таксама парадак іх стварэння, рэарганізацыі і ліквідацыі быў вызначаны адносна нядаўна — у 2008 годзе, калі быў прыняты Указ № 50 «Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садаводчых таварыстваў». Указ урэгуляваў пытанні дзейнасці такіх юрыдычных асоб, замацаваў правы і абавязкі членаў садоўніцкіх таварыстваў, кампетэнцыя іх органаў кіравання і парадак прыняцця імі рашэнняў. Акрамя таго, у адпаведнасці з указам, дачнікі павінны былі ў пэўны тэрмін зарэгістраваць зямельныя ўчасткі і атрымаць адпаведныя дакументы.

У тым жа годзе былі ўпершыню зацверджаны тыпавыя правілы ўнутранага распарадку садоўніцкіх таварыстваў, якія ўключаюць супрацьпажарныя, санітарныя і прыродаахоўныя патрабаванні, парадак карыстання дарогамі, водаправодам і іншымі аб'ектамі агульнага карыстання таварыства, нормы размяшчэння садовых домікаў, гаспадарчых пабудоў і збудаванняў.

Толькі з пачатку года выдадзена 150 актаў-прадпісанняў, складзена 49 пратаколаў на юрыдычных і 154 — на фізічных асоб на агульную суму 114 млн руб. на суму больш як Br4 млн. «Звалкі ўзнікаюць стыхійна. Па кожным канкрэтным факце мы дэталёва разбіраемся, імкнёмся выстаўляць іскі», — адзначыў Андрэй Бас.

Разам з тым, ён звярнуў увагу на тое, што землекарыстальнікі (а гэта ў большасці арганізацыі лясной гаспадаркі, дарожныя службы) часта становяцца заложнікамі сітуацыі: смецце пакідаюць грамадзяне, а прэтэнзіі прад'яўляюцца ім. «У сувязі з гэтым патрэбна адладка ўсёй сістэмы збору і вывазу камунальных адходаў. Пакуль яна не будзе дзейнічаць, праблема не вырашыцца», — лічыць Андрэй Бас.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

БЫХАЎСКІ КАНВЕРТ

«Белпошта» аб'явіла, што 5 жніўня ўводзіцца ў абарачэнне мастацкі канверт з арыгінальнай маркай «Дзень беларускага пісьменства ў Быхаве».

На канверце ёсць выява герба Быхава і славутых месцаў і будынкаў горада — у прыватнасці старажытнага замка Сапегаў і Свята-Троіцкай царквы. На самой марцы — старажытны друкар і алфавіт з буквара Спірыдона Собаля.

Намінал маркі «А» адпавядае тарыфу на перасылку простага пісьма вагой да 20 грамаў у межах Беларусі. Мастак канверта і спецштэмпеля — Мікалай Рыжы. Канверт выраблены тыражом у 30 тысяч асобнікаў.

Спецыяльнае памятнае гашэнне адбудзецца 1 верасня ў аддзяленні паштовай сувязі № 2 горада Быхава. Таксама ў планах «Белпошты» — выпуск напрыканцы жніўня маркі з гербам Быхава.

На сайце belpost.by адзначаецца, што Дзень беларускага пісьменства — нацыянальнае свята. Яно адзначаецца з 1994 года ў першую нядзелю верасня. Праводзіцца дзеля прапаганды лепшых традыцый нацыянальнай культуры, друкаванага слова, духоўнасці беларускага народа. Цэнтрамі свята ўжо станавіліся 17 гарадоў. У Быхаве сёлета адбудзецца юбілейны XX Дзень беларускага пісьменства.

Ілона ІВАНОВА.

І ВЫБЕРУЦЬ МАЛОЧНАГА КАРАЛЯ

У Полацкім раёне сёння адбудзецца фестываль «Малочныя рэкі — 2013». У праграме свята-фэсту — правядзенне семінара для лепшых аператараў машыннага даення, дзіцячае свята «Піце, дзеці, малако — будзеце здаровы!», свята аграгарадка «Найлепшае месца на свеце», тэатралізаваная праграма «Малочнае раздолле».

Удзельнікаў і гасцей свята чакаюць «Малочная майстэрня» з майстар-класамі, на якіх пакажуць, што можна вырабіць з упаковак малочнай прадукцыі, бодзі-арт і разнастайная тэматычная конкурсная праграма. Будуць арганізаваны выстава-продаж малочнай прадукцыі, кірмаш-дэгустацыя. Святочныя мерапрыемствы завершацца выбарамі малочнага караля.

Правядзенне малочнага фэсту менавіта ў аграрным гарадку «Гараны» — частка стратэгіі развіцця Полацкага раёна, у рамках якой праводзіцца папулярызацыя такіх прафесій, як жывёлавод і аператар машыннага даення. Падчас свята будзе праведзена ўшанаванне лепшых работнікаў па выніках працы, знаёмства жывёлаводаў раёна з перадавым вопытам. На сённяшні дзень філіял Полацкага камбіната хлебапрадуктаў «Гараны-агра» з'яўляецца адной з лепшых гаспадарак Полацкага раёна. У прыватнасці, па ўмовах працоўнага саперніцтва аператараў машыннага даення ферма вёскі Арцюхі 4-ы раз заняла 1 месца ў абласным спаборніцтве сярод малочнатаварных фермаў, паведамілі ў Полацкім райвыканкаме. Свята пройдзе на тэрыторыі Гаранскай сярэдняй школы. У мерапрыемствах прымуць удзел не толькі жыхары аграгарадка, а і навучэнцы Полацкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці, дэлегацыі ад сельскіх Саветаў Полацкага раёна і іншыя.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У «МТБанка» — УЛАСНЫ ПРАЦЭСІНГ І НОВЫ БАНК-ПАРТНЁР

«МТБанк» пераводзіць працэсаванне аперацый з выкарыстаннем картак у сваю ўласную працэсінгавую сістэму.

Такім чынам банк атрымае магчымасць самастойна рэалізоўваць новыя прадукты, укараняць новыя карткавыя прадукты, недаступныя іншым банкам з-за пэўных тэхналагічных абмежаванняў. Павялічыцца хуткасць рэагавання на запыты кліентаў, а час на распрацоўку новых прадуктаў значна скароціцца. Банк зможа самастойна персаналізаваць карткі, што паскорыць працэс выдачы картак на рукі кліентам.

Новым партнёрам «МТБанка» стала ААТ «Белгазпрамбанк». Неўзабаве да ліку партнёраў павінен далучыцца і яшчэ адзін буйны банк. У бліжэйшыя ж некалькі месяцаў працягнецца супрацоўніцтва з «Пріорбанкам».

У сувязі з адкрыццём працэсінгавага цэнтра «МТБанк» бясплатна замяніў плацежныя карткі MasterCard/Maestro на карткі Visa. Па кругласутачным нумары О'К-цэнтра — (017) 229 99 99 можна даведацца, у якім аддзяленні забраць сваю картку Visa.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАДЭКЛАРАВАЦЬ АБЫШЛОСЯ Б ТАННЕЙ

Партыю запчастак да мота- і велатэхнікі канфіскавалі ў рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Новая Гута».

На мікрааўтобусе «Renault Master» наш суайчыннік з Украіны вёз сем пасажыраў, якія набылі чатыры лодкі з ПВХ і іншыя тавары. Менавіта таму кіроўца абраў для дэкларацыі чырвоны калідор. Пры гэтым сам заявіў, што ў яго няма тавараў, якія трэба пісьмова дэкларацыраваць. Пры мытным надглядзе мікрааўтобуса была дэмантавана ашалёўка салона, пад якой знаходзілася больш за 560 адзінак запасных частак да мота- і велатэхнікі, а таксама запасныя часткі да бензапіл і маторнае масла да іх, камплектуючыя да лодак з ПВХ. Дарэчы, кіроўца мікрааўтобуса прызнаў факт незаконнага перасоўвання тавару. Увесь кантрабандны тавар і мікрааўтобус (коштам больш за Br159 млн) канфіскаваны. Распачаты адміністрацыйны працэс. Кіроўцу пагражае штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь, паведамляе прэс-група Гомельскай мытні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

■ Погляд

ПАЖЫЎНАЯ ГЛЕБА ДЛЯ МІЖЭТНІЧНЫХ КАНФЛІКТАЎ

Прэвалюючым штуршком у развіцці еўрапейскага рэгіяналізму служыць наяўнасць дзяржаўнай мяжы паміж прадстаўнікамі адной і той жа этнічнай групы. Уз'яднанне рэгіёна ідзе па лініі аднаўлення кантактаў у асяродку прадстаўнікоў гэтай этнічнай групы праз знішчэнне дзяржаўнай мяжы і стварэнне больш цесных сетак — як эканамічных, так і культурных, палітычных, — якія больш цесна звязваюць прадстаўнікоў насельніцтва на гэтай тэрыторыі аднаго з адным, чым з іншымі часткамі краін, да якіх яны належаць палітычна. У сённяшняй практыцы рэгіяналізму ў рамках Еўрапейскага саюза праводзіцца старанная праца па развіцці дзясяткаў еўрарэгіёнаў на стыках еўрапейскіх дзяржаў, што ўваходзяць у ЕС. Рэгіёны маюць свае прадстаўніцтвы ў Бруселі, закліканы клапаціцца перш за ўсё пра інтарэсы гэтага рэгіёна, няхай нават гэта будзе ісці ва ўрон адной з краін, часткай якіх ён з'яўляецца. Асноўны матыў стварэння еўрарэгіёнаў даволі празрысты — звязаць краіны, якія ўваходзяць у ЕС, такім чынам, каб зрабіць выхад любой з іх з ЕС цяжкім.

Разгледзім для прыкладу Паўднёвы Ціроль, новы еўрарэгіён у Еўрапейскім саюзе, утвораны на мяжы Аўстрыі і Італіі. Пераважнае насельніцтва на гэтай тэрыторыі валодае аўстрыйскай ідэнтычнасцю па абодва бакі мяжы. Чым пагражае заахвочванне згуртавання насельніцтва ў рамках падобных рэгіёнаў Еўропе? Пры ўсёй дэкларованай аддаленасці і Аўстрыі, і Італіі ад дамаганняў на рэгіянальную адзінку, якая ў выніку фарміруецца, пры ўзнікненні напружанасці паміж Італіяй і Аўстрыяй у будучыні рэгіён яўна схіліцца на бок Аўстрыі. Усё большае і большае развіццё еўрарэгіёнаў робіць нацыянальныя дзяржавы, што ўваходзяць у Еўрапейскі саюз, фактычна закладнікамі гэтага наддзяржаўнага ўтварэння. З кожным годам выхад любой нацыянальнай дзяржавы з Саюза становіцца ўсё больш складаным у сувязі з цяжкасцямі пры спробе аднавіць дзяржаўную мяжу. Хваля аптымістычных пабудоў канцэпцый усходняга пашырэння ЕС базавалася на дастаткова ўразлівым фактары пастаяннага эканамічнага росту. Але ва ўмовах працяглага сусветнага эканамічнага крызісу, пры якім вядучым спонсарам ЕС даводзіцца адмаўляць у фінансаванні сумесных праектаў менш развітым краінам — удзельнікам саюза, сітуацыя мяняецца. Пры гэтым устойлівасць ЕС будзе залежаць ад працягласці і сілы такога крызісу, калі шэрагам нацыянальных дзяржаў можа быць прынята рашэнне аб пошуку выратавання ў адзіночку, спроба аднаўлення дзяржаўных межаў пры развітым рэгіяналізме можа стаць штуршком да новага этнічнага канфлікту, які па размаху не саступіць таму, што ўзнік пры распадзе Югаславіі. Вяртанне ва ўладу дзеячаў крайне правай арыентацыі, якім не ўласціва доўга вагацца ў прыняцці ключавых рашэнняў, робіць такі сцэнарый цалкам магчымым. Уключэнне ў Еўропу новых дзяржаў постсавецкага лагера, якія патрабуюць пастаянных інвестыцый, значна зніжае ўстойлівасць ЕС падчас эканамічных крызісаў. Ужо цяпер адным з пануючых настрояў у ЕС становіцца патрабаванне абмежавання патоку рабочых на тэрыторыю ранейшых краін ЕС з новых краін-членаў. Новыя краіны са слабаразвітой эканомікай пры сур'ёзным пагаршэнні кан'юнктуры змогуць стаць новай мішэнню для па-папулісцку настроеных палітыкаў.

Усё большае і большае развіццё еўрарэгіёнаў робіць нацыянальныя дзяржавы, што ўваходзяць у Еўрапейскі саюз, фактычна закладнікамі гэтага наддзяржаўнага ўтварэння.

Пры гэтым цалкам магчымым варыянтам можа стаць і вылучэнне цэлага рэгіёна з сумежных еўрапейскіх дзяржаў, і з ЕС у цэлым. Такія рэгіёны, пры ўмове іх паспяховага развіцця, будуць адчуваць больш адчужанасць ад ЕС у цэлым і ад сваіх краін-прабацькоў у прыватнасці, і ўсё большую прыналежнасць да канклава сусветнай заходняй цывілізацыі. Безумоўна, насельніцтва гэтых рэгіёнаў (а значыць, і палітычныя органы самакіравання) будзе ўсё з большым абурэннем успрымаць спробы адабраць частку свайго даходу на патрэбы слабаразвітой Сіцыліі (з боку Італіі) або Латвіі (з боку вярхоўных органаў ЕС).

Новая палітыка ў ЕС ідзе ад супрацьлеглага — пераразаюцца дзяржаўныя межы ва ўгоду этнічных сфер пражывання, падрываецца дзяржаўны аўтарытэт краін, якія ўваходзяць у ЕС, у той час як аўтарытэт ЕС як наддзяржаўнага ўтварэння застаецца эфемерным, а грамадзяне ЕС не адчуваюць сябе «еўрапейцамі», працягваючы ідэнтыфікаваць сябе з пэўнымі этнічнымі групамі.

Заходнія тэарэтыкі цудоўна апісалі механізм варварскіх этнічных чыстак, якія сталі вынікам распаду Югаславіі, адзначыўшы пры гэтым, што «канфлікты ў Югаславіі... паходзілі, часткова з самой нацыянальнай палітыкі, якая прымянялася былым камуністычным урадам, прызнавала падпарадкаваныя нацыянальнасці і этнічныя групы і праводзіла дзяржаўныя межы, якія наўмысна пераразалі этнічныя і нацыянальныя сферы пражывання», як пра гэта пісаў яшчэ ў пачатку 1990-х Кэлхаўн. Новая палітыка ў ЕС ідзе ад супрацьлеглага — пераразаюцца дзяржаўныя межы ва ўгоду этнічных сфер пражывання, падрываецца дзяржаўны аўтарытэт краін, якія ўваходзяць у ЕС, у той час як аўтарытэт ЕС як наддзяржаўнага ўтварэння застаецца эфемерным, а грамадзяне ЕС не адчуваюць сябе «еўрапейцамі», працягваючы ідэнтыфікаваць сябе з пэўнымі этнічнымі групамі. Палітыка рэгіяналізацыі фактычна стварае міні-дзяржавы, здольныя прэтэндаваць на межы спрадвечных дзяржаўных утварэнняў, што праходзяць праз іх тэрыторыі. Такая палітыка не змяншае шанцы на міжэтнічныя сутыкненні, а рэзка ўзмацняе іх. Ствараецца пажыўная глеба для разбуральнай катастрофы ў будучыні.

Тэарэтыкі выбудоўвання ЕС робяць звычайную для заходняй цывілізацыі памылку, свята верачы ў няўхільны эканамічны прагрэс заходняга арэала, палітычную перамогу над светам, у сілу якой няма неабходнасці клапаціцца аб палітычных і сілавых аспектах, а неабходна адбудоўваць — для эканамічнага замацавання захопу свету — перш за ўсё найбольш эфектыўныя эканамічныя структуры. У той жа час нельга выключаць і магчымасці, што частка еўраатлантымістаў, якія фанатычна вераць у ідэю ЕС, разумеюць усе магчымыя пагрозы палітыкі рэгіяналізацыі, але свядома разбураюць дзяржаўныя межы краін, якія ўваходзяць у ЕС, каб зрабіць еўраінтэграцыю незваротнай з прычыны той жахлівай цаны, якую давядзецца заплаціць любой дзяржаве за спробу выхаду.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук.

Наш культурны асяродак
Жыроандоля
Выпуск № 28 (198)

■ Выставы

КАЛЕКТЫЎНЫ ПАРТРЭТ У ІНТЭР'ЕРЫ ЧАСУ

На працягу месяца ў Нацыянальным мастацкім музеі можна стаць удзельнікам некалькіх розных юбілеяў: з 26 ліпеня па 26 жніўня тут наладжана выстава «З мінулага ў будучыню». Экспазіцыя складзена з жывапісных, графічных работ і скульптур творцаў-юбіляраў. Самым маладым з іх — 70, 75. Па традыцыі, яны са сваімі блізкімі паўдзельнічаюць у адкрыцці выставы.



— Увогуле, экспазіцыя прадстаўляе работы мастакоў, юбілеі якіх — ад 70-годдзя да 130-годдзя — мы сёлета адзначаем, — сфармулявала сутнасць выставы яе куратар Валянціна Вайцахоўская. — Юбілей заўсёды добрая нагода адкрыць для шырокага кола публікі найбольш цікавыя творы мастакоў мінулага і гэтага стагоддзя. Такія выставы мы практыкуем з 2008 года, і яны сталі адметнай з'явай у нашым культурным жыцці. «Калектыўны» юбілей — гэта даволі ўмоўная канцэпцыя для экспазіцыі. Але з першай жа выставы стала зразумела, што гэта вельмі цікава, калі побач выстаўляюцца розныя мастакі, якія працавалі ў адзін і той жа час, але, напрыклад, вучыліся ў розных месцах. Ці, наадварот, вучыліся ў Мінску ці Віцебску, а потым апынуліся за межамі Беларусі.

Экспазіцыя дае магчымасць убачыць нечаканыя мастацкія выказванні, галавакружныя паралелі, гэта вельмі захапляльна! Вядома, у першую чаргу гэта цікава для тых, хто хоча чытаць такія паведамленні, сігналы, хоча пачуць мастака, яго творчы маналог, даведацца пра яго разуменне прыгажосці, адкрыць для сябе нешта новае аб часе, сусвеце, гісторыі.

Такія выставы — гурманскія, яны для аматараў, для здольных зразумець, што творы, прадстаўленыя да іх увагі, — гэта летапіс жыцця грамадства, дзяржавы, культуры. І не толькі беларускай.

Такія выставы — гурманскія, яны для аматараў, для здольных зразумець, што творы, прадстаўленыя да іх увагі, — гэта летапіс жыцця грамадства, дзяржавы, культуры. І не толькі беларускай. Бо мастакі, аб'яднаныя экспазіцыяй, вучыліся за межамі Беларусі, з'язджалі, працавалі ў розных кутках свету, вярталіся дадому з новым творчым багажом.

Некаторыя, як Вячка Целеш, жывуць сёння не ў Беларусі. Але і ў Латвіі, куды яго закінуў лёс, ён застаецца шчырым беларусам, актыўным дзеячам беларускай суполкі, узначальвае аб'яднанне беларускіх мастакоў Прыбалтыкі «Маю гонар». На выставе дзве яго работы. Гэта вельмі сціпла. Але адной з умоў экспазіцыі было прадстаўленне твораў прапарцыянальна той колькасці, што захоўваецца ў фондах музея. У некаторых выпадках такая абмежаванасць вельмі трапная: тры карціны — тры творчыя перыяды. Так атрымалася ў выпадку з работамі Аляксандра Кішчанкі, Васіля Сумарава.

А з Іванам Ахрэмчыкам увогуле цікавая сітуацыя: гэта такая міні-выстава ўсяго ягонага творчага шляху. Вось, напрыклад, краявід з акна майстэрні. Яна была на вуліцы Свярдлова, за Тэхналагічным інстытутам. Работа сярэдзіны мінулага стагоддзя: на палатне застаўся Мінск, якога ўжо няма, з прыватнымі дамамі ў цэнтры сталіцы, кустамі бэзу і ажын, яблынямі.

Ахрэмчык увогуле многа пісаў бэз, толькі ў нас у фондах чатыры работы, і ўсе яны розныя. Гэтая напісана ў чэрвені 1953-га, рэакцыя на новы, больш свабодны час: тыран памёр у сакавіку. Па жывапісе можна бачыць змены ў грамадскім і творчым настроі: з 1948-га па 1953-ці на карцінах мастакоў — ледзяная пустэча. А як толькі дыхнула свабодай — на палотнах сонца, паветра, жыццё!

На карціне Івана Ахрэмчыка, што экспануецца, бэз адно толькі не пахне, ён буяе. Відаць, што сацыяльна ангажаваны мастак, які пісаў стрыманыя партрэты, браўся за грамадска значныя тэмы, на пейзажах проста «адпачываў»!

Пры знаёмстве з экспазіцыяй трэба быць уважлівым, каб не прапусціць работы Льва Зевіна (110 гадоў з дня нараджэння). Яны не на сценах, а пад шклом у спецыяльных празрыстых кубах. Гэты мастак — вучань Юрыя Пэна, Марка Шагала ды Казіміра Малевіча. З Беларусі ён з'ехаў у Маскву, а ў 1942 годзе загінуў на вайне.

На самой справе, выстава «З мінулага ў будучыню» зацікавіць не толькі глыбокіх знаўцаў мастацтва. Думаю, эмацыянальны ўздым чакае кожнага, хто ў гэтыя дні зазірне на экспазіцыю юбіляраў. Вось, напрыклад, «Індустрыяльны пейзаж» Васіля Сумарава (1969). Ля гэтай карціны ёсць падстава затрымацца: яна і па кампазіцыі, і па каларыстыцы, і па настроі адсылае гледача да сезанаўскіх работ пачатку мінулага стагоддзя. Але гэта і пейзаж не французскі, і мастак цалкам наш, беларускі, нават жыў ён у Мінску на вуліцы Беларускай — праўда, па гэтым адрасе зараз стаіць іншы дом.

Увогуле, арганізатары юбілейных выстаў лічаць, што, нягледзячы на непазбежна разнародны склад іх удзельнікаў, такія экспазіцыі ствараюць магчымасць паказаць творчы партрэт мастацкага пакалення. Гэта адмысловая мазаіка з індывідуальных мастацкіх рыс, тэндэнцый часу, лёсаў і непаўторнага ўспрымання творцамі рэальнасці. А для нас — гасцей гэтага незвычайнага мастацкага юбілейнага балю — адкрываецца магчымасць настроіцца на хвалю часу, зрабіць свае ўласныя эстэцкія знаходкі і адкрыцці.

Ларыса РАКОЎСКАЯ

ВЫТАНЧАНАСЦЬ ГЕАМЕТРЫІ

АБСТРАКТНЫЯ КАРЦІНЫ ВЯЧАСЛАВА ІГНАЦЕНКІ ПРАВАКУЮЦЬ УЯЎЛЕННЕ

Гэта калейдаскоп — вызначыў ён. Сапраўды, падобна. І калі толькі трапляеш на выставу ў Музей сучаснага выяўленчага мастацтва, то нібыта ўцягваешся ў гульню, якую аўтар карцін вядзе з гледачом. Імкнешся суаднесці тое, што бачыш, з тым, пра што ён мог думаць.

Кавалкі колераў — яны нібыта разбегліся ў розныя бакі, калі нехта неравярнуў выяву, парушыўшы яе адзінства. А вось яшчэ паварот — і кавалачкі імкнуцца да суладдзя, утвараючы нейкую форму, адмысловасць якой падкрэслена колерамі. І такое адчуванне, што на стракатыя кавалкі можна раскласці ўвесь свет, таксама як і можна падзяліць яго на розныя плоскасці, частка якіх ідзе паралельна, а частка перакрыжоўваецца ў прасторы. Сама прастора сваёй неабсяжнасцю правакуе жаданне раскласці яе на часткі — большыя і драбнейшыя. Яна правакуе прысвоіць часткам нейкі колер. Яна правакуе ўяўленне быць жывым, працаваць самастойна, складваць і раскладваць тое, што хтосьці ўжо падгледзеў. І намаляваў.

Абстрактны жывапіс не новы — тут няма адкрыцця. Але кожны з мастакоў, якія сёння стварае ў гэтым рэчышчы, індывідуальны менавіта ў тым, што ў яго сваё абстрактнае мысленне і індывідуальная манера яго праявіць праз колер. Як у геаметрыі, дзе ўсё падуладна пэўным законам і правілам: у мастацтве яны таксама ёсць.

Сама прастора сваёй неабсяжнасцю правакуе жаданне раскласці яе на часткі — большыя і драбнейшыя.

Што да Вячаслава Ігнаценкі, то ён іх засвойваў у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (як тады называлася гэтая навучальная ўстанова), скончыў аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў 1983 годзе. Але так сталася, што выхаванец беларускай мастацкай школы родам з Гомельшчыны жыве ў Малдове. Але сувязяў з радзімай не губляе, пра што сведчыць і выстава, на якой размясціліся 56 яго работ. Гэта нібыта творчая справаздача перад землякамі за некалькі дзесяцігоддзяў. Але ж былі і важкія, вельмі адметныя перамогі, пра якія мы можам ведаць і ганарыцца: напрыклад, першае месца ў раздзеле «графіка» на Міжнароднай выставе ў Таронта ў 1994 годзе. З таго часу Вячаслаў Ігнаценка меў больш за 30 выстаў (у Беларусі, Малдове, Украіне). Працы мастака ёсць у калекцыях музеяў гэтых краін, і ў прыватных калекцыях шмат якіх іншых краін. Прыемна, што і ў Беларусі яны ёсць: у Нацыянальным мастацкім музеі і Нацыянальным гістарычным музеі.

І можна зразумець, чаму такая творчасць прывабліве. У абстрактным мастацтве ёсць свабода — не толькі для мастака, які адлюстроўвае такім чынам адносіны ў складаным сусвеце, што, нягледзячы на бурнае развіццё навукі, застаецца ўсё ж таямнічым, таму што ёсць тут месца думкам пра скрыўленасць прасторы, пра норы ў часе, па якіх можна здзяйсняць вандроўкі ў невядомае. Абстрактнае мастацтва, па сутнасці, прапаноўвае такую вандроўку, толькі не адрываючыся ад зямлі. Таму ў абстрактным мастацтве ёсць свабода для гледача, свядомасць якога не стрымліваецца канкрэтным вобразам ці формай і накіроўваецца на жаданне спасцігнуць таямніцу, якую прапанаваў мастак. Ён прапанаваў — але працуем мы, калі кавалачкі колераў пачынаем бачыць у адзінстве, разумеючы, што ў ім ёсць пэўная гармонія.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Рарытэт

«Вялікае мастацтва...» Семяновіча

ВЯРТАННЕ КНІГ НАШАГА ЗЕМЛЯКА, ВЫДАДЗЕНЫХ У XVII СТАГОДДЗІ: ТРЫ АСОБНІКІ

«Вялікае мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча, падобна, было вельмі запатрабаванай кнігай. На розных мовах свету выдавалі яе! Аўтар, відаць, зрабіў на той час вельмі актуальную, наватарскую працу, здзейсніў сапраўдны навуковы прарыў. Яго трактат, упершыню выдадзены на латыні ў 1650 годзе ў Амстэрдаме, фактычна стаў падручнікам па артылерыі. Але ў нашай краіне не было ніводнага асобніка выдання XVII стагоддзя. Да мінулага года. А летась адбыўся прарыў: выданні трактата на лацінскай (1650 года) і на французскай (1651 года) мовах атрымала Нацыянальная бібліятэка Беларусі дзякуючы падтрымцы ААТ «БПС-Сбербанка». І сёлета Беларусь займела трэцюю кнігу, якая была выдадзена ў 1676 годзе ў Франкфурце-на-Майне. Пераклад зроблены Томасам Бэрэнам, а ўступнае слова напісаў Данізль Эрліх. Атрымаць гэтую кнігу ўдалося дзякуючы спонсарам з «БелАВМ», якія перадалі яе ў падарунак бібліятэцы.

Каштоўныя набыткі Нацыянальнай бібліятэкі — гэта набыткі для нас усіх. Магчымасць усвядоміць, як выхадцы з нашых земляў уплывалі на развіццё сусветнай навуковай думкі. Магчымасць зразумець: кожны народ нараджае геніяў, пра якіх потым ствараюцца легенды. Легендарнымі становяцца іх працы, якія вярэдзілі розумы ў свой час — нездарма ж кнігі Семяновіча выдаваліся па ўсёй Еўропе.

Відаць, усім хацелася марыць пра новыя гарызонты, заваёўваць прасторы і адчуваць сябе гаспадарамі свету: ці не да гэтага прывяло чалавецтва бурнае развіццё касманаўтыкі?

Прычым тут XVII стагоддзе, — могуць спытаць тыя, хто са школьных гадоў уражаны адкрыццямі Цыялкоўскага. Усё проста: ён са сваімі марамі-тэорыямі быў, напэўна, геніяльным, але не першым, хто сваімі навуковымі даследаваннямі пачаў ствараць падмурак касмічнай будучыні чалавецтва. Казімір Семяновіч, які паходзіў з Вялікага Княства Літоўскага і называў сябе шляхцічам-ліцвінам, лічыцца адным з заснавальнікаў сусветнай ракетнай балістыкі і касманаўтыкі. Ён жа фактычна акрэсліў магчымасць з'яўлення шматступенчатай ракеты, прыдумаў падзяляць паліва на адсекі. Амерыканскае касмічнае агенцва НАСА лічыць Казіміра Семяновіча заснавальнікам усёй ракетнай тэхнікі. Яго распрацоўка трохвугольнага крыла дагэтуль выкарыстоўваецца ў будаўніцтве касмічных апаратаў.

Праўда, за апошнія стагоддзі імя Семяновіча амаль знікла са свядомасці людзей у нашай айчыннае — былі іншыя героі і вынаходнікі, пра якіх шмат пісалі і распавядалі. Пра тое, што была праца шляхціца родам з Дуброўна, што на Віцебшчыне, ведалі больш спецыялісты. Асоба адраджэнскага складу, Семяновіч быў вельмі адукаваным чалавекам у свой час, валодаў рознымі мастацтвамі — як тэхнічнымі, так і прыгожымі. Фактычна, гэта наш Леанарда. І як у Леанарда, у яго гісторыі ёсць свая таямніца. Заўчасная і нечаканая смерць Казіміра Семяновіча застаецца таямнічай: ці то небяспечныя доследы раптоўна падарвалі здароўе, ці то зайздроснікі, ці то надта смела ён вывучаў Сусвет і нехта яго ў гэтым спыніў. Але застаецца яшчэ і загадка другога тома гэтай «прарыўной» працы, дзе аўтар нібыта вынайшаў, як удасканаліць зброю. І калі недзе ёсць рукапіс (а нам жа вядома, што яны не гараць!), то застаецца марыць пра збег абставін, пры якім могуць сысціся зоркі і знайсціся мецэнаты на наступнае вяртанне навуковых прац Семяновіча.

Ларыса ЦІМОШЫК

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

У час існавання СССР беларускім юнакам дзе толькі ні даводзілася праходзіць тэрміновую службу (я, напрыклад, пасля мінскай вучэбкі на паўтара года трапіў аж у Манголію). І кожны, вярнуўшыся дадому, у кампаніі сяброў любіў расказваць розныя цікавыя, часам незвычайныя гісторыі пра сваю службу. Часам расказвалася і пра нестатутныя адносіны, пра канфлікты паміж прадстаўнікамі розных рэспублік, розных нацыянальнасцяў, выкліканыя барацьбой за «месца пад сонцам». Таму не здзіўлюся, калі выпадак, у які трапіў галоўны герой апавядання Віктара Супрунчука, аўтарам цалкам спісаны з рэальнага жыцця.

Аднак жа вось чамусьці, калі прачытаў гэты твор, адразу згадаўся мне спачатку радавы, а пад канец службы сяржант Гаджыеў, азербайджанец па нацыянальнасці, з якім на працягу доўгага часу ў нас былі вельмі нянростыя адносіны, ды, калі развітваліся ў дзень майго вяртання ў Саюз, абняліся, як самыя блізкія сябры, і абодва пашкадавалі, што не ў адзін дзень пакідаем часць. Чым не сюжэт для апавядання? Але гэта ўжо, як кажуць, зусім іншая гісторыя.

Алесь Бадак.

МІКРАМАЁР

Сяргей думаў, думаў і не мог вырашыць, што рабіць. Перад ім паўзлі аблокі, ухутваючы сваім пухам вяршыні гор. Плылі, плылі, ледзь не датыкаючыся салдацкай казармы і нефарбаваных, збудаваных яшчэ пасля вайны, шчытавых афіцэрскіх домікаў. У крайнім злева, ля самай цясніны, жылі яны з жонкаю. Галя зараз была ў доме. Яна тры дні ўжо не выходзіла на вуліцу. Баялася...

Сяргей з малых гадоў марыў стаць афіцэрам. Лётчыкам, бо побач з іхняй вёскай быў ваенны аэрадром. Удзень і ўначы над хатай раўлі самалёты. У лётчыкаў была прыгожая форма. Ва ўсіх скураныя карычневыя курткі. Зімой — унты, а не валёнкі, як у вяскоўцаў. Сусед Генадзь, які працаваў качагарам у сталоўцы на аэрадроме, расказваў, што і харчаваліся лётчыкі багата. Кожны дзень на стале былі шакалад, розныя сокі.

У лётчыкі Сяргей не трапіў па здароўі, пайшоў у армію. На другім годзе службы яму прапанавалі вучыцца на курсах малодшых лейтэнантаў. Ці, як іх называлі, мікрамаёраў. У маёра вялікая зорка на пагоне, а ў малодшага лейтэнанта — малая. У перспектыве можна было здаць экзамены экстэрнам за вучылішча, атрымаць званне лейтэнанта і — пайшоў далей, далей. У суседа сын цяпер падпалкоўнік, а быў мікрамаёрам.

Сяргей паспяхова скончыў курсы, і яго прызначылі ў ваенна-будаўнічы батальён на пасаду намесніка камандзіра роты па палітычнай рабоце. Атрымаўшы дзесяць дзён адпачынку, ён за гэты час ажаніўся з Галяй, светлавалосай і блакітнавокай дачкой суседзяў. З ёй Сяргей сябраваў яшчэ са школы. Яна вучылася на два класы ніжэй.

Галя была стройная і высокая. Ростам амаль як Сяргей. А ён быў такі ж бялявы. Толькі вочы зялёныя, бы веснавое лісце. На вяселлі ўсе госці былі аднадушныя: адметная пара.

Рота стаяла высока ў гарах. Ім з Галяй тут спярша не вельмі спадабалася. Прырода была зусім не падобная на беларускую. З усіх бакоў горы. Толькі ў цясніне, абапал ледзь прыкметнага ручая, які вясной ператвараўся ў імклівую паўнаводную раку, раслі рэдкі лясок і калючыя кусты з блакітнымі ягадамі. Бязлітасна смаліла сонца, а з вечара і да раніцы дзьмуў з боку Турцыі жорсткі, халодны вецер.

Сяргей быў самы малады з афіцэраў, равеснік многім салдатам. Калі б не курсы, ён яшчэ даслужваў бы свой тэрмін. Але на плячах у яго ўжо былі афіцэрскія пагоны, якія надавалі ўпэўненасці і годнасці.

З камандзірам роты капітанам Марціросавым, сівым, лысаватым дзядзькам, склаліся нібыта някепскія адносіны. Ён, здаецца, ніколі не павышаў голас і часта, у прысутнасці іншых афіцэраў, хваліў Сяргея. Яны з Галяй некалькі разоў запрашалі Марціросава ў госці. Кожны раз капітан проста засыпаў маладую жанчыну камплімentамі. Маўляў, такой прыгажуні няма больш на свеце; ён зайздросціць Сяргею, якому пашчасціла з жонкай.

У роце, у асноўным, служылі выхадцы з Каўказа і Сярэдняй Азіі. Сяргей неаднойчы заўважаў, з якім нахабствам яны разглядвалі ягоную жонку. Тады яму хацелася каму-небудзь з іх набіць морду. Нават абязвечыць. Аднак паступова Сяргей звыкся з тым, што жонка пастаянна ў цэнтры ўвагі, нават нібыта перастаў заўважаць бессаромныя позіркі сваіх падначаленых.

Галя без мужа нікуды не хадзіла, хіба акрамя толькі да суседзяў, трыма

■ 28 ліпеня — Дзень ваенна-марскога флоту

ЮНГА З САЛАВЕЦКІХ АСТРАВОЎ

«Ужо на другім годзе вайны флот адчуваў вострыя недахоп добра абучаных спецыялістаў. Бо тыя, хто загінуў, былі мінёрамі, радыстамі, рулявымі, гальванёрамі, оптыкамі і электрыкамі...» Гэтыя радкі ўзяты з кнігі Валянціна Пікуля «Хлопчыкі з банцікамі». Сам пісьменнік 14-гадовым падлеткам трапіў у далёкім 1942 годзе ў толькі што створаную школу юнгаў. Месцілася яна на сумна вядомых Салавецкіх астравах. Да нашых дзён дажылі лічаныя людзі з таго першага выпуску школы. Адзін з іх — наш зямляк, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Канстанцін Лазарчук.

Насамрэч, з ім завочна знаёмыя многія жыхары і госці Мінска. Калі ў Беларусі святкавалася 60-годдзе Перамогі, то выява бывалага марака была змешчана на шматлікіх гарадскіх рэкламных стэндах. У кватэры ж ветэрана створаны сапраўдны марскі куток. Прасторны пакой упрыгожвае вялікі партрэт заснавальніка расійскага флоту Пятра I. На сцяне вісяць рэпрадукцыя «Дзявятага вала» Айвазоўскага, шматлікія карабельныя вымпелы, паменшаная копія штурвала, фотаздымкі парусніка...

— На мора я трапіў з-за збегу абставін, — расказвае ветэран. — Нарадзіўся ж я ў Самахвалавічах, што пад Мінскам. А ў дваццаць восьмым годзе, калі мне было ўсяго два гады, мы пераехалі ў далёкі Сталінград. Бацька мой знайшоў працу на тамтэйшым трактарным заводзе. Хацеў пайсці па яго слядах і я. Скончыў сямігодку, фабрычна-заводскае вучылішча і толькі ўладкаваўся на завод электрыкам, як грымнула вайна. Амаль год усе хлопцы з завода праселіся на фронт. І я таксама. Але куды пашлюць пятнаццацігадовага юнака, у якога нават і пашпарта яшчэ не было?

У 1942-м пра яго ўспомнілі. Туга прыходзілася тады на вайне нашым флатам. Балтыйскаму, які ледзь прарваўся з Таліна ў Кранштат. Моцна цярпеў ад нямецкіх атак флот Паўночны, які не пускаў у савецкае Запаляр'е гітлераўскія падводныя лодкі і канваіраваў каштоўныя грузы, што ішлі з амерыканскага кантынента. Зацішша панавала толькі на Цихім акіяне. Але было яно падобна да сядзення на парахавой бочцы — зусім побач Японія, якая адкрыта сімпатызавала нацыстам... Шмат маракоў склалі галовы ў першыя ваенныя месяцы. Над флатамі ўсур'ёз павіс дамоклаў меч з-за недахопу спецыялістаў. Таму паўстала пытанне — як жа ўкамплектаваць караблі? Наркам ВМФ адмірал Кузняцоў у маі 1942 года загадаў стварыць на Салаўках школу юнгаў. Планавалася, што праз год з яе выйдуць кваліфікаваныя боцманы, матарысты, рулявыя, радысты, артылерыйскія і тарпедныя электрыкі. Ахвотнікаў вучыцца сабралася шмат. Аднак многіх адбракавалі яшчэ на медкамісіі. Хлопцы без праблем праходзілі акуліста, неўрапатолага, але адсейваліся на праверцы вестыбулярнага апарату.

Сотні хлопцаў, сабраных з усіх неакупаваных тэрыторый краіны, знайшлі прытулак у колішняй манастырскай турме.

— Гэта цяпер усе ведаюць пра тое, што там раскручваюць крэсла, а пасля просяць устаць і назіраюць за тым, як ты сябе паводзіш. Але што пра гэта ведалі сухапутныя падлеткі? Праўда, я ўжыў тады ваенную хітрасць. Устаў, цела крыху цягне ў адзін бок, а я з усіх сіл гляджу ў процілеглы. Дактары нічога не заўважылі, а пасля да гайданкі неяк і прызвычаіўся.

Так двухсот сталінградскіх падлеткаў на параходзе павезлі па Волзе ў Яраслаўль. Цягніком адтуль даехалі да Архангельска, прайшлі там кантрольны агляд у медыкаў і ўжо адтуль на параходзе «Камсамолец» 1 верасня пераправіліся на Салаўкі. І літаральна на наступны дзень адкрыліся цікавыя рэчы — вучыцца ж не было дзе. Сотні хлопцаў, сабраных з усіх неакупаваных тэрыторый краіны, знайшлі прытулак у колішняй манастырскай турме. Недалёка ў лесе стаяў дамок, дзе размясцілася санітарная часць. У былой гасцініцы для пілігрымаў пасялілася начальства. Вось і ўся матбаза... Таму будучыя юнгі былі вымушаны будаваць школу для сябе самастойна. Хлопцы адразу пачалі валіць лес, карчаваць векавыя пні, капаць катлаваны, будаваць зямлянкі-кубрыкі... Моцна падціскаў час — маразы на астравах наступаюць ужо ў канцы кастрычніка.

— Мяне вучылі там майстэрству электрыка тарпедных апаратаў. Увогуле, будучую вайсковую прафесію нам падбіралі, кіруючыся нашым цывільным вопытам. Спецыяльнасць мая была вельмі адказнай. Уявіце сабе — на караблі шэсць тарпедных апаратаў, у кожны з якіх запраўлена металічная цыгара, дзе мінімум 120 кілаграмаў выбухоўкі. І ты пастаянна сочыш, каб уся электрыка ў гэтых машынах спраўна. Калі што пойдзе не так, або тарпеду заклініць пры стрэле, або можа быць яшчэ горш... Не забываліся ў школе юнгаў і на выкладанне звычайных школьных прадметаў. Так мы спасцігалі адначасова мірную і ваенную навуку да кастрычніка сорак трэцяга. А пасля надышло размеркаванне. Мяне пакінулі на Поўначы.

Некалькі разоў Канстанцін Лазарчук удзельнічаў у канваіраванні гандлёвых судоў, якія везлі грузы з Брытаніі, Злучаных Штатаў і Канады ў паўночныя парты СССР. Аднак пра гэта ветэран гаворыць вельмі мала, бо бачыў не шмат — увесь час знаходзіўся на варце ля тарпедных апаратаў.

А незадоўга да канца вайны марака перавялі на Ціхі акіян, на эскадраны мінаносец «Расторопный». Праўда, калі нашы ў жніўні 45-га аб'явілі вайну Японіі, зацяжных і моцных баёў на вадзе не было. Тэатр ваенных дзеянняў перанёсся тады ў Маньчжурыю. Хаця хапала працы і флоту. Канстанцін Лазарчук удзельнічаў у вызваленні Курыльскіх астравоў. Памятае ён і дэсант у порт Атамары (зараз — Корсакаў) на падзеленым тады на дзве паловы Сахаліне. Японскія прычалы ў Атамары савецкія маракі бязлітасна тарпедавалі. Раз-пораз з-за лініі гарызонта з'яўляліся і камікадзэ. Аднак нашы зенітчыкі спрацоўвалі на «выдатна» — ніводзін японскі самалёт так і не даляцеў да палубы карабля. Другая суцветная для ўраджэнца Самахвалавіч скончылася ва Уладзівастоку 3 верасня 1945 года.

— На жаль, маіх таварышаў застаецца ўсё менш, — дрыжыць голас у ветэрана, які гартае старэнькі альбом з фотаздымкамі сваіх саслужыўцаў і ваенных караблёў. — Два месяцы таму ў іншы свет адышоў апошні мой сябар са школы юнгаў, з якім мы прыехалі сюды пасля дэмабілізацыі ў 1950-м. Так што ў Мінску з першага салавецкага выпуску застаўся, пэўна, адзін я. Чуў, праўда, што нібыта ў Валгаградзе яшчэ жывуць некалькі маіх аднакашнікаў. Але пабачыць іх ужо наўрад ці змагу...

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■

КРЫЖ З ВІЦЕБСКА ЯК СІМВАЛ МАРСКОГА БРАТЭРСТВА

У Віцебску ля самага вялікага праваслаўнага храма — Свята-Успенскага кафедральнага сабора — асвяцілі вялікі крыж, які будзе ўсталяваны ў Севастопалі. Гэты крыж — знак памяці і павагі да маракоў, беларусаў па нацыянальнасці, якія бралі ўдзел у Крымскай вайне (1853—1856 гг.).

Асвячэнне крыжа. Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Ідэя ўстанавіць гэты своеасаблівы помнік належыць энтузіястам. Крыж выраблены з хвоі і каванага металу на грошы, сабраныя тымі, хто служыў на флоце, а таксама выконваў інтэрнацыянальны абавязак.

Як расказаў прадстаўнікам СМІ Арсеній Крыцкі, аўтар расійска-беларускага праекта «Марское братэрства — непарушнае!», вельмі сімвалічна, што гэты крыж будзе ўсталяваны напрыканцы ліпеня ў раёне Севастопаля, дзе сярод іншых ёсць такія вуліцы, як Віцебская, Магілёўская, Мінская і гэтак далей. Паводле яго слоў, падчас установкі крыжа ў Севастопалі прадстаўнікам Беларусі паабяцалі перадаць копіі штандараў беларускіх палкоў, якія прадэманстравалі гераізм падчас абароны горада.

Крыж асвяціў кіраўнік праваслаўнай епархіі, архіепіскап Аршанскі і Віцебскі Дзімітрый. У цырымоніі бралі ўдзел прадстаўнікі ўлады вобласці і горада, ганаровыя госці з Расіі.

Цікава, што ў Віцебску плануецца стварыць музей ваенна-марскога флоту. А ў пасёлку Асвея Верхнядзвінскага раёна быў адкрыты першы ў Беларусі клуб будучых маракоў «Гардэмарыны». Пра гэты клуб «Звязда» расказала адной з першых. Марской справе дзяцей вучыць Васіль Іосіфавіч Руды, капітан 1 рангу ў адстаўцы, і яго аднадумцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Раўненне на лепшых

Спартыўныя медалі для праваахоўнікаў

Фота БЕЛТА

Ігар Шуневіч уручае падзяку Вользе Худзянка.

З 13 залатых медалёў, заваяваных на казанскай універсіядзе, 8 — на рахунку супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і ваеннаслужачых унутраных войскаў.

З перамогамі на XXVII Сусветнай летняй універсіядзе, якая прайшла ў Казані, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і ваеннаслужачых унутраных войскаў павіншаваў міністр унутраных спраў Беларусі Ігар Шуневіч. «Мне як міністру вельмі прыемна, што з больш як 160 спартсменаў нашай зборнай 11 прадставілі МУС Беларусі, — сказаў Ігар Шуневіч падчас цырымоніі ўшанавання. — Вы не проста служыце і выконваеце абавязкі па ахове грамадскага парадку, раскрыцці злачынстваў, але і спрыяеце станоўчаму іміджу міністэрства і краіны ў цэлым». Падчас сустрэчы з міністрам атлеты абмеркавалі некаторыя пытанні аховы правапарадку на спартыўных мерапрыемствах у нашай краіне. Маладыя людзі звярнулі ўвагу на актыўную работу валанцёраў падчас спаборніцтваў: «На трыбунах рэдка можна ўбачыць паліцыю». Ігар Шуневіч адзначыў, што ў нас таксама вядзецца работа ў гэтым кірунку. Нядаўна пытанні камфортнага знаходжання гледачоў на стадыёнах падчас футбольных матчаў абмяркоўваліся ў офісе Беларускай федэрацыі футбола на сустрэчы са старшынёй асацыяцыі БФФ Сяргеем Румасам. Тады было прынята рашэнне аб стварэнні пастаянна дзейнай рабочай групы па маніторынгу сітуацыі на стадыёнах і распрацоўцы стратэгіі ўзаемадзеяння паміж асацыяцыяй і МУС пры правядзенні футбольных матчаў. Адной з галоўных мэт стварэнні стратэгіі з'яўляецца ўвядзенне службы сцюардаў і вывад супрацоўнікаў міліцыі за межы стадыёна.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Футбол

СТАЛІЧНЫ ПРАРЫЎ

Беларускія каманды працягваюць выступаць у еўракубках! Пуцёўкі ў 3-і кваліфікацыйны раўнд Лігі Еўропы заваяваў дуэт сталічных клубаў — «Дынама» і «Мінск».

Яшчэ напярэдадні другога паядынка паміж «Мінскам» і мальтыйскай «Валетай», які адбыўся на жодзінскім стадыёне «Тарпеда», Вадзім Скрыпчанка, настаўнік мінчан, рашуча заяўляў, што мальтыйцы — не такі ўжо і лёгкі сапернік, як раней пісала прэса. Першы матч у гасцях прадэманстраваў, што дзеля галачкі хлопцы англійскага трэнера Марка Мілера на поле ў Лізе Еўропы выходзіць не будуць. Іх мэта — змагацца да апошняга. І баявая нічыя ў першай гульні (1:1) яскрава сведчыла пра намеры гэтай самабытнай каманды.

Нягледзячы на тое, што з-за адсутнасці годнай уласнай арэны «Мінску» даводзіцца прымаць саперніка ў Жодзіне, падтрымка камандзе была забяспечана. Назваць атмасферу на стадыёне па-сапраўднаму святочнай, мяркую, нельга, але балельшчык адчуваў сябе ўтульна, набываў сувенірную атрыбутыку, запаўняў чэргі па піражкі і салодкія напоі. За ўсім з цікаўнасцю назіраў эстрадны спявак Сяргей Мінскі, які нядаўна ўзначаліў аддзел маркетынгу ФК «Мінск». На пасадзе ён зусім нядаўна, але якасную працу з заўзятарамі ў гэтай камандзе адзначае амаль кожны. Аказваецца, цяпер на матчах яго каманды можна не толькі паспрабаваць выйграць у латарэі веласіпед, але і паслухаць міні-канцэрт.

— Да канца бягучага сезона мы маем дагавор з гуртом «Артэфакт», адным з найлепшых айчынных кавер-ансамбляў, — паведаміў Сяргей Мінскі. — Налета мы аб'явім спецыяльны тэндар. Плануем пры клубе стварыць футбольны тэатр.

Што гэта будзе, Мінскі пакуль не прызнаўся. Затое сапраўдная тэатральная драма магла разгарнуцца на полі ўжо на першых хвілінах, калі «Валета» актыўна рушыла наперад. Пад гучны канферанс Марка Мілера, які амаль усю гульню правёў у буцах ля самай броўкі, смуглявыя хлопцы ў белых футболках рушылі да варотаў Уладзіміра Бушмы. Рабілі гэта актыўна, але безвынікова. Між іншым, пры блізкім вывучэнні мальтыйскай каманды (у чым нам дапамог Жан-П'ер Плака, адзін з пятнаццаці тамтэйшых заўзятараў на жодзінскіх трыбунах) аказалася, прафесіяналаў у гэтым клубе зусім няшмат. Добрая палова футбалістаў паралельна працуе. Нехта гэта робіць на стадыёне, нехта служыць у войску, працуе настаўнікам, кур'ерам, трэнерам у трэнажорнай зале, а нехта яшчэ корпаецца з падручнікамі ў аўдыторыях універсітэта, што зусім не перашкодзіла гасцям патузаць нервы гаспадарам.

Люк Дзімэк карыстаўся поспехам у маленькіх паляўнічых за фотаздымкамі.

— У гэтай камандзе ёсць нядрэнныя гульцы. Напрыклад, лінія атакі. Ім трэба было забіваць, ісці наперад, — прызнаўся «Звяздзе» пасля гульні Раман Бегуноў, паўабаронца «Мінска». — А мы наадварот, не ляцелі, аднак пры такой гульні моманты ў нас з'явіліся.

Адзін з тых, хто на працягу сустрэчы імкнуўся цэментаваць абарону «Валеты» і дапамагаць сябрам у атацы — 36-гадовы прафесіянал Люк Дзімэк. На яго твары — добрая барада, над ілбом — стужка панкаўскага іракеза, да якога дапасоўваюцца шматлікія тату на магутных руках. Здалёк ён нагадвае рэгбіста і культурыста. Брутальны Люк выглядаў на полі годна, але так і не здолеў разам з партнёрамі абараніць свае вароты ад галоў. У другой палове больш дасведчаны «Мінск» з дапамогай бліскучага Рамана Васілюка сваё ўзяў і адправіў у сетку гасцей два мячы. На гэтым і завяршылі. 2:0 — лік, які цалкам пацвярджае перавагу «Мінска» над «Валетай» амаль у кожным кампаненце гульні.

...На полі жахлівы, а за яго межамі ўсмешлівы Люк Дзімэк з-за сваёй знешнасці адразу робіцца героем жодзінскіх школьнікаў.

— Гэта мой запал, — пазіруючы на свае татуіроўкі, кажа Дзімэк. — У іх перададзена ўсё, што мяне цікавіць.

— Дарэчы, наконт гульні. За зборную Мальты вы правялі больш за 70 матчаў. Гулялі супраць «зорак» — Златана Ібрагімавіча і Марыё Балатэлі. А як вам нападаючыя «Мінска»?

— Добрыя, вопытныя, вельмі хуткія форварды. Я не ведаю, як яны гуляюць у чэмпіянаце Беларусі, аднак мне здаецца, што яны маюць пэўны патэнцыял. «Мінск» — добрая каманда, але і мы мелі магчымасці забіць. Мяркую, асноўнае, што прадвызначыла вынік супрацьстаяння — гэта тое, што ў вашым чэмпіянаце згулялі ўжо палову першынства, а мы толькі тры тыдні трэніруемся. Акрамя таго, «Мінск» — гэта цалкам прафесіянальны клуб. Гэта таксама пра многае кажа.

Зразумела, кожнага саперніка трэба паважаць, але ў наступнай стадыі мінчан чакае шатландскі «Сэнт-Джонстан». Клуб, які расправіўся над легендарным нарвежскім «Русэнборгам», наўрад ці можа дараваць памылкі, якімі не скарысталіся паўаматары з Мальты.

❍❍❍

Іншым шчасліўчыкам аказалася мінскае «Дынама». Камандзе Роберта Маасканта прыйшлося цяжэй за ўсіх, разам узятых, нашых удзельнікаў Лігі Еўропы. Пасля хатняга паражэння ад харвацкай «Лакаматывы» (1:2) колькасць балельшчыкаў, якія працягвалі верыць у поспех «Дынама», вокамгненна паменшала. Але мінчане прадэманстравалі цудоўны футбол, перамаглі з добрым для іх лікам 3:2 і прайшлі ў 3-ці раўнд, дзе сустрэнуцца з турэцкім «Трабзанспорам». «Для нас вельмі важна, што мы працягваем барацьбу ў Лізе Еўропы, бо мы развіваемся ад гульні да гульні, — падкрэсліў задаволены матчам у выкананні каманды Роберт Мааскант, трэнер «Дынама» . Шкада, але горш за ўсіх выступіў салігорскі «Шахцёр». «Гарнякі» двойчы згулялі ўнічыю з малдаўскім «Мілсамі» 1:1 і саступілі ў серыі пасляматчавых пенальці. У выпадку перамогі, у якую так верылася беларусам, да «Шахцёра» прыехаў бы «Сэнт-Эцьен», адзін з найбольш вядомых клубаў Францыі.

Тарас ШЧЫРЫ.
Фота Надзеі БУЖАН

На «другім паверсе» за мяч змагаецца мінчанін Віталь Кібук.

Фанатаў у «Мінска» пакуль няшмат, але іх галасы чуе ўвесь стадыён.

■

Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ООО «Центр правовых услуг» ПОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества Общества с дополнительной ответственностью «КонсалтЛизинг»:

№ лота	Наименование имущества	Ед. изм.	Кол-во	Начальная цена предмета торгов	Сумма шага аукциона в размере 5%, руб.
1	Агрегат холодильный с полугерметичными компрессорами "Bitzer" АКФН-4 ДС-5.2 Y-4OS Агрегат холодильный с полугерметичными компрессорами "Bitzer" АКФ-4 FC-5.2 Y-4OS Витрина холодильная "Неман" 240 ОВВН 0.7-2.2.2 Витрина холодильная "Неман" 300 Витрина холодильная "Неман" 300 Весы SM-300B Весы SM-300P Витрина холодильная среднетемпературная ВХСГИ 1.3/1.2 (сдвоенная) Витрина холодильная среднетемпературная ВХСГИ 1.3/1.2 (сдвоенная) Витрина холодильная модель АСВ-200 Витрина холодильная модель АСВ-200 Горка металлическая Витрина холодильная (пристенная) "Неман-240ПВС" Витрина холодильная (пристенная) "Неман-300 ПВС 2.4-6.5-2" Витрина холодильная (пристенная) "Неман-300 ПВС 2.4-6.5-2" EXERT система противокражная ККМ IPC POS IIS СПФ (Модификация Б) ККМ IPC POS IIS СПФ (Модификация Б) ККМ "Кассаби-04Ф" Кондиционер MCQuay Кондиционер MCQuay Кондиционер MCQuay Вакуумная упаковочная машина EasyPack B018 Машина упаковочная термоусадочная модель AC-INPUT Mod.SL-44 Монитор L1717S Монитор L1550S Монитор L1550S Холодильник/морозильник "Атлант" моедль МХМ-1734-01 Принтер печати «EPSON» модель TM-V210A-M-119A Принтер TEC B-SV4D SERIES Принтер чеков TM-U210 Series Model M188A-FTCG 150976 Принтер чеков TM-U220 Printers Model M188A-FTCG 150370 Сканер лазерный VS2200 (прикассовый) Сканер лазерный VS2200 (прикассовый) Сканер лазерный MS9520-47 Ларь морозильный 606r-A/S Ларь морозильный 506r-A/S Ларь морозильный Caravel-A/S Весы тензометрические настольные торговые ВТНт-15 Весы тензометрические настольные торговые ВТНт-15 Весы настольные электронные ВН-15	шт.	1	167503000	8375150
	Стоимость 1 лота			167503000	8375150

Аукцион состоится **30 сентября 2013 года в 10.00** по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей выданных представителю (для юридических лиц и ИП) или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет ОДО «КонсалтЛизинг», принимаются по **27 сентября 2013 года** до 17 ч. 00 мин. по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Начальная цена установлена без НДС. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 7 (семи) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10 % от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет ОДО «КонсалтЛизинг» №3011356050012 в Региональной дирекции №500 ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь), г. Брест, МФО 153001108, УНП 290307191 в срок до **27 сентября 2013 года** до 17 ч. 00 мин.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: Частное унитарное предприятие по оказанию услуг «Центр правовых услуг», юридический адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, контактные телефоны: 80162 33 93 88, 8029 802 80 00.

Сведения о продавце: Общество с дополнительной ответственностью «КонсалтЛизинг», юридический адрес: г. Брест ул. Задворская, 4, контактные телефоны: 80162 33 93 88, 8029 802 80 00.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9 ч. 00 мин. до 17 ч. 00 мин. по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 80162 33 93 88.

Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ООО «Центр правовых услуг» ПОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже недвижимого имущества Общества с ограниченной ответственностью «Элиофеста»:

№ лота	Наименование имущества	Ед. изм.	Кол-во	Начальная цена предмета торгов	Сумма шага аукциона в размере 5%, руб.
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-73864 общей площадью 75,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Задворская, 4	шт.	1	144613600	**7230680**
	Стоимость 1 лота			144613600	**7230680**

Повторный аукцион состоится **12 августа 2013 года в 10.00** по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП) или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет ООО «Элиофеста», принимаются по **09 августа 2013 года** до 17 ч. 00 мин. по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Начальная цена установлена без НДС. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 7 (семи) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10% от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет ООО «Элиофеста» №3012151730011 в ОАО «Паритетбанк», г. Минск, МФО 153001782, УНП 290964168 в срок до **09 августа 2013 года** до 17 ч. 00 мин.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: Общество с ограниченной ответственностью «Центр правовых услуг», юридический адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, контактные телефоны: 80162 33 93 88, 8029 802 80 00.

Сведения о продавце: Общество с ограниченной ответственностью «Элиофеста», юридический адрес: г. Брест, ул. Задворская, 4, контактные телефоны: 80162 33 93 88, 8029 802 80 00.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9 ч.00 мин. до 17 ч.00 мин. по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 80162 33 93 88.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

МАНЕТА «ІКОНА ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ «ІВЕРСКАЯ» Ў ЗОЛАЦЕ І СЕРАБРЫ

Нацыянальны банк Беларусі ўвёў у абарачэнне залатыя і сярэбраныя памятныя манеты серыі «Праваслаўныя цудатворныя іконы», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.

Залатая манета гэтай серыі пробай сплаву 999 мае два наміналы — 1000 і 50 рублёў. Манета ў 1000 рублёў мае масу 100 г і тыраж да 250 штук, а залатая манета ў 50 рублёў важыць 5 г, тыраж да 500 штук. Сярэбраная манета «Ікона Прасвятой Багародзіцы «Іверская» — наміналам 500 рублёў, пробай сплаву 925, масай 500 г (тыраж да 600 штук).

Манеты адчаканены на манетным двары ў Германіі, якасцю «пруф».

Сяргей КУРКАЧ.

КІРАЎНІК ВЫМАНЬВАЎ КРЭДЫТЫ

У Віцебскай вобласці па выяўленых Камітэтам дзяржкантролю фактах выманьвання крэдытаў пракурорам Мёрскага раёна заведзены аж 5 крымінальных спраў у дачыненні да былога дырэктара камбікормавага завода.

— У 2010—2011 гадах адным з банкаў былі выдадзены Мёрскаму камбікормаваму заводу крэдытныя рэсурсы ў суме 32,3 мільярда рублёў. Гэтым суб'ектам гаспадарання прадстаўляліся ў банк загадзя лжывыя дакументы аб колькасці закладной маёмасці — таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў. Апошніх не было зусім, альбо меліся ў значна меншых аб'ёмах, чым прадстаўляліся ў заклад банку, — паведамілі ў Камітэце дзяржкантролю Віцебскай вобласці.

Акрамя таго, як устанавілі рэвізоры, прадпрыемства не выканала сваіх абавязацельстваў па крэдытных дагаворах у частцы вяртання крэдытных сродкаў ва ўстаноўлены графікам тэрмін.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАДКІНУЎ УГОРУ І НЕ ЎТРЫМАЎ...

Маленькі жыхар Яраслаўля, які разам з маці прыехаў ў госці да беларускіх сваякоў, з сур'ёзнымі траўмамі трапіў у бальніцу. Пра гэта паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама.

Няшчасце здарылася ў Крупскім раёне. 22-гадовы мінчанін, які, як высветлілася, знаходзіўся нападпітку, бавіў час на вуліцы разам з пляменнікам, якому няма яшчэ і годзіка. Падчас гульні вырашыў падкінуць дзіця ўгору і... не ўтрымаў. Як вынік — хлопчык з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і пераломам патылічнай косці шпіталізаваны ў нейрахірургічнае аддзяленне.

Надзея ДРЫЛА.

СТОМЛЕНЫЯ ЗА РУЛЁМ

20 ліпеня ўдзень у Быхаўскім раёне вадзіцель заснуў за рулём і страціў кантроль над кіраваннем аўтамабіля. «ВАЗ» з'ехаў у кювет і перакуліўся. У выніку пацярпелі тры чалавекі: у бальніцу з рознымі траўмамі дастаўлены сам кіроўца, 27-гадовы жыхар Магілёва, і яго 11-гадовая пасажырка. Яшчэ адна 47-гадовая жанчына, якая ехала ў аўтамабілі, знаходзіцца ў рэанімацыі. Прычынай здарэння называюць стомленасць вадзіцеля.

— Трэба адпачыць, а не выпрабоўваць лёс, — настойліва раіць інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Вольга Вяршубская. — Цяпер у перыяд водпускаў многія адпраўляюцца на аўтамабілях да мора, пераадольваючы вялізныя адлегласці. У гэтым выпадку ні ў якім разе не трэба эканоміць час на сне і адпачынку.

Ілона ІВАНОВА.

ІНСПЕКТАРЫ ПА СІГНАЛЕ СПРАЦАВАЛІ ХУТКА

Жыхар Мінска адпачываў з сябрамі на Бярэзіне. Праплываючы на лодцы побач з вёскай Красны Бераг, ён заўважыў у вадзе паплаўкі ад выстаўленай сеткі. Пра гэта мужчына паведаміў па нумары тэлефона даверу Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

«На месца выехала група на чале з намеснікам начальніка Бярэзінскай міжраённай інспекцыі. Каб затрымаць парушальніка, які хаваўся ў кустах, з доказамі віны, было вырашана, што адзін з супрацоўнікаў пад выглядам рыбака-аматара «выпадкова» зачэпіць сетку вудай. І гэты план спрацаваў: браканьер выйшаў на пытанне «рыбака» і падчас размовы прызнаўся, што менавіта ён паставіў сетку, — расказала журналісту «Звязды» прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга Грамовіч. — Малады чалавек аказаўся прыезджым з Гомельскай вобласці. І хоць рыбы ён налавіць не паспеў, яго дзеянні былі кваліфікаваны як парушэнне Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства. Яму пагражае штраф да 50 базавых велічынь».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗА «ЛІПАЙ» НЕ СХАВАЎСЯ

Шчучынскі раённы аддзел Следчага камітэта завяршыў расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да вытворцы работ мясцовай МПМК-166, які з-за асабістай зацікаўленасці падрабляў афіцыйныя дакументы.

На працягу двух гадоў гэты спецыяліст, выкарыстоўваючы свае службовыя паўнамоцтвы, перыядычна накіроўваў пяцёра падпарадкаваных яму работнікаў выконваць будаўніча-мантажныя работы ў дачным доме сваёй знаёмай. Пры гэтым для налічэння ім зарплаты і іншых выплат уносіліся фіктыўныя звесткі ў афіцыйныя дакументы, што прадастаўляліся ў аддзел кадраў і бухгалтэрыю прадпрыемства, — табелі па ўліку рабочага часу і на выплату надбаўкі за раз'язны характар работ. У выніку рабочым было неабгрунтавана налічана больш за 12 мільёнаў рублёў.

Вытворцу работ прад'яўлена абвінавачванне ў здзяйсненні злачынства. Матэрыяльныя страты ён кампенсаваў у поўным аб'ёме. Крымінальная справа перададзена пракурору для вырашэння пытання аб накіраванні ў суд, паведамляе прэс-служба ўпраўлення Следчага камітэта Беларусі па Гродзенскай вобласці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КРАН НА ЛОМ

Месяц таму ў райаддзел міліцыі Акцябрскага раёна паступіла заява ад намесніка Акцябрскага райвыканкама пра знікненне непрацуючага вежавага крана «КБ-100», які знаходзіўся на тэрыторыі ліквідаванага малога прадпрыемства «Залессе», размешчанага ў аднайменнай вёсцы.

Аператыўнікі Акцябрскага РАУС высветлілі, што вежавы кран быў дэмантаваны яшчэ ў сакавіку 2013 года. Яго здаў на металалом былы супрацоўнік ліквідаванага прадпрыемства, а цяпер дырэктар адной з прыватных фірмаў. Грамадзянін папярэдне распілаваў вялізную металічную канструкцыю, а потым здаў лом на Светлагорскае прадпрыемства другаснай сыравіны праз раз'язнога нарыхтоўшчыка Акцябрскага райпа. Нарыхтоўшчык, дарэчы, не знайшоў часу праверыць дакументы і паверыў выкрадальніку, што кран належыць яму. Больш за тое, па просьбе злодзея ён у закупную ведамасць унёс несапраўдныя звесткі: здадзены металалом распісаў на восем грамадзян, якія металалом яму не здавалі і нават не ведалі, што ён упісаў іх прозвішчы ў ведамасць і замест іх распісаўся. Па факце крадзяжу ў дачыненні грамадзяніна заведзена крымінальная справа, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога УУС. Між іншым, матэрыяльная шкода, прычыненая Акцябрскаму райвыканкаму, складае больш за Br22,5 млн.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Лёсы людскія

КАРАНІ Ў ДАБРАГОШЧЫ,

або Яшчэ на аднаго зніклага без вестак стала менш

У «Звяздзе» за 28 мая я распавяла пра Алену Турлай з Новасібірска, якая праз доўгія гады пошукаў знайшла магілу свайго дзеда ў Паставах. Не паспела расчуленая ўнучка вярнуцца на радзіму, як вахту памяці ў яе пераняла зямлячка. Неўзабаве пасля дня Незалежнасці Галіна Кісялёва таксама прыляцела ў Беларусь, каб сустрэцца з дзедам, які 70 гадоў таму загінуў на Жлобіншчыне...

Вёска Дабрагошча сустрэла загадкавай цішынёй. І гэтая цішыня ў чарговы раз навеяла думкі пра хуткацечнасць часу. Ідзеш па мірнай зямлі, і цяжка паверыць, што тут калісьці людзі стралялі адзін у аднаго... Паводле слоў мясцовых, у чэрвені 1943 года вёска была спалена немцамі. А праз год у баях за Дабрагошчу і яе ваколіцы загінула больш як тысяча савецкіх воінаў. Сярод іх і дзед Галіны Кісялёвай...

— Майго дзядулю Давыдзенку Івана Рыгоравіча прызвалі на фронт у жніўні 1941 года, — распавядае Галіна Васільеўна. — Бабуля засталася адна з 6 дзецьмі на руках. 70 гадоў таму пашальён прынёс дадому сумную навіну: «Прапаў без вестак». Тым не менш бабуля працягвала чакаць мужа з вайны. Але так і не дачакалася... Ведаеце, я ніколі не бачыла свайго дзеда, у нас нават няма яго фотаздымка. Але мама і цётка з такой цеплынёй гаварылі пра свайго тату, што я, колькі сябе памятаю, лічыла сваім святым абавязкам знайсці яго магілу.

Пошукі пачаліся з наведвання Цэнтральнага музея Вялікай Айчыннай вайны на Паклоннай гары ў Маскве, куды Галіна разам з сынам прыехала ў 2004 годзе.

— У музеі захоўваецца 385 тамоў кнігі Памяці, — кажа Галіна Васільеўна. — У іх пералічаны ўсе загінулыя ў баях за Радзіму і зніклыя без вестак. Інфармацыю пра кожнага з іх можна атрымаць таксама з дапамогай электроннай кнігі Памяці. Але ні ў папяровых, ні ў электронных спісах дзеда не было. Работнікі музея параілі звярнуцца з запытам у Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расіі ў Падольск.

Жанчына так і зрабіла. І праз паўгода атрымала архіўную даведку. Там значылася, што стралок 409 стралковага палка 137 стралковай дывізіі радавы Давыдзенка Іван Рыгоравіч, 1898 года нараджэння, ураджэнец Алтайскага краю, загінуў 8 снежня 1943 года ў вёсцы Бор Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці...

«Я ніколі не бачыла свайго дзеда, у нас нават няма яго фотаздымка. Але мама і цёця з такой цеплынёй гаварылі пра свайго тату, што я лічыла сваім святым абавязкам знайсці яго магілу».

Аб вёсцы Бор, дзе загінуў дзед Галіны, нагадвае толькі яблыневы сад.

У памяць пра воінаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны пад Дабрагошчай, установлена стэла.

— З таго моманту ўсё закруцілася само сабой, — кажа спадарыня Кісялёва. — Я напісала Леаніду Апанасюку (былы мэр Жлобіна), начальніку ўпраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны Міністэрства абароны Беларусі палкоўніку Віктару Шумскаму, у Жлобінскі ваенкамат... Гэтыя добрыя людзі параілі мне звязацца са старшынёй Дабрагошчынскага сельсавета. Па тэлефоне мне сказалі, што дзед сапраўды загінуў у вёсцы Бор і пахаваны ў брацкай магіле ў Дабрагошчы. Што памяць пра майго дзеда жыве, яго імя занесена ў спісы загінулых у Беларусі расіян і ў кнігу «Памяць» Жлобінскага раёна. Я ўдзячна новасібірскаму Беларускаму культурна-асветніцкаму цэнтру імя Еўфрасінні Полацкай і ўсім жыхарам Беларусі, якія адгукнуліся і дапамаглі мне знайсці магілу дзеда. А таксама старшыні Дабрагошчанскага сельскага Савета Сяргею Філіпчанку і яго жонцы, якія прытулілі мяне на тыдзень... Удзячна тым людзям, якія даглядаюць брацкую магілу.

Радавы Давыдзенка разам з іншымі салдатамі пахаваны ў брацкай магіле ў Дабрагошчы.

«З шасці дзяцей дзеда ў жывых засталася толькі адна дачка. Цётка Каця папрасіла, каб я ад яе імя пакланілася да зямлі тату за той вялікі бой. Лепшага падарунка ў дзень народзінаў ёй не трэба...»

Пасля таго як я зрабіла некалькі фотаздымкаў Галіны Кісялёвай каля брацкай магілы, жанчына прапанавала разам наведаць месца, дзе загінуў яе дзядуля.

Вёска Бор, а дакладней тое, што ад яе засталося, знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад Дабрагошчы. Дабіраліся туды спачатку па вясковай гравійцы, затым па лясной вузкай сцежцы. Аб тым, што там некалі жылі людзі, сведчыць толькі запушчаны яблыневы сад. Аб вайне ж нагадваюць ямы, якія пакінулі пасля сябе «чорныя капальнікі». ...Галіна нейкі час стаіць у разгубленасці. Затым падыходзіць да яблынькі, сярод лістоў якой прасвечваюцца дробныя зялёныя яблыкі, прыхінаецца да ствала і... не стрымлівае слёз...

— Вось ужо 10 гадоў як няма мамы... — кажа Галіна Васільеўна. — Шкада, яна ўжо ніколі не даведаецца, што я ўсё ж такі выканала яе жаданне — знайшла магілу яе бацькі. З шасці дзяцей дзеда ў жывых засталася толькі адна дачка. Калі я сюды ляцела, ёй споўнілася 85. Цётка Каця папрасіла, каб я ад яе імя пакланілася да зямлі тату і яго аднапалчанам за той вялікі бой. Лепшага падарунка ў дзень народзінаў ёй не трэба...

На развітанне сібірачка папрасіла перадаць усім сем'ям, якія атрымалі пасля вайны пахаванкі з тэкстам «Прапаў без вестак», не губляць надзеі і працягваць шукаць. Бо чалавек жывы, пакуль пра яго памятаюць!

❐ ❐ ❐

На ўскрайку Дабрагошчы расце векавы дуб. Дзіва дзіўнае. Вёска гарэла, гінулі людзі, а ён выстаяў. Выстаяў, пэўна, дзякуючы сваім моцным каранням. Бо не сакрэт, чым мацнейшыя карані, тым мацнейшае дрэва. Таксама і чалавек. Чым больш яму вядома пра продкаў, тым больш трывала ён стаіць на зямлі...

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.
Жлобінскі раён

■



ТЫ Ж ТОЛЬКІ ГЛЯДЗІ...

Гэтую гісторыю майму бацьку расказала яго цётка, а ён — мне. Адбылося ўсё на Барысаўшчыне, і вельмі даўно, недзе ў 20-я гады мінулага стагоддзя, а помніцца і зараз...

У адной досыць вялікай (нават цяпер) вёсцы Аздзяцічы, што стаіць непадалёк ад Бярэзіны, жыла сям'я, і была ў ёй дзеўка, якую ніхто не хацеў браць замуж. Прычыны звычайныя: ні асаблівай прыгажосцю, ні весялосцю, ні розумам яна, скажам так, не вылучалася. Да таго ж пасля вайны і рэвалюцыі хлопцаў-жаніхоў у вёсцы засталося няшмат... Яны самых лепшых у жонкі бралі. Так што ў гэтай шанцаў на добрага мужа амаль не было.

А непадалёк ад гэтай вёскі яшчэ адна. І ў ёй сям'я — з такой самай бядой, бо сына ж ажаніць таксама праблема, асабліва, калі ён, не сказаць, каб дурны, але ж прыдуркаваты — дакладна. А што непрадказальны...

Дык вось яго бацькі і падумалі: два боты — чым не пара? Тым больш што іншай нявесты можа і не быць. Таму хуценька («раптам хто апярэдзіць?») заслалі сватоў.

Іх вучыць не трэба было — яны сваю справу ведалі.

Але ж ведалі і хібы жаніха... Таму хлопцу строга наказалі: «Ты ж глядзі: як толькі прыедзем, рот не адкрывай, барані Божа! Сядзі ды й маўчы. Мы самі за цябе ўсё скажам... Глядзіш, неяк усватаем. Ты ж ажаніцца хочаш?»

Хлопец хацеў. І абяцаў маўчаць.

Тым часам прыехалі яны, зайшлі ў хату да дзеўкі. Ну і пачалі там: «Мы, маўляў, купцы. Ці няма ў вас тавару?»

«Прадаўцы» з той вялікай радасці не ведаюць, як іх прымаць! Але ж павіталі, за стол пасадзілі — сядзяць, пакрысе выпіваюць ды «гандаль» вядуць.

Жаніх маўчыць... «Значыць, сціплы, — цешацца гаспадары. — І не брыдкі, бач. І вясёлы — увесь час усміхаецца...».

Карацей, спадабаўся ён бацькам нявесты! І яна сама ўжо прамовіла: «Як татка з мамкай аддадуць, дык я і пайду». Справа, значыць, да запоінаў?! Дык чаму ж тады не весяліцца, «чаму ж ім не пець»?.. Абодвум бакам падалося, што ўсё — збываюць бяду!

А жаніх тым часам... засумаваў. Ну як жа: усе святкуюць, а яму — дык «рот не адкрывай»? Маўчы... Усімі забыты...

Ад крыўды ён нагамі пад сталом пабоўтаў — не зважае ніхто. Тады цяжанька паўздыхаў — таксама ніякай рэакцыі. А побач з ім — талерка з блінамі. Гаспадыня на сыраквашы напякла — вялікіх, тоўстых...

Неўпрыкмет сцягнуў адзін, паклаў перад сабой, скруціў у дудку ды як затрубіць...

Пад гэту «музыку» аніхто ў скокі не кінуўся — хутчэй, наадварот. Сарвалася жаніцьба.

...Невядома, на жаль, як склалася жыццё той нявесты, таго жаніха. Але ж кажуць, што ў тых мясцінах, адпраўляючы хлопца ў сваты, дагэтуль наказваюць: «Ты ж толькі глядзі там — у блін не затрубі!»

Што цікава: не было б сватаўства — не было б і гэтага вядомага выразу. А калі б не выраз, то, хутчэй за ўсё, даўно забылася б тое сватаўство.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
г. Мінск

НА СВАЮ ГАЛАВУ

...Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі распачалася пазней і праходзіла, мякка кажучы, са скрыпам. Ну не хацелі сяляне запісвацца ў калгасы! Раз за разам у вёсках праводзіліся сходы. Людзей агітавалі, ім тлумачылі. Не сядзеў склаўшы рукі і сельскі актыў... А поспехаў — як кот наплакаў.

Але ж «працэс» ішоў. Кіравала ім раённае начальства. Яно ж прызначала сходы.

У нашай вёсцы ніякага клуба тады не было — людзей сабралі ў звычайнай хаце. Каб стварыць належную атмасферу, бліжэй да покуці паставілі стол для прэзідыума, запрасілі туды прадстаўніка з раёна, старшыню сельсавета, двух самых аўтарытэтных сялян. А каб іх прысутныя бачылі, да столі перад тварамі падвесілі лямпу. І пачалося...

Спачатку, як водзіцца, слова далі прыезджаму начальніку, потым свайму — старшыні сельскага савета. І раптам... Дзынкнула разбітая аконная шыба: камень уляцеў у хату, у прэзідыум...

Міліцыянер, што быў на сходзе, куляй выскачыў у двор. Адтуль данёсся стрэл. Люд у хаце паўскакваў з месцаў, яшчэ больш зашумеў. Многія кінуліся да выхаду, а той «прэзідыум» — вядома ж, да пацярпелага актывіста. У некага немаведама адкуль з'явілася лата з чыстага кужалю, чалавеку перавязалі галаву...

Сполах тым часам стаў праходзіць. Адпаведна паўстала пытанне: а што ж далей — сход будзе ці не? Заставацца ў гэтай хаце? Ці ісці па сваіх, дадому?

Вырашыла ўсё кароткая фраза: пацярпелы актывіст, пачухаўшы патыліцу, устаў і досыць гучна заявіў:

— Людзі, а гэта ж добра, што камень трапіў у маю галаву, бо калі б у лямпу... Далібог, сарваўся б сход: другое шкло мы наўрад ці знайшлі!?

Словы гэтыя патанулі ў дружным рогаце. Людзі паволі паселі на месцы. Сход прадоўжыў сваю работу.

Мікола Г., *Слонімскі раён*

БАБУЛІНА СПАДЧЫНА

Пра гэтую сустрэчу я чула ад розных людзей і ў розных варыянтах. Раскажу, як запомніла. Значыць, у адным з нашых гарадоў працаваў не доктар, а проста чараўнік: каму зуб вырваць, каму ўставіць — усё рабіў адмыслова!

Пагалоска пра гэта паляцела далёка, да доктара цугам пайшлі кліенты. Ён усіх прымаў. А што за працу?.. Нехта, не без таго, казаў яму «шчыры дзякуй» і сыходзіў, але ж большасць пацыентаў ведала, што зуб у іх не адзін, так што да доктара прыйдзецца звяртацца яшчэ і яшчэ. Дык чаму б яго не задобрыць?

Такім чынам у кабінеце зубнога ўсё часцей пацыенты сталі «забываць» розныя пакеты — як правіла з бутэлькай канькяку, каробкай цукерак, кавалкам паляндвіцы... Было ў чалавека выпіць, было чым закусіць! Але доктар, як кажуць, не злоўжываў, трымаўся. Праўда, спачатку, а вось з гадамі стала здарацца рознае...

Дык вось неяк на прыём да яго прыходзіць бабуля, з парога вітаецца. Доктар адразу ж, яшчэ па голасе чуе, што верхніх зубоў у яе няма. І адразу ж бачыць, што іх, тыя зубы, у выглядзе пратэзу, жанчына... прынесла ў хустачцы:

— Во доктар, — паказвае яму, — якія харошыя: хоць ты косці грызі. Ты дужа добра зрабіў! Але ж не трымаюцца, ліха на іх...

— Ну гэта бывае, — адказвае той, — зараз паглядзім, можа, паправім...

Пасадзіў ён бабулю ў крэсла, паглядзеў у рот. А паспрабаваў тую каронку ўздзець, — спіна ўзмакрэла: не падыходзіць... Ну не тое, каб зусім, але...

— Даўно, — пытае, — рабілі?

— Зімой...

— А чаму адразу не прыехалі?

— Дык вясна ж пачалася. Пакуль бульбачку пасадзіла, пакуль грады... І свіначкі ў мяне, і гусі, і куры. Без дагляду ўсё прападзе. Вось я і тапчуся... Нават есці часу няма. У рот нешта ўкіну...

Бабуля расказвае пра гэта, а доктар амаль не чуе, круціць той пратэз у руках і думае: трэба завязваць з выпіўкай, бо на цвярозую галаву аніколі б так не зрабіў... І галоўнае, нічога не паправіш. Трэба ўсё па новай... Бабулі зноў паездзіць прыйдзецца. І як пра гэта сказаць?

Калі б старая памаўчала, доктар, можа, хутчэй патрэбныя словы знайшоў, а то ж не змаўкае, гаворыць і гаворыць. Ён, перажываючы сваё, як праз сон чуе:

— Адна я, сыночак, адна цяпер. Ні параіцца з кім, ні дапамагчы... Уперад сястра жывая была, дык мы з ёй удзвюх. А вясной як памерла... Усё сваё мне пакінула: і адзежу, і абутак, і зубкі во гэтыя...

— Дык гэта што — не вашы?! — у доктара аж вочы на лоб.

— І так, і не. Рабіў ты іх праўда для сястрыцы... Але ж яна мне ўсё адпісала. Дык, можа, і зубкі яшчэ паслужаць? Ты толькі падгані іх. Добра?..

У доктара камень з душы.

Праўда, з выпіўкай завязаць так і не ўдалося. Хоць шанц быў.

М. Санько, *г. Брэст*

САМЫ ДОЎГІ ПЛОТ?

Аграгарадок Палачаны, што ў Маладзечанскім раёне, знаходзіцца ў гістарычных мясцінах: па гэтых абшарах некалі праходзіла мяжа Полацкага княства. Населены пункт сфарміраваўся ўсцяж гасцінца (зараз гэта шырокая, асфальтаваная дарога). З уласнага досведу скажу: такую доўгую вясковую вуліцу у Беларусі трэба яшчэ пашукаць! На два з паловай кіламетры пралягла яна паміж зялёнымі сядзібамі палачанцаў. Звяртае на сябе ўвагу аднолькавы, прыгожа пафарбаваны плот на два бакі вуліцы.

— На нашай зямлі шмат гістарычных і геаграфічных славутасцяў, — кажа старшыня мясцовага сельсавета Уладзімір Станкевіч (на здымку). Пяцікіламетровы плот таксама з'яўляецца своеасаблівай цікавінкай. Вяскоўцы ніколі не забываюць своечасова пафарбаваць яго, падрамантаваць.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

КАБ НЕ ЗЛОДЗЕЙ...

Здарылася гэта досыць даўно, такой самай гарачай парой, як зараз. Шчыравалі вяскоўцы ад малога да старога: хто сена касіў ды сушыў, хто пустазелле выполваў, хто грыбы ды ягады збіраў...

Але ж тое днём, а вечарам тады завядзёнка была ўсё парабіць і выйсці на вуліцу — на лаўках пасядзець, пагаманіць, на іншых паглядзець, сябе паказаць...

Зрэшты, што там было і паказваць? Вёска жыла, мякка кажучы, бедна: датрымаў хто кавалачак сала да касавіцы, значыць, багацей.

Не ўсе, вядома ж, імі былі, але многім дужа хацелася: ну хоць бы выгляд зрабіць. А як?

Адзін дзядуля прыдумаў. Ідзе вечарам на лаўку, і здалёку відаць: барада ў яго, як люстэрка, блішчыць! Людзі пытаюцца: ад чаго, маўляў, што ён такое еў? Той жывот свой упалы гладзіць ды з форсам адказвае: «Жонка, бач, блінцоў напякла... З салам... От наеўся дык наеўся...».

Нехта з вяскоўцаў у гэта верыў, нехта не, але ж праўды не шукалі. Ну хоча стары, як зараз кажуць, «свой рэйтынг узняць», дык хай уздымае.

Але ж да пары вяровачка віецца, да пары збан вадзіцу носіць і няма нічога таемнага, што не стала б яўным. Аднойчы ўвечары сядзіць той дзядуля на лаўцы (барада блішчыць, як ёй і належыць), няспешную гамонку з людам вядзе... Бачыць — унучак да іх што сілы бяжыць. І такі ж спужаны.

— Дзеда, дзед, — крычыць ледзь не плача, — кот тваю мазку ўкраў!

Дзед спярша падхапіўся: хацеў, відаць, бегчы — лавіць таго злодзея, але ж скеміў, што ў ката ўжо нічога не адбярэш, нават калі і зловіш...

А таму дахаты пайшоў паволі. І ўнука павёў.

Вось так адкрылася праўда, вось так вяскоўцы зразумелі, што ніякіх блінцоў (ды з салам яшчэ) той дзядуля не еў, што ў хаце ў яго (пакуль кот не ўкраў) быў хіба скрылік здору, якім стары «змазваў» сабе бараду...

Сяргей Ярмольчык,
в. Багданаўка,
Лунінецкі раён

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

РУЖОВЫЯ ДНІ

— Хадзем шукаць крэветку. Чорт яе ведае, куды яна зноў схавалася. І калі толькі паспела?..

— Чаму б не паспець: у цябе толькі дзве нагі, а ў яе ажно дзесяць. Нічога не скажаш — крэветка.

Падхопліваюся з канапы, кідаю ў ракавіну кубак з недапітай кавай, чапляюся нагамі за тапкі — хто іх тут скінуў?.. Ледзь не падаю — на злом галавы лячу на Яго голас.

Ужо некалькі тыдняў запар штодня пасля вячэры мы сядаем насупраць акварыума і, назіраючы за гойданнем водарасцяў у хвалях, што ідуць ад сістэмы фільтрацыі, шукаем гэтую ружовую паўпразрыстую істоту. І так апантана, быццам яна зусім не крэветка, а якая-небудзь загадкавая рэліктавая мізіда. Гарэза, бывае, знаходзіцца. І зноў губляецца. Быццам дражніцца. Тады Ён, мой муж, галоўны здабытчык і захавальнік цікавостак у нашай сям'і і галоўны аквадызайнер па сумяшчальніцтве, пагрозліва абяцае выкарыстаць яе якім-небудзь «не вельмі прыстойным чынам». У якасці інгрэдыенту для салаты, напрыклад. Жартачкі на кулінарныя тэмы — амаль заўсёдныя нашы стасункі з хатнімі жывёлкамі.

Раней адзінай насельніцай вялікай шкляной скрыні была рыбіна, родавае імя якой гучыць, быццам зоркі па небе сцелюцца, — астранотус. Адзінай, калі, вядома, не лічыць бязлічы слімакоў-«шпулек» (чытай — семак для астранотуса) і парачкі карасікаў, якія апынуліся ў гэтай кампаніі толькі таму, што не паспелі некалі, яшчэ ў стане малькоў, трапіць на кручок у якасці насадкі. Карасікі тыя не ў залік, бо планаваліся, зразумела, як ежа.

…Чорная, нібы ноч, з жаўтлявым млечным шляхам на баках, пры хваставым плаўніку яна мела жаўтлявае ж «вочка», якое ў спалучэнні з сапраўдным вокам стварала нейкую звышарыгінальную сіметрыю. Што да асноўнага колеру, то, напэўна, дзякуючы менавіта яму на растыражаванае пытанне суседзяў і знаёмых: «Калі смажыць будзеце?» — адказ заўсёды трымаўся напагатове: гэта, маўляў, чорная рыбіна — значыць, пойдзе на чорны дзень, а ён, дзякуй Богу, пакуль не настаў.

Аксамітная. Пагладзіць хацелася — такая аксамітная. На пукатым ілбе рыбіны прачытваўся няслабы інтэлект. Часам нават здавалася, што яна разумее, пра што маўчаць сцены пакоя, калі гаспадароў няма дома. Да карасікаў, якіх некалі, пашкадаваўшы, не з'ела, ставілася, як шляхцянка да чэлядзі. Людзей, асабліва дзяцей, пяшчотна любіла, забаўляючы жартоўнымі нападамі. Калі і хапала за руку, што давала ёй корм, то не кусаючы, а толькі мякенька шчыпаючы за палец…

Любіла макароны з маслам…

Апошнім часам яна хварэла, наша рыбіна астранотус. Мы яе лячылі, яна ачуньвала, але ненадоўга. Старэнькая ўжо і бачыла дрэнна. Не так, як у мінулыя гады, свавольнічала, не такі жыццесцвярджальны мела настрой. А нядаўна нашай чорнай рыбіны не стала. Калі ўлічыць, што адбылося гэта ў складаны для нашай сям'і час, то можна сказаць, што вось так — ёй дзякуючы — не настаў наш чорны дзень. Бо следам надышлі ружовыя. І зусім выпадкова — заблытаная ў водарасцях (якія Ён, мой муж, галоўны здабытчык і захавальнік цікавостак у нашай сям'і і галоўны аквадызайнер па сумяшчальніцтве, прынёс аднойчы аднекуль, каб цалкам аднавіць ландшафт шкляной скрыні), з'явілася гэта свавольная «рэліктавая мізіда» — ружовая крэветка, якая больш за што іншае любіць гуляць з намі ў хованкі.

— Знайшлася! Тут ёй, дарэчы, добра: як у пячорцы сядзіць.

Знайшлася. Там, дзе паміж шклом і кампрэсарам утварыўся даволі ўтульны гроцік.

— Мне тут таксама добра, — прамаўляю я, тулячыся да Яго. І таксама трапляю ва ўтульненькі гроцік, што ствараецца неўзабаве спецыяльна для мяне — яго моцным і мужным плячом…

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

ВЯСЕЛЛЕ НА ЛЮБУЮ КІШЭНЮ

Лета — традыцыйны час для вяселля. Але калі для жаніха і нявесты гэта вялікае свята, то для іх бацькоў — вялізныя турботы, у першую чаргу — матэрыяльныя. І калі ў вас гэтыя клопаты яшчэ наперадзе, то вам дапамогуць нашы парады. Мы паспрабавалі адказаць на тыповыя для большасці бацькоў пытанні: колькі спатрэбіцца грошай на вяселле, як і на чым падчас яго можна сэканоміць і пры гэтым не сапсаваць настрой ні сабе, ні маладажонам?

Падрыхтоўку да вяселля неабходна пачынаць са сцэнарыя. Прааналізаваўшы вялікую колькасць прапаноў, мы выносім на ваш разгляд шэсць варыянтаў.

ВЯСЕЛЛЕ З РАСКОШАЙ

Гэта класічнае вяселле, дарэчы, вельмі моднае зараз. Акрамя традыцыйных беларускіх заручын, сватоў, сведкаў з боку жаніха і нявесты, выкрадання і выкупу маладой, яно яшчэ прадугледжвае такія знаёмыя па замежных стужках дзявочнік і хлапечнік.

Калі вы жывяце ў сельскай мясцовасці, то дзявочнік ці хлапечнік можна арганізаваць на прысядзібным участку (у гэтым выпадку не абысціся без абавязковых шашлыкоў) альбо ў рэстаране паблізу.

Калі вы жывеце ў горадзе, то хлапечнік ці дзявочнік можна правесці ў начным клубе (альбо кавярні) ці арэндаваць лімузін. А можна сумясціць першае і другое: спачатку некалькі гадзін пакатацца на лімузіне, а потым накіравацца ў кавярню (альбо загадзя арэндаваную кватэру, што дазволіць вам сэканоміць грошы).

Лімузін Кадзілак Эскалэйд на 20 месцаў абыдзецца ў суму ад 90 да 110 у. а. у гадзіну. Можна знайсці лімузін і па больш прывабным кошце. Напрыклад, лімузін-крайслер — ад 80 да 100 долараў у гадзіну. Калі ў вас ёсць выбар, то кавярню для дзявочніка лепш абраць з асобнымі кабінетамі. У гэтым выпадку вы заплаціце за папярэдні заказ кабінета і за меню. Што датычыцца ежы, то неабходна зыходзіць з сумы, не меншай за 20-30 у. а. на чалавека.

Дарэчы, атрыбутам сучаснага еўрапейскага дзявочніка ці хлапечніка з'яўляецца заказ стрыптыз-шоу. Такое задавальненне можна замовіць і ў нас — яно будзе каштаваць ад 100 у. а. у залежнасці ад сцэнарыя. Заказаць стрыптыз можна і ў сельскую мясцовасць: амаль усе артысты, якія спецыялізуюцца на стрыптыз-танцах, гатовы выехаць у любы рэгіён рэспублікі.

Падрыхтоўку непасрэдна да вяселля па-еўрапейску неабходна пачынаць з выбару рэстарана і месца для начлегу гасцей. Тут ёсць некалькі варыянтаў. Калі бацькі не абмежаваны ў сродках, то можна арандаваць загарадны гасцінічны комплекс з рэстаранам. Але майце на ўвазе, што чарга на арэнду можа быць вялікай, і летам вы здолееце заказаць такі комплекс толькі на верасень ці кастрычнік.

Можна арандаваць у горадзе асобна кавярню і асобна нумары ў гасцініцы. Калі гасцей чакаецца адносна няшмат, то можна сэканоміць і замест гасцініцы арандаваць кватэру (альбо некалькі).

Асобнай увагі будзе патрабаваць зала рэстарана. Аздабленне месца для жаніха і нявесты, а таксама для іх сведкаў, уваходных дзвярэй у еўрапескім стылі, калон, поручняў, ніш, маскіроўка тых дэталяў інтэр'еру, якія вы не хацелі б бачыць. Вам таксама могуць зрабіць схему размяшчэння гасцей за сталом і адпаведныя шыльдачкі. Уся гэта паслуга будзе каштаваць ад 50 у. а. і вышэй.

Загадзя ўпэўніцеся, што месца для маладых было аздоблена належным чынам, у тым ліку стол. Звярніце ўвагу на посуд, наяўнасць бакалаў (можна заказаць бакалы «Каханне» ад Swarovski: адна пара для маладых абыдзецца ў 100 у. а.), свечак і іншых рамантычных рэчаў. Напрыклад, у цэнтр стала можна паставіць кампазіцыю з кветак.

Выкраданне нявесты. Па вашым жаданні маладую могуць выкрасці... «гангстары» ці «спецназ». Першае будзе каштаваць вам ад 250 у. а., другое — ад 200 у. а. Дэталі выкрадання будуць адрознівацца, але агульны сцэнарый прыблізна аднолькавы: у зале нечакана (таму не забудзьце папярэдзіць пра гэта жаніха і нявесту!) з'яўляюцца гангстары альбо спецназ і «захопліваюць» маладую. Каб вярнуць сабе жонку, жаніху неабходна будзе прыкласці намаганні: прадэманстраваць сваю сілу і рашучасць. У ролі «захопнікаў» выступаюць, зразумела, артысты, якіх таксама можна запрасіць у любы рэгіён рэспублікі.

А каб вашы госці не засумавалі на вяселлі, ***раім прадугледзець забаўляльныя нумары.*** Лазернае шоу (абыдзецца ад 3 да 40 мільёнаў беларускіх рублёў) можа дапаўняцца вогненнымі, піратэхнічнымі ці неонавымі эфектамі, а таксама запускам канфеці і серпанціну. Выступленне артыстаў беларускай эстрады будзе каштаваць ад 50 да 500 у. а. Асобна можна запрасіць саксафаніста за 70 у. а.: жывая музыка ў самых разнастайных стылях, несумненна, створыць добры настрой вам і вашым гасцям.

ВЯСЕЛЛЕ НА ПРЫРОДЗЕ

Трэба выбраць месца правядзення такога вяселля, ацаніць тэрыторыю, на якой размесціцца ўсё неабходнае для свята.

Заказаць выязную рэгістрацыю шлюбу. Робіцца гэта загадзя, каштуе — 450 тысяч беларускіх рублёў.

Неабходна будзе падзяліць тэрыторыю на некалькі ўмоўных зон. На першай з іх размесціцца арка пад шатром ці навесам для рэгістрацыі шлюбу і месцы для гасцей, на другой — сталы для малыдых, сведкаў і гасцей — таксама пад навесам ці пад шатром. У Мінску для гэтай мэты цудоўна падыдзе востраў каханя, што на Камсамольскім возеры.

Для рэгістрацыі шлюбу неабходна будзе заказаць арку (каштуе каля 100 у. а.), столік для роспісу (каля 70 у. а.), шацер ці навес (ад 200 доларў за адзін) і лаўкі ці табурэты для гасцей. Не забудзьце ўсе гэта прыгожа аздобіць (гэта будзе каштаваць яшчэ 100 у. а.).

У вялікім шатры, дзе размесціцца сталы (альбо маленькія столікі на некалькі чалавек) для гасцей і маладых са сведкамі, таксама неабходна аздобіць уваходнае месца (для маладых і сведкаў).

Для выкрадання нявесты раім заказаць «шатландцаў» альбо «рыцараў». У першым выпадку вы і вашы госці не толькі ўбачыце сапраўднае шоу, але і пазнаёміцеся з нязвыклай для беларусаў шатландскай музыкай, гульнямі і традыцыямі. У другім — апынуцеся ў сярэднявеччы з яго рамантызмам, мужнасцю і культам «прыгожай дамы». Каму аддаць перавагу — вырашайце самі. І шатландцы, і рыцары вам прадэманструюць яркае тэатралізаванае шоу, а жаніху прыйдзецца вяселле каваля. Жаніху будзе цікава разам з ім выкаваць падкову на шчасце, а нявесце і гасцям — паназіраць за гэтым працэсам. І, безумоўна, што за вяселле на прыродзе без піратэхнічнага прадстаўлення з феерверкам і салютам?.. Яно будзе каштаваць 90 у. а. А вось артыстаў ці «жывую музыку» заказваць не раім: калі не пашанцуе з пагодай, то свята можа быць сапсавана. Можна абмежавацца тамадой (150-190 у. а.), але і ў гэтым выпадку неабходна прадугледзець, якім чынам і куды будзе падключана музычнае абсталяванне.

Незалежна ад таго, які від вяселля вы абераце, вам у абавязковым парадку спатрэбяцца: сукенка для нявесты і вэлюм (абыдзецца адпаведна ад 100 да 400 у. а. і ад 30 да 100 у. а.), туфлі (ад 35 у. а.), упрыгажэнні з біжутэрыі (камплект ад 30 да 60 у. а.), касцюм, гальштук і туфлі для жаніха (адпаведна ад 270 да 450 у. а., ад 20 да 50 у. а., ад 100 да 280 у. а.), фотаздымка і відэаздымка вяселля (ад 100 да 500 у. а.), аўтамабілі і мікрааўтобусы для ўдзельнікаў вяселля (ад 20-30 у. а. за машыну і ад 35-50 у. а. за мікрааўтобус у залежнасці ад колькасці месцаў), букет для нявесты (ад 30 да 150 у. а.), вясельныя замочкі для навешвання (па 10 у. а. за адну штуку), аздабленне машын (у сярэднім па 7 у. а. за штуку ў залежнасці ад матэрыялу для аздаблення: стужкі, паветраныя шары, кветкі, у тым ліку штучныя). Калі вяселле не таннае і з вялікай колькасцю гасцей, то можа спатрэбіцца арганізатар, які возьме на сябе ўсе турботы (абыдзецца ў 100 у. а.). Калі пажадаеце заказаць прафесійных музыкантаў і, адпаведна, жывы гук, то прыйдзецца выкласці ад 300 у. а. за гадзіну работы артыстаў.

Такім чынам, вяселле вам абыдзецца: больш сціплае — 1,5 — 2,5 тысячы у. а., астатнія віды — ад 5-7 тысяч у. а. і больш. Але добры настрой жаніха і нявесты гэтага заслугоўвае.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВЯСЕЛЛЕ Ў СТАРАБЕЛАРУСКІМ СТЫЛІ

Паслуга каштуе ад 200 у. а. У праграме — непаўторная атмасфера беларускага сярэднявечча. Вашым гасцям не дадуць засумаваць артысты ў сярэднявечных строях, рыцарскія баі, абрад старадаўняга вянчання. Абавязкова спадабаецца старабеларуская ежа, традыцыйныя застольныя беларускія тосты-віваты, абрад «Келіх-Кола», рыцарскія конкурсы і забавы: «Бой на мяккіх мячах», «Стральба з лука», «Аблачэнне ў рыцарскія даспехі», «Кіданне дзіды», «Кіданне сякер», «Сэрсо», «Цяжкі меч», «Сярэднявечныя лыжы». Добры настрой таксама створаць старадаўнія гульні і танцы пад дуду: «Маразуля», «Бранль Пралек», «Друмул Дракуле», «Тотэнтанц», «Ойра», «Удавец», «Явар», «Цяцерка», «Лявоніха», «Падэспань», «Анёл», «Верабей» і інш. У абавязковай праграме — выступ рыцараў на конях.

Для выкрадання нявесты таксама можна запрасіць рыцараў.

ВЯСЕЛЛЕ ЗА МЯЖОЙ

Паслуга каштуе ад 1000 да 4000 у. а. ў залежнасці ад дзяржавы, абранай для рэгістрацыі шлюбу. Гэтую паслугу лепш запытаць у турыстычных аператараў. Прычым не забудзьце ўдакладніць, што ўваходзіць у яе кошт. Напрыклад, хто будзе займацца афармленнем віз для жаніха і нявесты, для вас як бацькоў, для сведкаў маладых, а таксама для гасцей. Дзе і якім чынам будуць размешчаны ўсе ўдзельнікі вяселля. Пры гэтым звярніце ўвагу на апартаменты для маладых, у якіх пройдзе іх першая шлюбная ноч. Як будзе адбывацца працэдура рэгістрацыі і хто возьме на сябе турботы па пераводзе пасведчання аб шлюбе на рускую, англійскую, беларускую мовы, а таксама на мову дзяржавы, дзе пройдзе рэгістрацыя шлюбу.

Самая распаўсюджаная прапанова сёння — гэта рэгістрацыя шлюбу ў Чэхіі, а дакладней — у Нусельскай Ратушы. Вяселле ў Празе абыдзецца ў 950 еўра.

БОЛЬШ СЦІПЛАЕ ВЯСЕЛЛЕ

Можна абысціся адным днём. Пасля рэгістрацыі шлюбу свята можна правесці ў рэстаране альбо дзе-небудзь на сядзібе. Абавязкова прадумайце падвоз гасцей да рэстарана ці сядзібы і ў зваротным кірунку. Рэстаран ці сядзібу лепш арэндаваць на суткі, бо ёсць вялікая верагоднасць , што вашы госці не разыдуцца да 24.00. Залу для правядзення вяселля ў рэстаране ці на сядзібе можна аздобіць паветранымі шарамі, кветкамі і стужкамі. Не раім адмаўляцца ад выкрадання нявесты. Запрасіць для гэтай мэты можна шатландцаў, гангстараў альбо рыцараў... Вам таксама спатрэбіцца тамада з музычным цэнтрам. Акрамя таго, можна заказаць фаер-шоу (вогненнае шоу) за 50 у. а., шоу мыльных пузыроў (90 у. а.) і напрыканцы вяселля — піратэхнічнае прадстаўленне з феерверкам і салютам, якое абыдзецца вам таксама ў 90 у. а.

Алена КАЗІМІРАВА.

ВЯСЕЛЛЕ НА ПАВЕТРАНЫМ ШАРЫ

Рэгістрацыя шлюбу над зямлёй стане незабыўным уражаннем для вашых маладых на ўсе жыццё. Паветраны шар будзе каштаваць ад 100 да 300 у. а. Потым, калі маладыя разам са сведкамі і работнікам ЗАГСа апынуцца ў карзіне, паветраны шар падымецца на 30 метраў над зямлёй, дзе і адбудзецца рэгістрацыя шлюбу. Пасля чаго маладыя вяртаюцца на зямлю да гасцей, а далейшы сцэнарый свята можа прахо-

■ «За» і «супраць»

МАЯ ЦУДОЎНАЯ НЯНЬКА

Сучасныя жанчыны ўсё часцей вымушаны выходзіць з дэкрэтнага водпуска датэрмінова, і тады перад імі паўстае пытанне: каму даверыць сваё дзіця? Добра, калі на дапамогу гатовы прыйсці бабулі. А калі такой магчымасці няма?.. У гэтым выпадку застаецца толькі адно рашэнне: шукаць няньку збоку. Але як не памыліцца з выбарам нянькі?

Яшчэ дзесяць гадоў таму жанчына, у якой павінна было нарадзіцца дзіця, лічылася на нейкі час страчанай для грамадства і актыўнага ладу жыцця. Немаўля моцна прывязвала маці да дому і хатніх абавязкаў на цэлыя тры гады. Ды і сама жанчына не вельмі імкнулася сумяшчаць актыўнае прафесійнае і грамадскае жыццё з доглядам дзіцяці. Але потым сітуацыя пачала змяняцца. Сучасныя прадстаўніцы прыгожага полу ў дэкрэтным водпуску знаходзяцца звычайна не больш за паўтара-два гады. А выпадкі, калі маці цалкам выкарыстоўвае адведзены ёй працоўным кодэксам тэрмін на догляд дзіцяці, наогул сталі рэдкасцю. Сучасная жанчына проста не можа дазволіць сабе знаходзіцца столькі часу паза межамі абранай прафесіі. Да таго ж вельмі часта прадстаўніцы прыгожай паловы займаюць значныя пасады, з якімі (і гэта таксама зразумела) баяцца развітацца з-за вострай канкурэнцыі ў прафесійнай сферы. Ёсць і яшчэ вельмі значны аргумент — гэта грошы, якія ў любой, нават самай забяспечанай сям'і, ніколі не бываюць лішнімі. Дык ці трэба здзіўляцца таму, што некаторыя сучасныя жанчыны наогул... не выкарыстоўваюць свой дэкрэтны водпуск? У выніку паслугі бэбі-сітараў (ці нянек) становяцца ўсё больш папулярнымі?..

Як паведамілі ў агенцтве па найме хатняга персаналу, кожны другі званок да іх быў зроблены з мэтай знайсці няньку для дзіцяці. І калі раней нянек звычайна шукалі для дзетак ад аднаго-двух гадоў, то цяпер усё часцей замаўляюць бэбі-сітараў для зусім маленькіх — да году. А попыт, як водзіцца, дыктуе і кошт паслугі. Бэбі-сітары, нанятыя бацькамі праз агенцтвы, абыходзяцца ў сярэднім па 3,5—4 у. а. у гадзіну. Сума толькі за тыдзень працы такой нянькі набягае немаленькая. Таму многія мамы і таты спрабуюць абыходзіць агенцтвы-пасрэднікі і шукаюць нянек для сваіх дзетак напрамую — праз аб'явы ў сродках масавай інфармацыі. Бэбі-сітары, нанятыя такім чынам, каштуюць крыху танней — ад 2,5 да 3 у. а. за гадзіну. Але ў гэтым выпадку ўзнікае ўжо іншая праблема. Калі ў агенцтве існуюць пэўныя патрабаванні да кандыдатаў у нянькі (узрост, вопыт работы з маленькімі дзецьмі, рэкамендацыі ад ранейшых працадаўцаў і вельмі часта — спецыяльная прафесійная адукацыя), то сітары, знойдзеныя праз аб'явы, — як чорны кот у цёмным пакоі. Добра, калі сям'і пашанцуе і трапіцца сумленная нянька, якая хоць і не зусім адпавядае патрабаванням агенцтваў, але ставіцца да сваіх абавязкаў адказна. А калі не, то сям'я рызыкуе і здароўем дзіцяці, і дабрабытам.

Выпадкі, калі сітары здекваліся з дзяцей ці абкрадалі сваіх працадаўцаў, вельмі распаўсюджаны ў суседняй Расіі. А вось у нашай краіне гучных гісторый, звязаных з дзейнасцю несумленных нянек, не было. Самая агідная гісторыя, якую мне ўдалося знайсці, — гэта сітуацыя, з якой сутыкнулася маладая маці Валянціна. З мужам Аляксеям яны пажаніліся, калі ёй было 23, а яму 26 гадоў. Абое прыехалі ў Мінск з абласных цэнтраў, таму, калі нарадзілася дачушка Марына, бабуль з дзядулямі побач не аказалася. Марынцы толькі споўніўся годзік, як Валянціне прапанавалі вельмі добрую пасаду.

— Вядома, вельмі шкада было пакідаць дзіця, — расказвае жанчына, — але я разумела, што такую працу могуць больш і не прапанаваць. Таму, параіўшыся з мужам, вырашыла выходзіць з дэкрэта. Паўстала пытанне аб тым, каму даверыць догляд дачушкі.

Спачатку пара звярнулася ў агенцтва, але кошт паслуг «легальнага сітара» ў месяц аказаўся занадта высокім для Валянціны і Аляксея. Пасля няўдалага звароту да агенцтва яны вырашылі шукаць няньку праз знаёмых, але таксама безвынікова. Тады сям'я звярнулася да рекламных аб'яў. Пасля неаднаразовых сустрэч з кандыдаткамі ў «сітары» ўзялі 32-гадовую Алену. Жанчына была старанная, адказнай і ласкавай. Маленькая Марынка да яе хутка прывыкла. Валянціна проста не магла нарадавацца на сваю няньку, пакуль аднойчы, вярнуўшыся выпадкова раней з работы, не застала свайго мужа Аляксея з Аленай.

— У мяне быў шок! — расказвае Валянціна. — А самае жудаснае, што сувязь мужа з нянькай доўжылася некалькі месяцаў!

Зразумела, ад паслуг Алены адмовіліся. Мужу Валянціна даравала, але непрыемны асадак застаўся. І ўжо сваё другое дзіця жанчына няньцы не даверыла. Сына даглядала маці Валянціны.

Але гэтая сітуацыя, хутчэй, выключэнне з правіла...

— Калі вы шукаеце скандальныя гісторыі, то гэта не да мяне. Мая нянька — цудоўны чалавек, і мы з ёй сябруем! — сказала яшчэ адна мая субяседніца.

Гісторыя знаёмства Юлі з нянькай Веранікай — узорная, хоць і звонку тыповая. Юля таксама была вымушана рана выйсці з дэкрэта — яе старэйшай дачушцы не было яшчэ года. Дзяўчынка захварэла, а маці не магла доўга яе даглядаць. Вось сямейная пара і вымушана была шукаць няньку. Ім пашанцавала знайсці Вераніку сярод знаёмых мужа. Дарэчы, іх бэбі-сітару тады таксама было крыху за 30, але Юлю малады ўзрост нянькі не спужаў. Ды і падстаў расчаравацца ў сабе Вераніка не давала. Мабыць, дзякуючы свайму добраму і шчыраму характару і прафесійнай адукацыі (Вераніка раней працавала ў дзіцячым садку).

— Мне настолькі спадабалася Вераніка, што калі на свет з'явіўся сын Нікіфар, то нават не ўзнікла пытання, да каго зноў звярнуцца па дапамогу, — узгадвае Юлія.

Пасля Нікіфара ў «бэбі-сітарскай» практыцы Веранікі было яшчэ двое дзяцей: дзяўчынка і хлопчык. І іх бацькі таксама не расчараваліся ў няньцы.

Разам з тым, сказаць, што маладыя пары ахвотна імкнуцца наймаць такіх жа маладых «бэбі-сітарш», нельга. Маці ў большасці выпадкаў звяртаюцца па дарамоту да нянек, якім «пад 50» і больш гадоў. У такім выпадку сям'я атрымлівае шэраг «бонусаў»: нянькай наўрад ці спакусіцца малады муж, а мудрасць і вопыт старэйшай жанчыны будуць вельмі дарэчы.

...Святлана і Канстанцін прыехалі ў Беларусь з Расіі. Яны працуюць у філіяле расійскага выдавецтва ў нашай рэспубліцы. Калі ў іх нарадзіўся Сярожа, пара магла звярнуцца па дапамогу толькі да бэбі-сітара.

Няньку Святлана і Канстанцін наймалі праз агенцтва. Ім парэкамендавалі Надзею Віктараўну. Жанчыне 57 гадоў. Да таго, як выйсці на пенсію, яна працавала настаўнікам у сярэдняй школе.

— Выхоўваць дзяцей — яе прызванне, — гаворыць Святлана, — яна проста не можа без гэтага. Да таго ж яе дзеці ўжо дарослыя, а ўнукаў пакуль няма. Незасведаваную любоў Надзея Віктараўна цалкам перанесла на нашага Сярожку, а мы з мужам гэтаму толькі рады.

Аднак сцвярджаць, што ўсе жанчыны-маці імкнуцца наймаць бэбі-сітараў, нельга. Вельмі многія мамы ад паслуг нянек адмаўляюцца прынцыпова.

— Як можна даверыць сваё дзіця чужому чалавеку? — кажа Наталля.

Жанчына працуе ў банку, займае адказную пасаду. Муж кіруе падраздзяленнем на прамысловым прадпрыемстве. Ні адзін з іх не мог скарыстацца правам на дэкрэтны адпачынак. Наталля, калі нарадзілася дачка Варвара, узяла толькі бальнічны ў сувязі з нараджэннем дзіцяці і ў хуткім часе выйшла на працу.

— З дачушкай, пакуль мы з мужам на рабоце, знаходзіцца мая маці, — расказвае Наталля. — Яна і ёсць самая лепшая з нянек на свеце!

З пазіцыяй Наталлі не згодна маці-адзіночка Ксенія:

— У мяне сына таксама даглядала бабуля разам з прабабуляй. Але, калі б я магла наняць бэбі-сітара, то зрабіла б гэта. Кошт паслуг такіх нянек значна перавышаў мой заробак. Наняць бэбі-сітара можа дазволіць сабе не кожная сям'я, ужо не кажучы пра маці, якая адна выхоўвае дзяцей.

Але, на здзіўленне, самым жорсткім праціўнікам «нянек збоку» аказаўся... мужчына. Калі я ў Фейсбуку звярнулася да сяброў з пытаннем: што яны думаюць пра бэбі-сітараў, Аляксандр адказаў катэгарычна:

— Лічу, што нельга заводзіць дзіця, калі бацькі дзеля яго не здольны цалкам змяніць сваё жыццё. Даверыць сына ці дачку бэбі-сітару — значыць пакінуць яго з чужым чалавекам. Мы з жонкай на гэта не пайшлі. І ўпэўнены, што правільна зрабілі. Бо толькі бацькі могуць выхаваць маленькага чалавека як след: сапраўдным, шчырым, з добрым сэрцам і душой.

Наймаць ці не для свайго дзіцяці няньку, кожная пара вырашае самастойна. І ў кожнай сям'і ёсць свае «за» і «супраць» гэтага кроку. Але калі вы ўсё ж такі вырашылі зрабіць яго, то абавязкова запытайце ў сябе: наколькі вы зможаце давяраць сваёй няньцы і ці адпавядае яна вашым патрабаванням? Бо Аляксандр мае пэўную рацыю: як ні круці, а вы збіраецеся ўзяць у дом і сям'ю чужога чалавека.

Алена КАВАЛЁВА

Белагропромбанк
традиции будущего

В соответствии с условиями договоров срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении с 29 июля 2013 года до 34% годовых размера процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Забота», заключенным до 29.07.2013 года.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Процентная ставка по вкладу (депозиту) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договором банковского вклада (депозита).

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

К сведению акционеров ОАО «Универсам Рига»:

Выплата дивидендов по итогам работы за 1-ое полугодие 2013 года будет производиться 09, 12 и 13 августа 2013 года с 11.00 до 17.00 по адресу: 220040, г. Минск, ул. Сурганова, 50, 2 этаж, бухгалтерия.

УНП 100299678

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0384286 **считать недействительным.** УНП 101883943

Гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о **Зимноха Людмиле Васильевне,** 26.09.1958 г.р., зарегистрированной по адресу: г. Минск, ул. Ваупшасова, 42, сообщить в течение двух месяцев с момента публикации имеющиеся сведения в суд Московского района г. Минска по адресу: г. Минск, пр. газ. «Правда», 27.

Ликвидатор ООО «Центр правовых услуг» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже недвижимого имущества Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Истгейт форест», расположенного по адресу: Минская область, Воложинский район, Першайский сельский Совет, вблизи деревни Ислачевка на земельном участке с кадастровым номером 622085000001000001 площадью 22800 кв.м, находящегося на праве аренды:

№ лота	Наименование имущества	Ед. изм.	Кол-во	Начальная цена предмета (бел. руб.)	Сумма НДС 20%, бел. руб.	Начальная цена предмета торгов с НДС (бел. руб.)	Сумма шага аукциона в размере 5%, бел. руб.
1	**Капитальные строения с инвентарными номерами:** 632/С-24385 (подкрановые пути) площадью 66,6 кв.м 632/С-15295 (арочник) площадью 655,2 кв.м 632/С-15289 (цех по переработке мелкотоварной древесины), площадью 900,6 кв. м 632/С-15291 (здание конторы) площадью 62,7 кв.м 632/С-15348 (здание гаража на 1 автомашину) площадью 28,5 кв.м 632/С-15293 (инструментальный цех) площадью 89,4 кв.м 632/С-15297 (бытовка (баня)) площадью 34,2 кв.м 632/С-15299 (сушилка) площадью 41,1 кв.м	Шт.	1	439324200	87864840	527189040	26359452
	Стоимость 1 лота			439324200	87864840	527189040	26359452

Аукцион состоится **09 августа 2013 года в 10.00** по адресу ликвидатора: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП), или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет ИООО «Истгейт форест», принимаются по **08 августа 2013 года** до 17.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203 или по факсу 8 0162 33 93 88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 7 (семи) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов и оценки имущества, в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10 % от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет ИООО «Истгейт форест» №3012000056189 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск ул. Притыцкого, 60/2, код 742, УНП 490850658 в срок до **08 августа 2013 года** до 17.00.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: Общество с ограниченной ответственностью «Центр правовых услуг», юридический адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, контактные телефоны: 8 0162 33 93 88, 8 029 802 80 00.

Сведения о продавце: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Истгейт форест», г. Воложин, ул. Набережная, 13, 3-3, контактные телефоны: 8 0162 33 93 88, 8 029 802 80 00.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 8 0162 33 93 88.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО НА ПРАВЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «АУЛЬСКОЕ МЕЖРАЙОБЪЕДИНЕНИЕ»

Наименование предмета торгов	Лот №1
	Комплекс зданий общей площадью 13 278,2 м², сооружений, инженерных сетей, объектов благоустройства, многолетних насаждений и оборудования
Краткая характеристика	**Административное здание – 400/С-352**, площадью **418,7 м²,** двухэтажное, кирпичное, 1961 г.п.; **административное здание – 400/С-354**, площадью **401,4 м²,** двухэтажное, кирпичное, 1962 г.п.; **склад 400/С-6259**, площадью **885,5 м²,** одноэтажный, металлопрофиль, 1991 г.п.; **склад 400/С-6260**, площадью **700,9 м²,** одноэтажный, металлопрофиль, 1994 г.п.; **склад 400/С-77093**, площадью **1673,4 м²,** одноэтажный, металлопрофиль, 1988 г.п.; **склад 400/С-6258**, площадью **1561,5 м²**, одноэтажный, металлопрофиль, 1985 г.п.; **склад – 400/С-77096**, площадью **655,3 м²,** одноэтажный, кирпичный, 1983 г.п.; **склад – 400/С-353**, площадью **654,4 м²,** кирпичный, одноэтажный, 1961 г.п.; **здание СТО автомобилей – 400/С-76956**, площадью **660,0 м²**, одноэтажное, кирпичное, 1956 г.п.; **склад – 400/С-6256**, площадью **747,7 м²,** одноэтажный, кирпичный, 1966 г.п.; **административное здание – 400/С-76953**, площадью **215,7 м²**, двухэтажное, кирпичное, 1994 г.п.; **склад – 400/С-77094**, площадью **271,2 м²,** одноэтажный, кирпичный, 1953 г.п.; **склад – 400/С-6257**, площадью **569,0 м²,** одноэтажный, кирпичный, 1965 г.п.; **склад – 400/С-77097**, площадью **384,6 м²**, одноэтажный, металлопрофиль, 1983 г.п.; **склад – 400/С-77095**, площадью **569,5 м²**, одноэтажный, кирпичный, 1962 г.п.; **проходная №2 – 400/С-77100**, площадью **24,8 м²,** одноэтажная, кирпичная, 1956 г.п.; **проходная – 400/С-76957**, площадью **14,4 м²,** одноэтажная, кирпичная, 1956 г.п.; **гаражи – 400/С-77092**, площадью **358,1 м²,** здание одноэтажное, кирпичное, 1954 г.п.; **здание бытовых помещений – 400/С-76955**, площадью **119,5 м²**, одноэтажное, кирпичное, 1994 г.п.; **здание бытовых помещений – 400/С-76954**, площадью **168,8 м²**, одноэтажное, кирпичное, 1994 г.п., **склад ГСМ (навес) – 400/С-82072**, площадью **155,2 м²,** одноэтажный, металлопрофиль, 1998 г.п.; **склад – 400/С-82071**, площадью **80,2 м²,** одноэтажный, кирпичный, 1960 г.п.; **склад – 400/С-6255**, площадью **831,8 м²,** одноэтажный, кирпичный, 1960 г.п.; **склад – 400/С-6254**, площадью **578,4 м²,** кирпичный, одноэтажный, 1956 г.п.; **склад – 400/С-77098**, площадью **313,9 м²,** одноэтажный, кирпичный, 1956 г.п.; **здание мастерской – 400/С-77099**, площадью **264,3 м²,** одноэтажное, кирпичное, 1954 г.п.; **пристройка –** 2067М/1, площадью 13 м²; **бетонированная площадка –** 678, площадью 228 м²; **бытовка сборно-разборная –** 1442, площадью 16 м²; **бытовка сборно-разборная –** 1441; **металлическая эстакада –** 193; **пристройка –** 95/1, площадью 12 м², блочная, 2008 г.п.; **пристройка –** 95/2, площадью 6 м², блочная, 2008 г.п.; **гараж –** 95/3, площадью 56 м², металлический, 1998 г.п.; **навес –** 95/4, площадью 15 м², 2008 г.п.; **навес –** 95/5, площадью 15 м², 2008 г.п.; **навес –** 103/2, площадью 46 м²; **навес –** 103/3, площадью 52 м²; **навес –** 103/4, площадью 46 м²; **навес –** 103/5, площадью 24 м²; **склад –** 103/6, площадью 3 м²; **пристройка –** 103/А, площадью 6 м²; **склад –** 103/1, площадью 50 м²; **навес над рампой –** 102/2, площадью 25 м²; **платформа –** 111, длинной 10,7 м; **туалет кирпичный –** 110, **лоток ливневой самотечной сети –** 1734/1, протяженностью 215,2 м; **газон луговой –** 1734/2, площадью 1595,9 м²; **асфальтное покрытие –** 1734, площадью 16033,7 м²; **бетонное покрытие –** 1734А, площадью 732,8 м²; **забор с воротами металлическими –** 1637, протяженностью 406,7 м; **шлагбаум –** 1865; **ворота металлические –** 1735, размером 3,8х2,8 м; **ограждение –** 2032М; **резервуар металлический 10м³ – 7 ед**. (1275,1305,1306, 2033М, 2034М, 2035М, 2036М); **участок тепловой сети –** 1733, протяженностью 243,9 м; **участок газопроводной сети –** 1881, протяженностью 243 м; **участок газопроводной сети –** 1881А, протяженностью 4,16 м; **участок водопроводной сети –** 2040М; **кабельные линии электропередач – 2** (2010М, 2011М); **щит СФОА 60-05 –** 1216; **электрическая кран-балка –** 1218; **кран-балка –** 1222; **кран-балка (таль электрическая) –** 2043М; **водоем пожарный –** 172, объем 250 м³; **подъемник межстеллажный МП 250-255 – 6 ед. (**1287,1301, 1302, 1303, 1304,1425); **котел «Факел 08ЖЛ» –** 1751; **котел газовый настенный «NEVALUX 8029» – 4 ед.** (1882,1883,1884,1885), **теплогенератор –** 1886; **охранная сигнализация –** 1894; **фонари уличного освещения-лампы – 22 шт.** МБП; **стеллаж – 62 ед**.; **клумба цветочная – 2 шт.; многолетние насаждения – 23 ед.** **В нижеперечисленных капитальных строениях сдаются помещения в аренду:** **административное здание – 400/С-354, арендатор ООО «АмитексОптиум», договор аренды до 01.03.2015 г.;** **административное здание – 400/С-76953, арендатор ИООО «Мегакорп», договор аренды до 01.08.2013 г.;** **склад – 400/С-6256, арендатор ИООО «Мегакорп», договор аренды до 01.08.2013 г.;** **склад – 400/С-353, арендатор ИООО «Мегакорп», договор аренды до 01.08.2013 г.;** **склад – 400/С-6254, арендатор ООО «Литвина-Сервис», договор аренды до15.08.2014 г.;** **склад – 400/С-77097, арендатор ООО АмитексОптиум», договор аренды до 01.10.2013 г.;** **гараж – 400/С-77092, арендатор ОДО «Барка-ССБ», договор аренды до 31.12.2014 г.;** **склад – 400/С-77094, арендатор ОДО «Барка-ССБ», договор аренды до 31.12.2014 г.**
Местонахождение имущества	**г. Гродно, ул. Суворова, 166**
Информация о земельном участке	Имущество расположено на земельном участке площадью 3,3800 га с кадастровым номером 440100000001000536, назначение – для обслуживания зданий и производственных помещений
Начальная цена предмета торгов, руб.	**31 870 113 822** рубля с учетом НДС
Сумма задатка, руб.	**318 701 138 рублей**
Условия торгов	Без условий
Сведения о продавце	ОАО «Аульское межрайобъединение», г. Гродно, ул. Суворова, 166, тел. (0152) 99 11 40, 99 12 07
Сведение об организаторе торгов	Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. (0152) 72 00 57, 77 23 79, 74 49 11
Номер счета организатора торгов для перечисления задатка	р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов
Условия оплаты	Определяется по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи
Торги состоятся 4 сентября 2013 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8	
Срок подачи документов для участия в торгах	**по 30 августа 2013 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**
Для участия в торгах необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить организатору следующие документы: 1. заявление; 2. заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка; 3. юридическим лицам – резидентам РБ – заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицам – нерезидентам РБ – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателям – заверенную копию свидетельства о государственной регистрации; представителям юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность и заверенные копии документов удостоверяющего личность представителя; физическим лицам – заверенную копию документа, удостоверяющего личность физического лица; представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и копию документа, удостоверяющего личность представителя; иностранным гражданам или лицам без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и документ, подтверждающий полномочия. После предоставления вышеуказанных документов осуществляется предварительная регистрация и заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов.	
Порядок проведения торгов	Шаг аукциона – 5% от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Задаток, внесенный победителем торгов, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов, продавец вправе снять имущество с торгов до объявления его проданным. Победитель торгов возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов на основании счет-фактуры, выставленной Организатором торгов.
Телефоны для справок в г. Гродно: (0152) 72 00 57, 77 23 79, 74 49 11	

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» с 29 июля 2013 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	32,00	33,00	33,30	34,50	34,80	35,10	35,40	9,00	9,50	10,00	10,50	11,00	11,50
1 000 001 – 10 000 000	32,10	33,10	33,40	34,60	34,90	35,20	35,50	9,25	9,75	10,25	10,75	11,25	11,75
10 000 001 и более	32,20	33,20	33,50	34,70	35,00	35,30	35,60	9,50	10,00	10,50	11,00	11,50	12,00
Доллары США													
1 – 500	5,30	5,60	5,90	6,10	6,60	6,90	7,20	3,00	3,80	4,40	4,80	5,20	5,60
501 – 5 000	5,40	5,70	5,95	6,20	6,70	6,95	7,30	3,30	4,00	4,60	5,00	5,40	5,80
5 001 и более	5,50	5,80	6,00	6,50	6,80	7,00	7,50	3,60	4,20	4,80	5,20	5,60	6,00
Евро													
1 – 500	5,30	5,60	5,90	6,10	6,60	6,90	7,20	3,00	3,80	4,40	4,80	5,20	5,60
501 – 5 000	5,40	5,70	5,95	6,20	6,70	6,95	7,30	3,30	4,00	4,60	5,00	5,40	5,80
5 001 и более	5,50	5,80	6,00	6,50	6,80	7,00	7,50	3,60	4,20	4,80	5,20	5,60	6,00
Российские рубли													
1 – 15 000	6,80	7,10	7,40	7,60	8,10	8,40	8,70	4,50	5,30	5,90	6,30	6,70	7,10
15 001 – 150 000	6,90	7,20	7,45	7,70	8,20	8,45	8,80	4,80	5,50	6,10	6,50	6,90	7,30
150 001 и более	7,00	7,30	7,50	8,00	8,30	8,50	9,00	5,10	5,70	6,30	6,70	7,10	7,50

Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2012 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

	Январь	Февраль	Март	Апрель	Май	Июнь	Июль	Август	Сентябрь	Октябрь	Ноябрь	Декабрь	Итого
Срочные вклады (депозиты)	98 253 076,1	107 251 486,6	129 307 156,0	135 580 785,5	125 213 163,6	102 674 286,8	94 625 390,9	91 808 015,4	82 961 944,5	96 867 085,9	98 367 013,3	110 701 552,4	1 273 610 956,9
До востребования	2 435 875,6	3 038 153,9	3 399 503,8	3 507 658,0	4 097 252,6	3 429 146,8	3 405 457,7	3 829 635,2	3 704 628,0	4 047 605,3	3 615 067,0	4 031 164,7	42 541 148,6

Процентная ставка по вкладу (депозиту) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договором банковского вклада (депозита).

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

«Франсабанк» Открытое акционерное общество
Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 95А
тел.: (017) 389 36 36, факс: (017) 389 36 37
office@fransabank.by www.fransabank.by

«Франсабанк» Открытое акционерное общество

Сокращенная финансовая отчетность, подготовленная на основе финансовой отчетности за год, закончившийся 31 декабря 2012 года

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2012 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

	Год, закончившийся 31 декабря 2012 года	Год, закончившийся 31 декабря 2011 года
Процентные доходы	68,854	82,022
Процентные расходы	(25,473)	(27,420)
ЧИСТЫЙ ПРОЦЕНТНЫЙ ДОХОД ДО ФОРМИРОВАНИЯ РЕЗЕРВОВ ПОД ОБЕСЦЕНЕНИЕ АКТИВОВ, ПО КОТОРЫМ НАЧИСЛЯЮТСЯ ПРОЦЕНТЫ	43,381	54,602
(Формирование)/восстановление резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты	(29)	2,184
ЧИСТЫЙ ПРОЦЕНТНЫЙ ДОХОД	43,352	56,786
Чистая прибыль/(убыток) по операциям с иностранной валютой	19,465	(276,729)
Чистая прибыль по операциям с производными финансовыми инструментами	13,940	306,481
Доходы по услугам и комиссии	15,446	17,215
Расходы по услугам и комиссии	(2,644)	(4,220)
(Формирование)/восстановление резервов по прочим операциям	(38)	220
Прочие доходы, нетто	615	1,844
ЧИСТЫЕ НЕПРОЦЕНТНЫЕ ДОХОДЫ	46,784	44,811
ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ	90,136	101,597
ОПЕРАЦИОННЫЕ РАСХОДЫ	(44,518)	(47,215)
ПРИБЫЛЬ ДО НАЛОГООБЛОЖЕНИЯ И ОТРАЖЕНИЯ УБЫТКА ПО ЧИСТОЙ ДЕНЕЖНОЙ ПОЗИЦИИ	45,618	54,382
Расходы по налогу на прибыль	(1,336)	(12,008)
ПРИБЫЛЬ ДО ОТРАЖЕНИЯ УБЫТКА ПО ЧИСТОЙ ДЕНЕЖНОЙ ПОЗИЦИИ	44,282	42,374
Убыток по чистой денежной позиции в связи с инфляцией	(25,546)	(60,926)
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ/(УБЫТОК)	**18,736**	**(18,552)**

ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2012 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

	Год, закончившийся 31 декабря 2012 года	Год, закончившийся 31 декабря 2011 года
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ/(УБЫТОК)	**18,736**	**(18,552)**
ПРОЧИЙ СОВОКУПНЫЙ ДОХОД/(УБЫТОК)		
Совокупный убыток/(доход), перенесенный в отчет о прибыли и убытках при выбытии инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	776	(92)
Изменение справедливой стоимости инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	138	(387)
ИТОГО ПРОЧИЙ СОВОКУПНЫЙ ДОХОД/(УБЫТОК)	914	(479)
ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД/(УБЫТОК)	**19,650**	**(19,031)**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2012 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

	31 декабря 2012 года	31 декабря 2011 года
АКТИВЫ:		
Денежные средства и счета в Национальном банке Республики Беларусь	144,215	52,842
Производные финансовые инструменты, активы	72,332	72,445
Средства в банках	6,690	115,463
Кредиты, предоставленные клиентам	231,923	189,074
Инвестиции, имеющиеся в наличии для продажи	49,114	30,960
Предоплата по текущему налогу на прибыль	4,658	-
Отложенные налоговые активы	2,232	-
Основные средства и нематериальные активы	129,732	126,401
Прочие активы	2,638	1,930
ИТОГО АКТИВЫ	**643,534**	**589,115**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ		
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА:		
Производные финансовые инструменты, обязательства	32	-
Средства банков	88,965	105,474
Средства клиентов	171,742	102,537
Кредит от связанной стороны	-	30,341
Выпущенные долговые ценные бумаги	-	14,701
Обязательства по текущему налогу на прибыль	-	6,721
Прочие обязательства	4,345	3,295
Субординированный заем	105,264	124,850
Итого обязательства	370,348	387,919
КАПИТАЛ:		
Уставный капитал	329,363	277,023
Фонд переоценки инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	435	(479)
Непокрытый убыток	(56,612)	(75,348)
Итого капитал	273,186	201,196
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ	**643,534**	**589,115**

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2012 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

	Уставный капитал	Фонд переоценки инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	Непокрытый убыток	Итого капитал
31 декабря 2010 года	**277,023**	**-**	**(56,796)**	**220,227**
Итого совокупный убыток за год	-	(479)	(18,552)	(19,031)
31 декабря 2011 года	**277,023**	**(479)**	**(75,348)**	**201,196**
Увеличение уставного капитала	52,340	-	-	52,340
Итого совокупный доход за год	-	914	18,736	19,650
31 декабря 2012 года	**329,363**	**435**	**(56,612)**	**273,186**

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2012 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

	Год, закончившийся 31 декабря 2012 года	Год, закончившийся 31 декабря 2011 года
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Прибыль до налогообложения и отражения убытка по чистой денежной позиции	45,618	54,382
Корректировки:		
Формирование/(восстановление) резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты	29	(2,184)
Формирование/(восстановление) резервов по прочим операциям	38	(220)
Изменение справедливой стоимости производных финансовых инструментов	(13,940)	(306,481)
Амортизация основных средств и нематериальных активов	3,710	3,430
Чистый убыток от выбытия основных средств и нематериальных активов	142	430
Курсовые разницы, нетто	855	293,906
Чистое изменение начисленных процентных доходов и расходов	(386)	4,379
Чистый убыток/(прибыль) от выбытия инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	776	(92)
Чистое изменение прочих начисленных доходов и расходов	(1,019)	1,511
Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств	35,823	49,061
Изменение операционных активов и обязательств		
(Увеличение)/уменьшение операционных активов:		
Минимальные обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь	(1,115)	(522)
Производные финансовые инструменты	(206)	199,682
Средства в банках	(959)	18,674
Кредиты, предоставленные клиентам	(80,654)	8,130
Прочие активы	274	(585)
Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств:		
Средства банков	(838)	(106,579)
Средства клиентов	93,445	13,826
Прочие обязательства	1,891	1,415
Приток денежных средств от операционной деятельности до налогообложения	47,661	183,102
Налог на прибыль уплаченный	(15,167)	(2,849)
Чистый приток денежных средств от операционной деятельности	32,494	180,253
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Приобретение основных средств и нематериальных активов	(7,745)	(6,006)
Поступления от выбытия объектов основных средств и нематериальных активов	264	705
Чистое погашение и (приобретение)/продажа инвестиций в ценные бумаги	(23,935)	22,551
Чистый (отток)/приток денежных средств от инвестиционной деятельности	(31,416)	17,250
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Увеличение уставного капитала	52,340	-
Погашение кредита от связанной стороны	(27,016)	(84,938)
(Погашение)/поступления от выпуска долговых ценных бумаг, нетто	(12,995)	20,709
Чистый приток/(отток) денежных средств от финансовой деятельности	12,329	(64,229)
ЧИСТОЕ УВЕЛИЧЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ И ИХ ЭКВИВАЛЕНТОВ	13,407	133,274
Влияние изменения курсов иностранных валют на денежные средства и их эквиваленты	794	36,493
Влияние инфляции на денежные средства и их эквиваленты	(33,111)	(103,739)
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на начало года	167,194	101,166
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на конец года	148,284	167,194

Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2012 года, составила 25,350 млн. руб. и 68,305 млн. руб., соответственно.

Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2011 года, составила 19,381 млн. руб. и 78,361 млн. руб., соответственно.

От имени Правления Банка:

Председатель Правления
И. Колейлат
15 июля 2013 года
Минск

Главный Бухгалтер
А. Н. Русакович
15 июля 2013 года
Минск

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 15 от 26.04.2013 г. УНП 100755021.

ОТЧЕТ НЕЗАВИСИМОГО АУДИТОРА СОКРАЩЕННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Акционерам и Правлению «Франсабанк» Открытого акционерного общества

Прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, которая включает бухгалтерский баланс по состоянию на 31 декабря 2012 года и соответствующие отчеты о прибыли и убытках, о совокупном доходе, об изменениях в капитале, о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2012 года, составлена на основе аудированной финансовой отчетности «Франсабанк» Открытого акционерного общества (далее – «Банк» или «Франсабанк» ОАО), за год, закончившийся 31 декабря 2012 года. Мы выразили безусловно положительное мнение в отношении финансовой отчетности «Франсабанк» ОАО в аудиторском заключении от 6 мая 2013 года. Аудированная финансовая отчетность и публикуемая сокращенная финансовая отчетность не отражают влияния событий, произошедших после даты аудиторского заключения.

В данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности не раскрывается вся информация, требуемая Международными стандартами финансовой отчетности. Поэтому ознакомление с сокращенной годовой финансовой отчетностью не заменяет ознакомления с аудированной финансовой отчетностью «Франсабанк» ОАО.

Ответственность руководства за подготовку сокращенной финансовой отчетности

Руководство Банка несет ответственность за подготовку данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности на основе аудированной финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года.

Ответственность аудитора

Наша ответственность состоит в выражении мнения о данной публикуемой сокращенной годовой финансовой отчетности на основе процедур, проведенных в соответствии с Международным стандартом аудита (МСА) 810 «Аудиторские задания по сокращенной финансовой отчетности».

Мнение

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, подготовленная на основе аудированной финансовой отчетности «Франсабанк» ОАО за год, закончившийся 31 декабря 2012 года, соответствует этой финансовой отчетности во всех существенных аспектах, в соответствии с требованиями Инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года.

В целях более точного понимания финансового положения «Франсабанк» ОАО по состоянию на 31 декабря 2012 года и результатов его деятельности и движения денежных средств за год, закончившийся на эту дату, публикуемую сокращенную годовую финансовую отчетность следует изучать вместе с аудированной годовой финансовой

■ Нататкі адпускніка

ГУКІ І ВОДАРЫ ЛЕТА

Напэўна, не памылюся, калі скажу: такога працяглага пахаладання і дажджоў у сярэдзіне ліпеня не было даўно. Прынамсі, у апошнія гады дакладна. Як мінімум пазалетась і летась усе ў гэты час літаральна «плавіліся» ад спёкі, шукалі ад яе паратунку. А сёлета нешта не так «зарадзіла», нягледзячы на папярэднія абяцанні сіноптыкаў. У нейкі момант нават стала шкада калег: дзве пары выхадных — дажджы. Я ж цудоўна разумею, што працавалі цэлы тыдзень, а як ехаць у вёску, на дачы — дык які там адпачынак?.. Яшчэ нядаўна вельмі чакалі вільгаці, абмяркоўвалі, як падае ціск у вадаправодзе ў сярэдзіне дня, а цяпер усе размовы пра... фітафтору: чым абернуцца гэтыя дажджы, якім прэпаратам лепш апырскваць памідоры. Ці іх увогуле ратаваць трэба: здымаць, няхай даспяваюць на падаконніку...

Каму зараз ад вільгаці добра, дык гэта лясам. І пажараў няма, і лісічкам даспадобы. Кажуць, іх цяпер шмат. Не ведаю, з-за пастаянных ападкаў да лесу пакуль не даехалі. Чарніц на мінулым тыдні, пакуль было суха, у пасёлку прадавалі багата. Хто на вагу (5,5 кілаграма за 150 тысяч), хто па аб'ёме (пяцілітровае вядзерца можна было набыць з невялікай зніжкай за 90 тысяч). Ягады смачныя, буйныя. З-пад Пекаліна, што ў суседнім Смалявіцкім раёне. І мы туды ездзілі раней увесь час.

Цішыня ў водпуску — гэта асобная тэма. Яна бывае рознай. Галоўнае, у ёй няма бясконцага гулу транспарту (хаця, па шчырасці, калі, бывае, выйдзеш у выхадны ў цэнтр пасёлка, дык дарогу не перайсці — машыны ідуць суцэльнай плынню; там на цэнтральнай вуліцы нават «ляжачага паліцэйскага» паклалі і некалькі «зебраў» намалявалі). А шум рухавіковай камбайнаў, што праходзяць побач у паходным стане, успрымаецца як песня. Пакуль не было дажджоў, яны часта ездзілі: то паасобку, то невялікай калонай. Гэты гук не з чым не зблытаеш — настолькі ён адмысловы. Нават калі не бачыш саміх камбайнаў, пазнаеш.

Цішыня бывае з пеўнямі. Калі гучна пачынае паблізу адзін, потым падхоплівае трохі далей другі, яшчэ праз нейкі час ужо цішэй адгукаецца трэці. Каб пачуць пятага ці штостага недзе, магчыма, у суседняй вёсцы, трэба ўжо «навастрыць» вушы. І як толькі сціхае гэты ледзьве чутны гук, побач гучна зноў заводзіць «пераклічку» першы... Бывае ўсё тое ж самае, толькі з сабакамі. А бывае цішыня толькі з ветрам, калі нават спеваў птушак не чуваць. А іншым разам толькі яны і «гамоняць». Апошнім часам цішыня з гукамі дажджу...

А ці ведаеце вы, які цяпер самы характэрны гук летам у сельскай мясцовасці? Ён і ў горадзе часта гучыць, але тут па-іншаму... Бензакосы! А вось чаго ўжо амаль немагчыма пачуць, дык гэта як кладзецца трава пад звычайнай касой.

...Які агульны настрой? Аб працы думаецца ўсё менш, значыць, арганізм да адпачынку, як той казаў, адаптаваўся. Менавіта пасля некалькіх тыдняў удалечыні ад тлумнага горада традыцыйна ўзнікае жаданне яшчэ падоўжыць водпуск. Ну, напісаць на адрас рэдакцыі нешта кшталту таго, што, маўляў, не чакайце пакуль, затрымліваемся, абыходзьцеся неяк самі, без нас. І чым далей доўжыцца адпачынак, тым мацнейшым робіцца гэта жаданне: падолей пабыць у спакоі, цішыні, удалечыні ад горада...

Яшчэ ў вёсцы цішыня бывае напоўненая тым, што ў горадзе вельмі раздражняе, а тут гучыць натуральна: гукамі ад суседзяў. Бо гэта вам не бетонная каробка, калі за гук перфаратара з якой-небудзь кватэры (часам нават немагчыма зразумець, з якой) ты пачынаеш злавацца на ўсіх... У вёсцы — прастор, ніхто нікому не замінае. Вось чуваць, як Сяргей у гаражы рамантуе і фарбуе машыну. Слава пасля працы і ў выхадныя «кляпае» новую металічную агароджу... У Федзі заскрыгатала бетонамяшалка... Заўсёды здзіўляемся, чым займаецца Дачнік — так паміж сабой мы завём яшчэ аднаго суседа непадалёку. Участак у яго невялікі, дагледжаны. Але практычна заўсёды з яго падворку чуваць, як працуе то «балгарка», то дрыль. Цікава, што ён майструе ўвесь час? Вось і яшчэ адзін сусед залез на дах і на ўсё навакольле гучаць удары малатка: нешта рамантуе. Праўда, простыя інструменты — пілу, малаток, гэблік (за выключэннем хіба сякеры ды рыдлёўкі) пачуеш ужо нячаста: на змену ім прыйшлі шрубавёрты, бензапілы, электрадрылі, зварачныя апараты, дрэваапрацоўчыя станкі. Так, суседзі ў нас навокал «рукастыя». Але ў вёсцы без гэтага — ніяк.

...А ці ведаеце вы, які самы характэрны гук цяпер летам у сельскай мясцовасці? Ён і ў горадзе часта гучыць, але тут па-іншаму... Бензакосы! Па чарзе то тут, то там суседзі абкошваюць траву ўздоўж платоў, на ўчастках. У выхадныя іншым разам атрымліваецца «пераклічка», як з тымі пеўнямі!

А вось чаго ўжо амаль немагчыма пачуць, дык гэта як кладзецца трава пад звычайнай касой. Раней сусед Саша мог разбудзіць ранкам, калі касіў пад вокнамі траву для сваёй каровы. Але рагулю ён не трымае ўжо гады са два, калі не болей. Не чуваць больш і таго, як увечары чарада кароў вяртаецца дадому, як яны разыходзяцца на скрыжаванні — кожная ў свой бок, «раўнуўшы» на развітанне адна адной... Раней толькі побач з намі трымалі з паўтузіна рагуль. Удзень было чуваць, як бразгаюць вёдры аб рамы веласіпедаў: жанчыны ехалі на луг да моста даіць. Назад, вядома, веласіпеды ўжо кацілі з паўнюткімі вёдрамі. У аднакласніцы, што побач жыве, шмат гадоў была карова, яна няблага зарабляла на малацэ. Колькі гадоў таму Іра збыла яе, а сама ўвогуле ўладкавалася на працу ў Мінск... Зараз, калі не памыляюся, з той колькасці людзей карова засталася толькі ў адной жанчыны, якая і носіць нам і іншым ахвотным малако. Днямі яна сказала, што павялічвае цану на яго на дзве тысячы: не хапае кармоў — дагэтуль траву выпаліла сонца, а новая не нарасла.

Адпачынак у вёсцы — гэта яшчэ пахі і смакі. Малінавага варэння, якое зварыла маці з сабраных намі ягад. Любімых жа матуліных дранікаў, якія так добра мачаць у смятану, пакладзеную ў растоплены ад шкварак гарачы тлушч у патэльні і ўбітыя туды ж яйкі (эх, трэба «завязваць» з блінцамі і мачанкай, бо ў штаны будзе цяжка потым улазіць!..) Смак сваіх саладзенькіх агурочкаў, пах толькі што набранага ў жменю з градкі кропу... Моцны пах пасля дажджу і ў начны час флёксаў, якія нездарма яшчэ называюць «панскі вечар»... Раз-пораз увечары ў паветры лунае дымок ад мангалаў: суседзі па чарзе смажаць шашлыкі. Дачнік, дык той увогуле ў абед (калі моцнага дажджу няма) гатуе толькі на адкрытым агні, для чаго зрабіў спецыяльны мангал-барбекю з камінам. І не лянуецца ж чалавек!..

...Яшчэ хачу адкрыць невялікі сакрэт. Хоць мы жывём практычна побач з цэнтрам пасёлка, завулак наш ціхі, і ў нас на ўчастку жывуць... вожыкі. Не тое, каб зусім у нас, але дзе знаходзіцца іх «бункер», мы здагадваемся... Пасяліліся яны тут вельмі даўно, гадоў пятнаццаць таму, калі не болей. Вядома, пабачыць іх можна толькі позна ўвечары або ноччу, калі выйдзеш на двор. Калі нешта заварушылася, зашамацела недзе пад плотам — значыць, прыйшлі. Упершыню вожыкі з'яўляюцца калі ў красавіку, калі ў маі — у залежнасці ад надвор'я. Бачылі і старую (або цяжарную) самку, якая аднойчы захрасла проста пад брамкай, і маленькіх вожыкаў-дзетак. Мы іх не чапаем, ды і самі яны, калі хто не ведае, бегаюць даволі хутка. Паглядзім якую хвіліну толькі на іх, паслухаем, як яны «рохкаюць». Брат аднойчы адмысловым свістам падваблівае аднаго маладога. Той, відаць, думаў, што пішчыць мыш, падбягаў амаль да нагі, але ў апошні момант разумеў, што нешта не тое. Па нейкай адмысловай дузе адбягаў, але зноў ішоў на свіст... Відавочна, тут вырасла ўжо не адно пакаленне гэтых істот. Мы жартуем: што за нашым катом Кузем не даядуць суседскія каты, падбяруць вожыкі. Ну і на здароўе!..

Сяргей РАСОЛЬКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На пачатку тыдня не варта будаваць залішне грандыёзных планаў, будзе значна лепш адпачыць і сабрацца з сіламі. Бязлітасна пазбаўляйцеся ад непатрэбнага хламу, вызваляйце прастору для новых станоўчых змен. Ваша энергія і напор гарантуюць поспех у шматлікіх справах.

ЦЯЛЕЦ. На пачатку тыдня паспяхова пройдуць дзелавыя перамовы, якія дазволяць стабілізаваць узровень дабрабыту. У чацвер на працы лепш не выяўляць залішняй актыўнасці і ініцыятывы, бо гэта можа выклікаць толькі зайздрасць і пагалоску. Вашу светлую галаву наведаюць самыя разнастайныя ідэі, у гэты дзень вам наўрад ці ўдасца доўга ўсядзець на адным месцы. Захочацца атрымаць усё і адразу.

БЛІЗНЯТЫ. Падумайце пра сябе. Назапасілася ўжо столькі важных спраў і нявырашаных праблем, што час заняцца іх вырашэннем. Але не спрабуйце зрабіць усё адразу, пачніце з самага галоўнага. Сяброўскі ўдзел дапаможа пераадолець асноўныя цяжкасці. У працы вызначаюцца новыя цікавыя перспектывы, не выпусціце свой шанц.

РАК. Не дазваляйце спакусе збіваць вас з правільнага шляху, памятайце, што ад дабра дабра не шукаюць. Можаце стаць аб'ектам службовай інтрыгі. Непажадана нанова паўтараць пройдзеныя памылкі, матывуючы тым, што зручней хадзіць па пратаптанай сцежцы. Лепш спытайце парады ў надзейных сяброў ці ў старэйшых сваякоў, якім вы давяраеце.

ЛЕЎ. Калі вы задумаліся над зменай працы, то цяпер добры момант для пошуку новага месца. Паспрабуйце завяршыць пачатыя справы, гэта дазволіць пазбегнуць непаразуменняў і непрыемнасцяў. У сераду паступіць доўгачаканая інфармацыя, якая раскрые перад вамі новыя магчымасці. У сераду і чацвер супрацьпаказаны справы, звязаныя з тэхнікай, атрутнымі і гаручымі вадкасцямі. Непажадана ў гэтыя дні абзаводзіцца жывёламі. Магчыма канфліктная сітуацыя з грашыма.

ДЗЕВА. Ёсць рызыка залішняй інтэлектуальнай актыўнасці. Само па сабе гэта не небяспечна, але мноства праектаў, вамі запланаваных, можа знясіліць якога заўгодна дзейнага чалавека. Стрымайце палёт фантазіі, час для палётаў трохі няўдалы. У другой палове тыдня могуць паўстаць праблемы з пунктуальнасцю, як па вашай уласнай віне, так і па прычынах, якія не залежаць ад вас. Гэта варта ўлічваць, адпраўляючыся на важныя сустрэчы.

ШАЛІ. Мэтанакіраванасць дазволіць паспяхова вырашыць практычна ўсе актуальныя задачы. Так што смела ўвасабляйце вашы задумы ў жыццё, ад тэорыі — да практыкі. Але не вельмі спяшайцеся з сур'ёзнымі высновамі, асабліва ў аўторак і чацвер. На пачатку тыдня прадставіцца выдатны шанц зірнуць на сябе збоку. Паспрабуйце яго не прапусціць. Варта аб'ектыўна ўспрымаць канструктыўную крытыку на працы і выправіць свае памылкі.

СКАРПІЁН. Верагодная досыць рэзкая змена дзейнасці. Пры гэтым зусім не абавязковая змена працоўнага месца — проста з'явіцца іншая тэма ці нават цэлы кірунак. Прыміце дапамогу калег, яна акажацца вельмі дарэчы. У канцы тыдня адчуеце раптоўную змену рытму — замест напружання прыйдзе лёгкасць і адкрыецца другое дыханне.

СТРАЛЕЦ. Неабачлівыя ўчынкі могуць мець непажаданыя наступствы, таму будзьце ўважлівымі і асцярожнымі і на працы, і дома. У сітуацыі, якая склалася, не губляйце прысутнасці духу, і здолееце разабрацца ва ўсім. Хуткае прыняцце рашэнняў у чацвер прынясе нечакана станоўчыя вынікі, але звярніце ўвагу на эмацыйны бок такога метаду.

КАЗЯРОГ. Вас можа чакаць творчы ўздым і знаходка асабліва ўдалых рашэнняў праблемных задач, якія патрабуюць узгадненняў з начальствам. Будзеце мець зносіны з малазнаёмымі людзьмі больш звычайнага. Блізкія дапамогуць убачыць спрыяльныя магчымасці. Лепшым вашым упрыгажэннем стане сціпласць, што дазволіць пазбегнуць прамашак і недахопаў у працы. У другой палове тыдня лепш заняць чакальную пазіцыю і быць гатовым да пэўных кампрамісаў, якія дазваляюць прасунуцца наперад.

ВАДАЛЕЙ. Пажадана ўціхамірыць ўяўленне, якое разгулялася, і перастаць звяртаць увагу на безгрунтоўныя чуткі. Усе дасягненні маюць сваю каштоўнасць, але іх давядзецца неўзабаве замацоўваць і нават адстойваць. Аўторак і серада на дзіва спрыяльныя для абмеркавання далёка ідучых планаў і канструявання розных праектаў уласнай будучыні.

РЫБЫ. З'явіцца магчымасць рэалізаваць новыя ідэі і праекты. Задумаўшы штосьці сур'ёзнае, не спяшайцеся шчодра рэкламаваць гэта навакольным. Пачакайце, пакуль задума набудзе рэальныя рысы, і тады поспех забяспечаны. Спрыяльны тыдзень для рашэння праблем, звязаных з кар'ерай. У гэтым дапамогуць новыя знаёмствы і сувязі. У другой палове тыдня можаце крыху пераацаніць свае магчымасці, таму лепш пазбягаць удзелу ў сур'ёзных мерапрыемствах.

Даты. Падзеі. Людзі

1990 год — Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У дакуменце абвяшчаўся «поўны дзяржаўны суверэнітэт БССР як вяршэнства, самастойнасць і паўната дзяржаўнай улады ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах». Такім чынам Канстытуцыя і законы рэспублікі набылі прыярытэт над заканадаўствам СССР, хоць не адпрэчвалася знаходжанне Беларусі ў яго складзе. Суверэнітэт зацвярджаўся ў імя вышэйшых мэт — свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна рэспублікі на аснове забеспячэння правоў асобы. Прыняцце Дэкларацыі абумовіла развіццё прававых нормаў: грамадзянства Беларусі, непадзельнасць і недатыкальнасць тэрыторыі, уласнасць беларускага народа на зямлю, нетры, паветраную прастору, нацыянальныя, культурныя і гістарычныя каштоўнасці, права на стварэнне сваіх фінансава-крэдытнай і грашовай сістэм, права заключаць саюзы з іншымі дзяржавамі і выходзіць з іх і г.д. 5 жніўня 1991 года 5-я нечарговая сесія Вярхоўнага Савета Беларусі надала Дэкларацыі статус канстытуцыйнага закона.

1841 год — каля Пяцігорска, на ніжнім схіле гары Машук, нехта маёр Мартынаў забіў на дуэлі вялікага рускага паэта, якому не было і дваццаці сямі гадоў. Многія лічаць, што Лермантава загубіў Мікалай I. У 1837 годзе юны Лермантаў напісаў славуты верш «На смерць паэта», дзе, па сутнасці, абвінаваціў расійскую арыстакратыю ў гібелі Пушкіна. За гэты верш лейб-гвардыі паручнік Лермантаў быў адпраўлены на Каўказ, пад кулі. Паэт адважна заяваў, вылучыўся ў баях. А яго бабка па маці Арсеньева тым часам ажыццявіла высокія парогі ў Пецярбургу. Дзякуючы ёй намаганням у 1838-м Лермантаву дазволілі вярнуцца. Але ў лютым 1840-га малады афіцэр паскарыўся з сынам французскага пасла. Дуэль, ваенны трыбунал і новая высылка на Каўказ, у пяхотны полк. Праз год тая ж бабка зноў адбіла свайго геніяльнага ўнука — і той зноў вярнуўся ў Піцер, дзе быў сустрэты са славай, як наступнік Пушкіна. Якраз гэта і не спадабалася цару. Праз некалькі тыдняў прыйшоў загад: вярнуцца ў полк. У Пяцігорску знайшліся ворагі і зайздроснікі, а Лермантаў быў запальчывы. І мізэрны Мартынаў, чыё імя засталося ў гісторыі толькі таму, што ён забіў Лермантава — як імя Герастрата, які спаліў храм Артэміды, — гэты Мартынаў зрабіў сваю чорную справу... Вядома, што ўжо ў год сваёй гібелі, за чатыры месяцы да яе, Лермантаў пачаў клапаціцца аб адстаўцы. Паэт хацеў заняцца толькі літаратурай, марыў аб выданні свайго часопіса.

1938 год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Рэчань Любанскага раёна) Леанід Васільевіч Кукрэш, беларускі вучоны ў галіне раслінаводства, селекцыянер, акадэмік НАН Беларусі (2003), доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш як 180 навуковых прац у галіне селекцыі, земляробства і раслінаводства. Унёс значны ўклад у распрацоўку тэхналогіі вырошчвання зернебабовых культур, рашэнне праблем вытворчасці раслінага бялку, павышэнне прадукцыйнасці збожжавай гаспадаркі. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле ў Беларусі шырока разгорнуты работы па селекцыі гароху і яравой вікі.

Было сказана

Рыгор ШЫРМА, харавы дырыжор, фальклярыст, грамадскі і музычны дзеяч:

«Праз сучаснасць мы падаём руку будучыні і накладаем надзеі на свой край, свой народ, на саміх сябе».

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РУПЛІВЫМ ГАСПАДЫНЯМ

Булённыя кубікі хатняга прыгатавання

Вельмі часта бываюць моманты, калі трэба прыгатаваць штосьці вельмі хутка, ці зрабіць суп-пюрэ, верашчаку, соус на курыным булёне. У такіх выпадках многія выкарыстоўваюць крамныя курыныя кубікі, а ўмелыя гаспадыні замарожваюць у запас булён, але ўсе гэтыя пасудзіны займаюць шмат месца ў маразілцы. Давайце прыгатуем самастойна хатнія, натуральныя булённыя кубікі, якія зоймуць мінімум месца ў маразілцы.

Спатрэбіцца: *курыныя наборы для булёна — 2 кг, морква (сярэдняя) — 2 шт., сельдэрэй чаранковы — 2 шт., цыбуля рэпчатая — 1 шт., невялікі пучок кропу і пятрушкі, лаўровы ліст — 2 шт., перац чорны (свежамолаты) — 1 ч. л., соль — 1,5 ст. л., вада (халодная) — 4 л.*

Усю гародніну ачысціць, прамыць і буйна нарэзаць. Курыныя часткі і гародніну пакласці ў каструлю, уліць 4 літры халоднай вады і давесці да кіпення. Зняць пену, паменшыць агонь, пасаліць і варыць 3 гадзіны. Працадзіць булён у чысты посуд. Вярнуць на агонь і яшчэ раз давесці да кіпення. Зніміце з паверхні як мага больш тлушчу і гатуйце на невялікім агні, пакуль вадкасць не набудзе густы карамельны колер, прыкладна 2 гадзіны. Апошнія 30 хвілін агонь павінен быць мінімальным. Пераліце булён на плоскае прамавугольнае блюда з невялікімі борцікамі і дайце астыць да пакаёвай тэмпературы. Затым пастаўце ў халадзільнік на 6 гадзін. Нарэжце застылы булён на квадрацікі, загарніце кожны асобна ў харчовую плёнку і замарозьце. Для таго, каб прыгатаваць булённую аснову для любога супу, закіпяціце ваду і дадайце кубікі (з разліку 1 кубік на шклянку вады).

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

Сыр Фета

Спатрэбіцца: *600 мл воды, 400 г сухога малака, 100 г смятаны, сычужны фермент (абамін) — 3 таблеткі, воцат.*

Гатаваную ваду астудзіць да 35 градусаў. Развесці сухое малако. Размяшаць збіваліка да аднастайнай масы без камякоў. Дадаць смятану і энергічна размяшаць. Размешваць трэба толькі ўручную, не выкарыстоўваючы электрычных прыстасаванняў. Сычужны фермент растварыць у гатаванай халаднаватай вадзе і дадаць у малочную сумесь. Старанна перамяшаць. Дадаць 0,25 ч. л. воцату і энергічна перамяшаць зноў. Усё гэта трэба зрабіць вельмі хутка, каб малочная сумесь не паспела астыць. Потым ахінуць ёмістасць з будучым сырам цёплай коўдрай і пакінуць так на 12 гадзін. Затым трэба будзе адціснуць сыроватку. Для гэтага сыр выкласці ў друшляк на марлю, а зверху пакласці гнёт на 7-8 гадзін. Пасля гэтага атрыманы сыр рэжацца на кавалачкі і ўкладваецца ў слоік. Затым цалкам заліваецца растворам гатаванай вады і солі (соль бярэцца на смак). Сыр павінен паляжаць у растворы хаця б тыдзень, бо чым даўжэй ляжыць, тым будзе смачнейшым.

-2946-

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

Як правільна выбраць парфуму



Любы водар складаецца з трох нот (узроўняў). 1-я (верхняя) нота перадае настрой парфумы і трымаецца ўсяго хвіліну. Затым раскрываецца сэрца водару, яно можа быць розным — усё залежыць ад цяпла і ўласцівасцяў вашай скуры. І ў канцы выяўляюцца ніжнія ноты, якія называюць «шлейф». Менавіта ён адыграе важную ролю пры выбары парфумы, бо цэлы дзень навакольныя людзі чуюць шлейф водару.

Дзённыя духі мякчэйшыя, больш празрыстыя за вячэрнія — цёмныя, насычаныя. У офісе або на прагулцы больш падыдуць далікатныя, лёгкія водары. Пачуццёвыя, рэзкія водары дарэчныя, калі варта падкрэсліць раскошу вячэрняга туалета.

Нават час года важны пры выбары духоў. Узімку асабліва добрыя так званыя шыправыя духі.

Улетку ж дарэчныя хутчэй далікатна-салодкія мядова-кветкавыя водары, з якімі жанчына становіцца падобнай да бутона, які раскрываецца.

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

❍ Каб ваўняныя рэчы не блішчэлі і захоўвалі яркія фарбы, іх пасля мыцця трэба прапаласкаць у халоднай вадзе з дабаўленнем у яе воцату да слабакіслага смаку.

❍ Сумессю шчаўевай і воцатнай кіслот можна выдаляць плямы ад іржы.

ДАЧНЫЯ САКРЭТЫ

Калі па верхнім і ніжнім краі сеткі для павойных раслін прапусціць металічны дрот, атрымаецца зручная апора для клематысаў, пляцістых руж, якія патрабуюць сховішча на зіму. Верхні край сеткі прымацоўваюць кручкамі да сцяны будынка або да перакладзіны апоры. Калі прыйдзе час хаваць ліяны на зіму, сетку здымаюць і кладуць на зямлю разам са сцёбламі раслін, якія яе завілі. У такім выглядзе ім можна забяспечыць надзейнае сховішча. Да таго ж гэты спосаб выключае траўмы і паломку сцёблаў, якія нярэдка здараюцца, калі ліяны разблытваюць, здымаючы іх з апор.

-2947-

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.15	21.16	16.01
Віцебск	4.58	21.12	16.14
Магілёў	5.05	21.06	16.01
Гомель	5.09	20.56	15.47
Гродна	5.32	21.30	15.58
Брэст	5.39	21.24	15.45

Месяц

Апошняя квадра 29 ліпеня. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Анісіма, Івана, Сцяпана.*
К. *Марты, Наталлі, Юліі, Рудольфа, Фелікса, Юрыя.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+27..+29°С	КІЕЎ	+24..+26°С	РЫГА	+22..+24°С
ВІЛЬНЮС	+23..+25°С	МАСКВА	+19..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+18..+20°С

УСМІХНЕМСЯ

Ідэальная жонка — гэта такая жанчына, муж якой не ведае, колькі каштуе хлеб. А муж звышідэальнай жонкі не ў курсе цэн нават на піва.

— Жонка ў адпачынку, штаны ўсе брудныя, купіў джынсы, увесь вечар ўкарочваў.

— Хм, малайчына!.. А чаго ў шортах прыйшоў?

Бацька-паляўнічы ўсё ж такі забіў мядзведзя. Мяса ён пакінуў сабе, шкуру падарыў жонцы, а цыркавы веласіпед дастаўся сыну.

— Ты чаму так доўга ехаў?

— Дык даішнік спыніў.

— Чаго хацеў?

— Ну чаго? Вечар пятніцы — задаваў дурныя пытанні і ўважліва нюхаў мае адказы.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.498. Індэкс 63850. Зак. № 3166.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 ліпеня 2013 года.